1-2 стар. «ЧЗ»

ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ!

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЗБІРАЕЦЦА ПАСТУПАЦЬ

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА
НА III КВАРТАЛ І ІІ ПАЎГОДДЗЕ 2010 г.
Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	III квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ЧЭРВЕНЯ 2010 г.
СЕРАДА
№ 110
(26718)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

ФУРСЕВІЧА Мікалая Вітальевіча — начальнікам Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь;

ГАРБАЦЕНКУ Васіля Пятровіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь — начальнікам галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння;

МАЙСЕЕНКУ Уладзіміра Рыгоравіча — начальнікам дзяржаўнай установы адукацыі «Інстытут пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь»;

ЗАБАРУ Андрэя Аляксандравіча — намеснікам старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

МАМАНОВІЧА Пятра Аляксеевіча — членам праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь;

ГАЛАВА Аляксандра Фёдаравіча — членам праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь;

НАДОЛЬНАГА Тараса Юр'евіча — членам праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

КАРАЧЭЎСКАГА Уладзіміра Міхайлавіча — першым намеснікам міністра культуры;

НАЛІВАЙКІ Сяргея Эдуардавіча — першым намеснікам міністра па падатках і зборах;

ХАДЖАЕВА Валерыя Асімавіча — першым намеснікам міністра аховы здароўя;

ШОРЦА Андрэя Віктаравіча — намеснікам міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

ДЗЕРВЯНКОВА Уладзіміра Іванавіча — першым намеснікам міністра транспарту і камунікацый;

ШЫШКО Аляксандра Аляксеевіча — намеснікам міністра транспарту і камунікацый;

ГОЛУХАВА Дзмітрыя Уладзіміравіча — намеснікам міністра эканомікі;

РАГАЧУКА Аляксандра Сцяпанавіча — кіраўніком адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Брэста;

ФУРАШОВА Руслана Васільевіча — старшынёй Віцебскага райвыканкама;

МУРАНКОВА Васіля Мікалаевіча — старшынёй Гарадоцкага райвыканкама;

ГРАБНЁВА Генадзя Іванавіча — кіраўніком адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Віцебска;

НАВУМЕНКІ Івана Анатольевіча — старшынёй Кармянскага райвыканкама;

БАРЫСЕНКІ Алега Леанідавіча — кіраўніком адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Гомеля;

ПАЧЫНКА Алега Міхайлавіча — кіраўніком адміністрацыі Навабеліцкага раёна г. Гомеля;

ДУЦЬКО Анатоля Іванавіча — старшынёй Круглянскага райвыканкама;

КАВАЛЕНКІ Андрэя Віктаравіча — кіраўніком адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Магілёва;

БАДЫТЧЫКА Аляксандра Сцяпанавіча — генеральным дырэктарам вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскі завод шасцерань» ВА «Мінскі трактарны завод»;

БЯЛКО Мікалая Мікалаевіча — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод»;

СНЯЖЫЦКАГА Віктара Аляксандравіча — рэктарам установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»;

МЕРКУШАВА Алега Генрыхавіча — членам Віцебскага аблвыканкама;

ЛЯСКОЎСКАГА Івана Анатольевіча — членам Гомельскага аблвыканкама;

ПАЛІШЧУКА Валерыя Мікалаевіча — членам Гомельскага аблвыканкама;

СЯРГЕЕНКІ Ігара Пятровіча — членам Магілёўскага аблвыканкама;

ДЗВЯРНІЦКАГА Яўгена Міхайлавіча — намеснікам адказнага сакратара — начальнікам апарату прадстаўніцтва Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі ў Рэспубліцы Беларусь;

ПАРШУТУ Івана Якаўлевіча — намеснікам начальніка апарату прадстаўніцтва Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі ў Рэспубліцы Беларусь.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Жывая зямля

ЖУРАЎЛІНАЯ РАНІЦА

Гэтая парачка даўганогіх птушак з'явілася ў лясным куточку Вілейскага раёна, дзякуючы бабровай вольнасці. З-за няўрымслівых будаўнікоў затоплена некалі асушанае і залужанае поле. Чалавек бывае тут рэдка, і журавы могуць у спакоі карміцца з раніцы да вечара. Раней журавель-бацька прылятаў адзін, але падобна, што іхнія дзеці-жураўлікі ўжо павылупліваліся і пара зноў разам.

Гэтай раніцай першым прыляцеў самец. Ён доўга аглядаў навакольлі і трубіў на ўсю моц — клікаў сяброўку. Толькі праз добрых паўгадзіны маці-жураўліха прымкнула да гаспадара і яны разам пачалі важна расходжваць па перыметры адкрытага люстра вады.

Журавоў мне даводзілася здымаць неаднойчы і толькі цяпер упершыню статныя птушкі былі на адлегласці сямі—дзесяці метраў. Праўда, гэтага моманту мне давялося чакаць гадзін з пяць, схаваўшыся ў шалашы-засідцы ажно ў тры гадзіны раніцы. Ранішняе сонейка дапамагала ўбачыць сапраўдную прыгажосць гэтага дзіва прыроды. Было ціха, бязветрана. Вада стала сапраўдным люстэркам і таму здавалася, што журавы выйшлі на самы сонцапёк, каб у адлюстраванні дзівіцца сваім убраннем.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает о следующих изменениях вознаграждений, взимаемых банком при обслуживании карточек ОАО «АСБ Беларусбанк»:

Обслуживание международных банковских пластиковых карточек MasterCard Standard, VISA Classic, MasterCard Gold, VISA Gold (мультивалютные)

№ п/п	Наименование операции	MasterCard Standard VISA Classic			MasterCard Gold VISA Gold		
		Счет в долларах США	Счет в евро	Счет в бел. руб.	Счет в долларах США	Счет в евро	Счет в бел. руб.
1	Снятие наличных денежных средств*, % от суммы: - в других банках (без учета вознаграждения других банков)	1,5 (мин. 7 долларов США)	1,5 (мин. 5 евро)	1,5 (мин. 20 000 бел. руб.)	1,5 (мин. 7 долларов США)	1,5 (мин. 5 евро)	1,5 (мин. 20 000 бел. руб.)
	- в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков)	1,5 (мин. 3 доллара США)	1,5 (мин. 2 евро)	1,5 (мин. 8 000 бел. руб.)	1,5 (мин. 3 доллара США)	1,5 (мин. 2 евро)	1,5 (мин. 8 000 бел. руб.)

* Изменен размер минимальной суммы.

Обслуживание международных банковских пластиковых карточек Maestro, VISA Electron (мультивалютные)

№ п/п	Наименование операции	Maestro, VISA Electron		
		Счет в долларах США	Счет в евро	Счет в бел. руб.
1	Снятие наличных денежных средств*, % от суммы: - в других банках (без учета вознаграждения других банков)	1,5 (мин. 4 доллара США)	1,5 (мин. 3 евро)	1,5 (мин. 10 000 бел. руб.)
	- в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков)	1,5 (мин. 3 доллара США)	1,5 (мин. 2 евро)	1,5 (мин. 8 000 бел. руб.)
2	Утеря карточки, доллары США	5		
3	Блокировка карточки банком, доллары США	5		
4	Замена карточки (в случае порчи, утраты ПИН-кода), доллары США	5		

* Изменен размер минимальной суммы.

Обслуживание международных банковских пластиковых карточек VISA Electron со счетом в белорусских рублях

№ п/п	Содержание операции	VISA Electron стандарта EMV, VISA Electron стандарта EMV для женщин (Леди Карт)	VISA Electron с магнитной полосой для женщин (Леди Карт)
1	Обслуживание карточки в течение срока действия, бел. руб.: - основной - дополнительной	30 000 20 000	не предоставляется
2	Срочное оформление (перевыпуск, обновление, замена) карточки (1 день)* , бел. руб.	25 000	не предоставляется
3	Снятие наличных денежных средств**, % от суммы: - в других банках (без учета вознаграждения других банков)	3 (мин. 8 000 бел. руб.)	
	- в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков)	2 (мин. 6 000 бел. руб.)	
4	Утеря карточки, бел. руб.	15 000	
5	Нахождение карточки в стоп-листе независимо от причин, бел. руб.	15 000	
6	Замена карточки (в случае порчи, утраты ПИН-кода), бел. руб.	15 000	не предоставляется

* Срочное оформление (перевыпуск, обновление, замена) карточки в течение одного дня производится только клиентам учреждений банка, расположенных в г. Минске.
**Изменен размер минимальной суммы.

Обслуживание карточек Maestro, VISA Electron, (для использования только в Республике Беларусь), БелКарт с магнитной полосой (БелКарт-М)

№ п/п	Наименование операции	Maestro, VISA Electron, БелКарт-М**	БелКарт-М «Сберегательная»
1	Срочное оформление, перевыпуск, обновление, замена карточки (1 день)*, бел. руб.	25 000	

* Срочное оформление (перевыпуск, обновление, замена) карточки в течение одного дня производится только клиентам учреждений банка, расположенных в г. Минске.
** Срочное оформление, перевыпуск, обновление, замена карточки в течение одного дня не производится при оформлении карточки БелКарт-М с индивидуальным дизайном.

Обслуживание международных микропроцессорных банковских пластиковых карточек VISA Electron стандарта EMV «Сберегательная» (со счетом в долларах США)

№ п/п	Наименование операции	VISA Electron «Сберегательная»
1	Снятие наличных денежных средств*, % от суммы:	
	- в других банках (без учета вознаграждения других банков)	1,5 (мин. 4 доллара США)
	- в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков)	1,5 (мин. 3 доллара США)
2 ▲	Замена карточки (в случае порчи, утраты ПИН-кода), доллары США	5

* Изменен размер минимальной суммы.

http://www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Прамая лінія

ДАПАМОГА: КАМУ ШТО?

Падтрымка ветэранаў і інвалідаў, адрасная сацыяльная дапамога, сацыяльнае абслугоўванне на даму і магчымасць атрымання іншых сацыяльных паслуг — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам **начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Івана Пятровіча НАГІБІНА**.

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша прамая лінія пройдзе 15 чэрвеня з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8-017) 292 38 21 ці 292 38 92. Нумар для папярэдніх пытанняў — 287 17 57.

Аўто канфіскавалі на 2,4 мільярда

Тытунёвыя правапарушальнікі актывізаваліся на тэрыторыі Віцебскай вобласці.

Як паведаміў «Звяздзе» начальнік аддзела па наглядзе за выкананнем падатковага і мытнага заканадаўства пракуратуры Віцебскай вобласці Раман Чудакоў, канфіскавана болей за 343 тысячы пачкаў цыгарэт на агульную суму каля 873 мільёнаў рублёў. У парушальнікаў канфіскавалі аўтамабілі, на якіх яны перавозілі тытунь, агульным коштам больш за 2,4 мільярда рублёў. У барацьбе з парушальнікамі мытнікам актыўна дапамагаюць памежнікі.

Аміяк змяшаўся з друзам

І зноў у Оршы забілі трывогу з-за паху аміяку ад друзу, які выкарыстоўваецца пры ўкладцы асфальту. Работы вядуцца на вуліцы Леніна.

Як паведаміла прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына Фандо выклікалі выратавальнікаў заклапочаныя жыхары горада. Канцэнтрацыя пары аміяку на гэты раз перавышала норму ў 10 разоў. Высветлілася, што друз, які выкарыстоўваўся для ўкладкі асфальту, захоўваўся на станцыі Орша-Кантэйнерная побач з мінеральнымі ўгнаеннямі. Падчас дажджоў забруджаная хімікатамі вада перамяшалася з друзам. Угнаенні вывезлі з тэрыторыі станцыі. Пробы на ўтрыманне аміяку ў паветры паказалі, што ўсё ў норме.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.06.2010 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	3 015,00
▲1 еўра	3 607,15
1 латвійскі лат	5 093,77
1 літоўскі літ	1 044,19
1 чэшская крона	138,77
1 польскі злоты	869,10
▲1 расійскі рубель	95,35
1 украінская грыўня	380,54

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,6200
10 UAH	39,6937
1000 BYR	10,4841
EUR	37,8333

ISSN 1990 - 763X

БЕЛАРУСЬ НІКОЛІ НЕ ЗАКРЫВАЛА СВАЮ ІНФАРМАЦЫЙНУЮ ПРАСТОРУ

Аб гэтым заявіў міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі на адкрыцці летняй школы журналістыкі ў рамках V Беларускага міжнароднага медыяфоруму «Беларусь — партнёрства ў імя будучыні», перадае БЕЛТА.

«У Беларусі распаўсюджваецца больш за 60 замежных газет і часопісаў, у сетках кабельных аператараў — больш за 90 тэлеканалаў з краін далёкага і блізкага замежжа», — сказаў міністр.

Цяпер зарэгістравана больш за 1,5 тыс. сродкаў масавай інфармацыі, агульны разавы тыраж газет і часопісаў складае больш за 14 млн экзэмпляраў, пры гэтым дзве трэці выданняў — недзяржаўныя. Дзяржава падтрымлівае сацыяльна значныя выданні.

У Беларусі дзейнічае пяць тэлеканалаў, міжнародны спадарожнікавы канал «Беларусь ТБ». У Беларусі прадстаўлены расійска-беларускія каналы «РТР-Беларусь» і «НТВ-Беларусь», хутка развіваюцца кабельныя сеткі, FM-радыёстанцыі. Задача сённяшняга дня — ўкараненне лічбавага вяшчання.

Беларуская журналісцкая супольнасць выказвае зацікаўленасць у сумесным вырашэнні любых пытанняў, цэніць прафесійныя стасункі, абмен вопытам. Алег Праляскоўскі адзначыў, што ў гэтым годзе на медыяфоруме прысутнічае шмат удзельнікаў з краін СНД, Балтыі і далёкага замежжа. Цяперашняя сустрэча дае магчымасць прадоўжыць плённы дыялог.

Цырымонія ўскладання кветак да абеліска на плошчы Перамогі ўдзельнікамі V Беларускага міжнароднага медыяфоруму. Фота БЕЛТА.

Пытанні з электроннай скрынкі

ЧАС ЗБОРАЎ — ГЭТА СТАЖ

Вылічэнне пенсіі было і застанецца тэмай актуальнай, і ў тым ліку для тых, хто яшчэ збіраецца выйсці на заслужаны адпачынак. На сайце нашай газеты www.zviazda.by з'яўляюцца па-сапраўднаму цікавыя пытанні: ці можна «прапусціць» пры разліку індывідуальнага каэфіцыента гады, калі быў вельмі маленькі заробак; як разлічваецца той жа заробак за час тэрміновай службы ў арміі і ці ўплывае на пенсію перыяд вайсковых збораў? У пошуках адказаў мы вырашылі звярнуцца да спецыяліста — намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларысы Міхайлаўны ЯШКОВАЙ.

— Як вядома, налета індывідуальны каэфіцыент заробку будзе разлічвацца за 17 гадоў запар з 27 апошніх гадоў работы. Аднак тут узнікае пытанне: што будзе, калі ў заліковыя 17 гадоў патрапіць час, калі чалавек быў беспрацоўным, проста не працаваў ці меў міззярны заробак? Ці можна такія гады проста не ўлічваць або замяняць на іншыя?

— У наступным годзе індывідуальны каэфіцыент сапраўды будзе разлічвацца за 17 гадоў запар з 27 апошніх гадоў работы. Пры гэтым час, калі чалавек не працаваў, быў беспрацоўным або займаўся іншай дзейнасцю (скажам, служыў у арміі, даглядаў дзіця ва ўзросце да 3 гадоў, пенсіянера ва ўзросце больш за 80 гадоў, інваліда I групы) можа проста выключацца: як з 17-гадовага «заліковага», так і з 27-гадовага «разліковага» перыяду.

СТАР. 2

Насуперак

НЕВІДУШЧЫ АДВАКАТ, ці 25 гадоў у законе

Увасемнаццаць Уладзімір Яўгенавіч Дзенісенка страціў зрок. Гэта зрабіла яго мацнейшым і дапамагло дасягнуць вышыняў. Сёння ён адзначае дваццаціпяцігоддзе паспяховай працы адваката.

Няўлоўны Уладзімір Яўгенавіч заўсёды ўвесь у справах. Мне давялося перахапіць яго паміж следчым ізалятарам і залай суда. Ён ніколі не сядзіць на месцы, часта ездзіць у камандзіроўкі, прымае грамадзян у юрыдычнай кансультацыі. Калегі паважаюць, кліенты перадаюць яго імя з вуснаў у вусны. Статны, дагледжаны, інтэлігентны мужчына ў цёмных акулярах. У іх і хаваецца гераізм. Уладзімір Яўгенавіч — інвалід першай групы па зроку.

ГРОМ СЯРОД СВЕТЛАГА НЕБА

Пасля школы Валодзя вырашыў стаць юрыстам. Ён паступіў у адзіны на Далёкім Усходзе ўніверсітэт. Хутка бацьку па службе перавялі ў Беларусь. Скончыўшы першы курс ва Уладзівастоку, Валодзя перавёўся на юрфак БДУ. Дыплом ён атрымае толькі праз сем гадоў.

— Гром грымнуў сярод светлага неба, калі мне было ўсяго васямнаццаць, — распавядае Уладзімір Яўгенавіч. — Я рос і мужнеў у тайзе. Хадзіў на паляванне, рукамі лавіў чырвоную рыбу, гуляў у футбол, валейбол. Я лепш за ўсіх страляў з любой зброі, хутчэй за ўсіх збіраў ягады. Ніколі не ўжываў лекі, не звяртаўся да медыкаў. Цяпер мне трэба было пераламіць сябе: згадзіцца на складаную аперацыю і надоўга застацца ў бальніцы. Я раптоўна і хутка пачаў страчваць зрок. Тая сітуацыя магла скончыцца самагубствам ці п'янствам. Але я выбраў іншую сцежку, праявіўшы максімум волі і аптымізму.

Праз некалькі гадоў акадэмічнага адпачынку Уладзімір скончыў універсітэт на «выдатна», калі ўжо фактычна не мог чытаць. Бацька, які ў свой час быў супраць юрыспрудэнцыі, цяпер верыў у сына і дапамагаў яму, як мог. Ён начытваў студэнту падручнікі і лекцыйныя канспекты на дыктафон. Хлопец развіваў памяць і здаваў экзамены.

СТАР. 2

ДАВЕР

Як фотарэпарцёр хачу нагадаць чытачам, якія карыстаюцца ўсемагчымымі «мыльніцамі», што здымаць кладкі яек, птушанят забаронена. Сваімі неабдуманымі дзеяннямі можна нанесці непапраўны ўрон. Прапанаваныя здымкі — вынік рэдкага, унікальнага выпадку. Проста шэрая слаўка звіла гняздо ў адсутнасць жыхароў хаты ў кубачку з-пад ёгурту, у якую быў пасаджаны расток петуніі. Гэты посуд вісеў на прысценку ўсяго ў нейкіх 40 сантыметрах ад ўваходу. Прыйшлося тры тыдні, прыгнуўшыся, скурчыўшыся, з аглядкай заходзіць у хату і выходзіць, каб не спалохаць птушку, якая не без страху цярпліва выседжвала птушанят. І на 21 дзень ад народзінаў выпырхнулі яны з гнязда. Як тут было крадком не ўскінуць часам апарат з «дальнабойнай» оптыкай, каб зафіксаваць давер да чалавека!

Васіль ЗЯНЬКО.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У БЕЛАРУСІ ПАВІННА ЗАХАВАЦЦА ЦЯПЕРАШНЯЯ СІСТЭМА АДУКАЦЫІ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў краіне неабходна захаваць цяперашнюю сістэму адукацыі. Гэта асноўнае патрабаванне, падкрэсліў ён на нарадзе 7 чэрвеня па пытаннях развіцця вышэйшай школы, якасці падрыхтоўкі спецыялістаў на гэтым узроўні адукацыі, а таксама мэтазгоднасці далучэння Беларусі да Балонскага працэсу.

«Галоўнае застаецца нязменным — мы не маем права зламаць сістэму адукацыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што ў краіне праведзена ўжо дастаткова рэформаў у гэтай галіне і цяпер неабходна працаваць над удасканаленнем таго, што ёсць, у тым ліку гэта адносіцца да стварэння новых падручнікаў.

«Нам патрэбна нармальная сістэма адукацыі, арыентаваная на нашу эканоміку, перш за ўсё на наша грамадства, на нашу краіну. Нам не трэба бегчы ні за якімі дзяржавамі і краінамі», — лічыць ён.

У нарадзе прынялі ўдзел старшыня Савета Рэспублікі Анатоль Рубінаў, старшыня Рэспубліканскага савета рэктараў вышэйшых навучальных устаноў Уладзімір Шымаў і міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў.

Беларусь пачала працэдуру далучэння да Балонскага працэсу, падпісаўшы Канвенцыю аб прызнанні кваліфікацый, якія адносяцца да вышэйшай адукацыі ў Еўрапейскім рэгіёне (Лісабонскую канвенцыю). Гэта пытанне было абмеркавана на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы ў студзені 2005 года, па выніках якой было прынята рашэнне аб увядзенні двухступеньчатай сістэмы з улікам беларускай спецыфікі: захавана падрыхтоўка спецыялістаў у якасці першай ступені вышэйшай адукацыі, магістратура зарыентавана на падрыхтоўку да аспірантуры.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што дэкларацыя не патрабуе катэгарычна новаўвядзенняў у адукацыйнай сістэме Беларусі па прынцыповых пытаннях. «Да нас пастаянна звяртаюцца: «Вазьміце вучыцца нашых людзей!» І плацяць жа добрыя грошы. Дык ці варта нам ісці на чарговы які-небудзь перагляд, ломку адукацыі? Вядома, не. Я лічу, што нам трэба, супакоіўшыся, спакойна завяршыць тое, што мы намецілі, а далей будзем бачыць», — сказаў Прэзідэнт. «Мы адна з нямногіх краін, якія змаглі захаваць той высокі ўзровень, што быў у Савецкім Саюзе, мадэрнізаваць яго, прыстасаваць да сучаснага і значна дабавіць да таго ўзроўню адукацыі, які быў у савецкія часы».

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на праблемныя пытанні, якія ёсць у рабоце рэктараў. «Іншая справа, што ў нас некаторыя рэктары засядзеліся. Яны сядзяць, як за каменнай сцяной, і лічаць, што ім нічога не трэба. Мне ўжо студэнты некаторыя расказваюць аб тым, што то дах працёк, то сцяна абвалілася, то ў аўдыторыю не зайсці, то вокны не вымыты, — давай, Прэзідэнт, уключайся. Вось гэта нядобра».

На працягу гэтага года сур'ёзным чынам будзе праверана ўся сістэма адукацыі на прадмет арганізацыі вучэбнага працэсу, распрацоўкі новых праграм і новых навучальных дапаможнікаў. Паводле слоў Прэзідэнта, зроблена гэта будзе, «пачынаючы ад вывучэння сітуацыі, ад меркавання саміх студэнтаў». Беларусь выконвае ўсе рэкамендацыі Балонскага працэсу, у нас ёсць двухступеньчатая сістэма вышэйшай адукацыі, якасныя праграмы, агульнаадукацыйныя стандарты адпавядаюць патрабаванням еўрапейскай сістэмы менеджменту якасці ІСО 9001. Аднак Прэзідэнт запатрабаваў, каб яшчэ раз была пераправерана і юрыдычная аснова, і напрацоўкі Беларусі, і сістэма ўзаемадзеяння паміж краінамі на еўрапейскім кантыненце ў пытаннях падрыхтоўкі кадраў вышэйшай школы і, адпаведна, развіцця ўсёй сістэмы адукацыі, у тым ліку і ва ўніверсітэтах.

Аляксандр Лукашэнка даручыў яшчэ раз уважліва ўсё ўзважыць, вызначыцца і пазней далажыць, колькі гэтыя зрухі, гэта развіццё адпавядае нацыянальным інтарэсам, колькі яны дапамогуць удасканальваць і эканоміку, і ў цэлым развіццё нашай краіны. Ад сістэмы адукацыі кіраўнік дзяржавы дакладна патрабуе найперш якасці на ўсіх этапах, асабліва пры падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшага звяна. Яна павінна адпавядаць нацыянальным інтарэсам, развіццю нацыянальнай эканомікі, палітыкі, падрыхтоўкі чалавека і да жыцця, і да работы з добрай дзяржаўнай асновай, са здаровай ідэалогіяй.

У БЕЛАРУСІ ПЛАНУЕЦЦА АДМОВІЦЦА АД ВЫДАЧЫ ДАМАВЫХ КНІГ

Гэта прадугледжана ўказам Прэзідэнта Беларусі ад 8 чэрвеня 2010 года № 296 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Палажэнне аб рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання».

Указ прадугледжвае карэкціроўку Палажэння аб рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 верасня 2007 года № 413.

У адпаведнасці з асноўнымі палажэннямі ўказа грамадзянам Беларусі, якія пастаянна пражываюць за мяжой, прадастаўляецца магчымасць зарэгістравацца па месцы знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь. Адсутнасць такой рэгістрацыі выклікала праблемы пры рэалізацыі гэтымі грамадзянамі шэрагу правоў, у тым ліку пры атрыманні медыцынскага абслугоўвання, абмене вадзіцельскіх пасведчанняў, іншых дакументаў. У мэтах павышэння эфектыўнасці кантролю за знаходжаннем замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Беларусі, уводзіцца іх абавязак зарэгістравацца не толькі па месцы жыхарства, але і па месцы знаходжання не пазней як за адзін месяц з дня прыбыцця.

Дадаткова ўрэгуляваны парадак рэгістрацыі па месцы жыхарства дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама парадак рэгістрацыі іншых няпоўнагадовых. Так, напрыклад, прадугледжана, што органы апекі і папячыцельства рэгіструюць дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, па адрасе размяшчэння адміністрацыйнага будынка адпаведнага мясцовага выканаўчага і распарадчага органа пры складанні ўпаўнаважанымі органамі актаў аб пакіданні дзіцяці, аб знаходжанні кінутага дзіцяці, што дасць магчымасць такім дзецям да дасягнення паўналецця ў дастатковым аб'ёме рэалізаваць правы і законныя інтарэсы (атрымаць пашпарт, афармліць дапамогі і інш.).

Таксама ўдасканалены парадак рэгістрацыі і зняцця з рэгістрацыйнага ўліку грамадзян, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, афіцэраў, якія праходзяць ваенную службу па прызыву, і членаў іх сем'яў, а таксама грамадзян, што праходзяць тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, знаходзяцца на ваенных або спецыяльных зборах.

Прадастаўляецца магчымасць мясцовым выканаўчым і распарадчым органам забяспечваць рэгістрацыю асобаў без пастаяннага месца жыхарства не толькі па месцы знаходжання пунктаў рэгістрацыі і ўліку гэтых асобаў (такія пункты створаны не ва ўсіх гарадах і гарадскіх пасёлках), але і ў іншых месцах, што вызначаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, напрыклад у цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

Прадугледжана адмовіцца ад выдачы дамавых кніг, наяўнасць якіх значна ўскладняе працэдуру рэгістрацыі і зняцця грамадзян з уліку. Грамадзяне, якія пражываюць у аднаквартэрных (блакіраваных) жылых дамах, часта не могуць ажыццявіць асобныя адміністрацыйныя працэдуры з-за адсутнасці дамавой кнігі або адмовы ўласніка жылога памяшкання выдаць яе на рукі. У сувязі з гэтым ураду сумесна з абласнымі і Мінскім гарадскім выканкамамі даручана на працягу аднаго года прыняць меры па адмене дамавых кніг і арганізацыі ўліку грамадзян, якія пражываюць у аднаквартэрных (блакіраваных) жылых дамах, без выкарыстання дамавых кніг. Нарматыўныя прадпісанні ўказа ўступаюць у сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРЫНЯЎ УДЗЕЛ У ПАНІХІДЗЕ ПА МІХАІЛУ ПАЎЛАВУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора прыняў удзел у грамадзянскай паніхідзе па былому старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Міхаілу Паўлаву, перадае **БЕЛТА**.

Кіраўнік дзяржавы ўсклаў кветкі да труны пакойнага, выказаў спачуванні родным і блізкім Міхаіла Паўлава.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

11 чэрвеня 2010 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ЧАС ЗБОРАЎ — ГЭТА СТАЖ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што ж да пропуску гадоў з невялікай зарплатай, то такой магчымасці няма. Аднак варта заўважыць, што пры вызначэнні індывідуальнага каэфіцыента заўсёды выбіраецца неабходная колькасць гадоў з аптымальнай, найбольшай зарплатай. І той жа 17-гадовы заліковы перыяд можа прыпадаць на пачатак, сярэдзіну або на канец 27 гадоў апошніх гадоў працоўнай дзейнасці — у залежнасці ад таго, які варыянт стане больш выгадным для будучага пенсіянера.

— Якім чынам пры прызначэнні пенсіі ўлічваецца час праходжання тэрміновай вайсковай службы?

— Час праходжання тэрміновай службы адназначна ідзе ў стаж. Прычым калі такая служба прыйшлася на аптымальны перыяд для вызначэння індывідуальнага каэфіцыента заробку, то яна зноў жа выключаецца — напрыклад, налета адначасова з 17 і 27 гадоў.

— Амаль два месяцы правёў на вайсковых зборах, а адсюль і пытанне: ці паўплывае гэта нейкім чынам на пенсію?

— Калі чалавек працуе, то на час праходжання вайсковых збораў за ім захоўваецца і працоўнае месца, і сярэдні заробак. Адпаведна, ніякіх праблем тут няма: час збораў залічваецца ў стаж як работа, а заробак прымаецца для разліку індывідуальнага каэфіцыента.

Іншая справа, калі чалавек не працуе. У такім разе падстаў для заліку заробку пры вызначэнні індывідуальнага каэфіцыента, зразумела, быць не можа.

Сяргей ГРЫБ.

Баранавіцкі гарадскі выканаўчы камітэт і гарадскі Савет дэпутатаў глыбока смуткуюць аб смерці Міхаіла Якаўлевіча ПАЎЛАВА і выказваюць шчырае спачуванне родным і блізкім.

Ва Урадзе

НОВЫЯ ВЫШЫНІ БУДАЎНІЧАЙ ГАЛІНЫ

Распрацоўваецца Дзяржаўная праграма развіцця матэрыяльна-тэхнічай базы будаўнічай галіны на 2011—2015 гады

БУДАЎНІЧУЮ галіну не без падстаў называюць лакаматывам беларускай эканомікі, улічваючы, што яе магутнасці ўжо з наступнага года павінны забяспечваць увод да 9 мільёнаў квадратных метраў жылля, а з 2012-га — да 10 мільёнаў. Другое ж дыханне пасля некаторага спаду будаўніцтва набыло ў 2006 годзе, калі ў краіне была прынятая Дзяржаўная комплексная праграма развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы будаўнічай галіны на 2006—2010 гады. Неабходнасць такой праграмы, нагадаў на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА, была прадыктаваная патрабаваннем Прэзідэнта за кароткі тэрмін падвоіць аб'ём жыллёвага будаўніцтва, што запатрабавала ў разы павялічыць і вытворчасць будаўнічых матэрыялаў.

Каб праграма выконвалася паспяхова, першапачаткова на яе рэалізацыю былі прадугледжаныя ўсе неабходныя фінансавыя сродкі. У прыватнасці, Уладзімір Сямашка паведаміў, што аб'ём фінансавання дзяржпраграмы складае 7 трыльёнаў рублёў, з якіх 1,2 трыльёна пойдзе на тэхнічнае пераўзбраенне, 3,5 трыльёна — на стварэнне новых магутнасцяў, у тым ліку будаўніцтва цэментных заводаў, 1,2 трыльёна — на дадатковую мадэрнізацыю домабудаўнічых камбінатаў і 400 мільярдаў — на развіццё навуковай базы. Што ж датычыцца гэтага года, то на рэалізацыю мерапрыемстваў праграмы запланавана накіраваць каля 2 трыльёнаў рублёў.

Наколькі эфектыўна асвойваюцца згаданыя сродкі, распавёў **міністр архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр СЕЛЯЗНЁЎ**. Паводле яго слоў, з 2006-га па студзень—сакавік гэтага года на рэалізацыю мерапрыемстваў праграмы было накіравана 4,9 трыльёна рублёў, ці 69,2 працэнта ад плана. Гэта дазволіла значна абнавіць парк машын і механізмаў у будаўнічай галіне, а таксама набыць новыя віды тэхнікі: калі на момант фарміравання праграмы знос актыўнай часткі асноўных фондаў па будаўнічых арганізацыях вагаўся ад 78 да 95 працэнтаў, то на пачатак гэтага года гэты паказчык ужо не перавышаў 57 працэнтаў. Акрамя таго, у краіне быў асвоены і забяспечаны выпуск высокавытворчых імпартазамяшчальных машын і механізмаў — вежавых кранаў, пагрузчыкаў і інш.

На думку міністра, вельмі важным з'яўляецца і развіццё арганізацый індустрыяльнага домабудавання, таму што ў наступным годзе аб'ём уводу жылля павінен дасягнуць 9 мільёнаў квадратных метраў. У гэтай сувязі Аляксандр Селязнёў праінфармаваў, што зараз выконваюцца праекты па мадэрнізацыі і рэпаабсталяванню 20 прадпрыемстваў індустрыяльнага ДБК. Сёлета па 15 ДБК работы будуць практычна завершаныя, а вось па 5 праектах яны пакуль не вядуцца. У прыватнасці, міністр згадаў, што крайне неабходны новы домабудаўнічы камбінат Мінску. Ён патлумачыў, што перад сталіцай стаіць задача выходзіць на будаўніцтва 1,8-2 мільёнаў квадратных метраў жылля з улікам гарадоў-спадарожнікаў. І Мінск прапрацоўвае зараз гэтае пытанне з улікам выкарыстання кітайскіх інвестыцый. Аднак тэрміны будаўніцтва ДБК адсоўваюцца на 2013—2014 гады. Паводле ж меркавання кіраўніка будаўнічай галіны, максімальным тэрмінам рэалізацыі праекта павінен стаць канец 2012 года. Разам з тым, нягледзячы на пэўныя праблемы, магутнасці індустрыяльнага домабудавання ў краіне істотна дадаюць: калі на пачатак года яны складалі 1 мільён 100 тысяч квадратных метраў, то на 1 красавіка — ужо 1 мільён 900 тысяч. Дарэчы, на павелічэнне магутнасцяў было накіравана 504 мільярды рублёў.

Гаворачы аб стане спраў па інвестпраектах, якія прадугледжаныя праграмай, міністр паведаміў, што на прадпрыемствах прамысловасці будаўнічых матэрыялаў рэалізавана іх 72 са 109 меркаваных. На гэтыя мэты накіравана 2 трыльёны рублёў інвестыцый. У выніку былі павялічаныя ў разы магутнасці па выпуску асноўных будаўнічых матэрыялаў, напрыклад, тых жа цэменту, цэглы, што дазволіла не толькі забяспечыць унутраныя патрэбы, але да таго ж 40 працэнтаў будаўнічых матэрыялаў прадаецца за мяжу. Між іншым, у краіне ідзе актыўная праца па сертыфікацыі прадукцыі ў адпаведнасці з еўрапейскімі нормамі. Калі раней рэспубліка мела СЕ-маркіроўку на 11 прадпрыемствах па 17 відах прадукцыі, то цяпер адпаведна 18 прадпрыемстваў па 21 віду, што дазваляе па асноўных матэрыялах ажыццяўляць пастаўку на экспарт у Еўрасаюз.

У наступным, зазначыў Аляксандр Селязнёў, аснашчэнне будаўнічых прадпрыемстваў цяжкімі машынамі, механізмамі і аснасткай па-ранейшаму застанецца актуальным пытаннем. Таму распрацоўваецца новая праграма развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы будаўнічай галіны на 2011—2015 гады, праект якой у найбліжэйшы час будзе разасланы зацікаўленым на ўзгадненне.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Абзац

◢ Стаўкі мытных пошлін на аўтамабілі, якія ўвозяцца фізічнымі асобамі, могуць захавацца да 2012 года, заявіў намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Сяргей Барысюк учора за пасяджэнні камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Палаты прадстаўнікоў беларускага парламенту. «Гэтае пытанне вырашанае на ўзроўні экспертаў. Для Беларусі і Казахстана ўстанаўліваецца пераходны перыяд да 2012 года,» — сказаў, у прыватнасці, ён.

◢ **У Мінскай вобласці трактар «скасіў» жанчыну разам з травой. Інцыдэнт адбыўся на 12-м км аўтадарогі Капыль — Грозава — Грэск. Кіроўца трактара абкошваў узбочыну. Ён наехаў прычапной касілкай на жанчыну, якая ляжала ў траве. Пацярпелая была дастаўлена ў бальніцу з чэрапна-мазгавой і іншымі траўмамі. Устаноўлена, што жанчына была нецвярозай.**

◢ Невядомы прыўлашчыў грошы з электроннага рахунку жыхаркі Мінска. Мінчанка вырашыла праверыць свой электроны партманет у інтэрнэце, які яна выкарыстоўвала для аплаты пакупак за мяжой, і выявіла там адмоўны баланс. Яна добра памятала, што пасля апошняй пакупкі там заставалася $130. Як выявілі міліцыянеры, грошы скрадзеныя праз несанкцыянаваны доступ да карт-рахунку мінчанкі. Спачатку іх перавялі на рахунак сталічнага жыхара, які нават не падазраваў пра гэта, а потым — на рахунак у Расію. Заведзена крымінальная справа.

◢ **Шклетаваны труп знойдзены ў вёсцы Собалеўка Клімавіцкага раёна. У доме, гаспадар якога — мужчына 1951 года нараджэння — памёр 8 мая і быў пахаваны, 5 чэрвеня пад падлогай знайшлі шклет. Як адзначылі ў пракуратуры, на трупе, знойдзеным цяпер, ёсць яўныя прыкметы гвалтоўнай смерці.**

Поўны абзац

◢ Ірландзец прагуляў у покер пяць сутак запар. Прафесійны картачны гулец Філ Лок устанавіў новы сусветны рэкорд па працягласці няспыннай гульні ў покер. Дасягненне было зафіксавана ў Лас-Вегасе ў 7 раніцы панядзелка, 7 чэрвеня. Да гэтага моманту Лак правёў за картачным сталом 115 гадзін, чаргуючы гульню ў покер з 5-хвілінныміперапынкамі кожную гадзіну. Лак паведаміў, што за час гульні страціў у вазе каля 2,5 кілаграма. Як сцвярджае сам гулец, які не спаў амаль пяць сутак, ён не прымаў ніякіх стымулятараў і не піў кавы. Па правілах спаборніцтва, яму было дазволена «накапіць» з 5-хвілінных перапынкаў адну працяглую перадышку, чым ён і скарыстаўся, задрамаўшы на паўгадзіны.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МІНІСТРЫ ФІНАНСАЎ ЕС ПУСЦІЛІ ЭСТОНІЮ Ў ЕЎРАЗОНУ

Міністры фінансаў 27 краін Еўрасаюза ўхвалілі ўводзіны ў Эстоніі еўра ў якасці асноўнай валюты з 1 студзеня 2011 года. Такім чынам, прыбалтыйская краіна стане 17-м удзельнікам еўразоны.

Еўрасаюз вырашыў, што Эстонія адпавядае Маастрыхцкім крытэрам у частцы кантролю над дзяржаўным доўгам і дэфіцытам бюджэту, а таксама інфляцыяй. Дэфіцыт бюджэту ў Эстоніі ў 2010 годзе складзе 2,4 працэнта ад ВУП, дзярждоўг — каля 9,6 працэнта. Для параўнання, у краінах Паўднёвай Еўропы паказчыкі дэфіцыту вагаюцца ад 7 да 13 працэнтаў, а запазычанасць — ад 50 да 125 працэнтаў.

Як заявіў старшыня Еўракамісіі Жазэ Мануэл Барозу, жаданне Эстоніі далучыцца да еўразоны паказвае не толькі гатоўнасць краіны да гэтага, але і прыцягальнасць еўра ў якасці ўсеагульнай валюты.

THE DAILY TELEGRAPH: ЕЎРА НЕ ПРАЦЯГНЕ І ПЯЦІ ГАДОЎ

Адзіная еўрапейская валюта «наўрад ці дажыве да 2015 года», — да такой высновы прыйшла большасць эканамістаў лонданскага Сіці, якія ўдзельнічалі ў апытанні газеты.

З 25 апытаных 12 заявілі, што зона еўра ў яе цяперашнім выглядзе не праіснуе і пяці гадоў. Толькі 8 эканамістаў лічаць, што еўразона здолее выйсці з цяперашняга крызісу. Астатнія адмовіліся рабіць якія-небудзь прагнозы.

Старшы эканаміст з аналітычнай службы Policy Exchange Эндру Ліліка адзначыў, што «шанцы на выжыванне еўра набліжаюцца да нулявых». «Грэцыя амаль напэўна абвесціць дэфолт па сваіх абавязацельствах, пры гэтым высокая верагоднасць (каля 75 %), што ў гэтай краіне зоны еўра паўстане цяжкі сацыяльны крызіс», — прагназуе ён.

Адзін з найболей уплывовых эканамістаў сучаснай Вялікабрытаніі і былы член Рады дырэктараў Банка Англіі Дэвід Блэнчфлаўэр заявіў, што «Германія адмовіцца плаціць за іншых і пакіне зону еўра, а палітычныя наступствы гэтага кроку будуць значнымі».

Цім Конгдан са службы International Monetary Research лічыць, што «тры ці чатыры краіны, уключаючы Грэцыю, Партугалію і Іспанію, а магчыма, і Ірландыю, пакінуць зону еўра». Ён таксама не выключыў поўнага развалу еўразоны ў сувязі «з рознагалоссямі паміж Францыяй і Германіяй».

ПУЦІН АДМОВІЎСЯ ЦЯГНУЦЬ «БЛАКІТНЫ СТРУМЕНЬ-2» ДА ІЗРАІЛЯ

Газаправод «Блакітны струмень-2», хутчэй за ўсё, не будзе падоўжаны да Ізраіля «нават па чыста эканамічных меркаваннях». Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін, выступаючы перад журналістамі ў Стамбуле.

Тым часам на сайце «Газпрама» гаворыцца, што «Блакітны струмень-2» можа даць магчымасць паставак газу ў Ізраіль і краіны Блізкага Усходу. Пуцін нагадаў, што асноўнай мэтай будаўніцтва новага газаправода стане павелічэнне паставак у Турцыю, а таксама транзіт паліва ў трэція краіны. Пры гэтым Ізраіль нядаўна адкрыў на сваім шэльфе вялікае радовішча, адзначыў Пуцін. Такім чынам, расійскі газ можа Ізраілю і не спатрэбіцца. Варта адзначыць, што «Блакітны струмень-2» пакуль знаходзіцца на стадыі разгляду. Ці будзе ён пабудаваны і калі — пакуль невядома.

КОШТ УНЦЫІ ЗОЛАТА ЎПЕРШЫНЮ ПЕРАВЫСІЎ 1250 ДОЛАРАЎ

Кошт на золата на сусветным рынку дасягнуў новага гістарычнага максімуму, падняўшыся вышэй за 1250 долараў за унцыю. Падчас гандлю на біржы NYMEX 8 чэрвеня ф'ючэрсы на золата з пастаўкай у чэрвені выраслі ў кошце больш як на восем долараў да 1252,1 долара за унцыю.

Адзнаку ў 1233 долары за унцыю (папярэдні гістарычны максімум) золата пабіла ў сярэдзіне мая гэтага года. У снежні 2009 года унцыя каштоўнага металу каштавала больш за 1226 долараў. Інвестары аддаюць перавагу ўкладвацца ў золата, паколькі губляюць упэўненасць у асноўных сусветных валютах, асабліва ў еўра.

НЕВІДУШЧЫ АДВАКАТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

АДВАКАТ З АСАБЛІВАСЦЯМІ

І вось ужо чвэрць стагоддзя Уладзімір Яўгенавіч працуе адвакатам. Падчас працы ён сутыкаецца з пэўнымі цяжкасцямі, якія прывык пераадольваць. Вывучаць дакументы, пісаць тэксты дапамагаюць маці і старэйшая дачка. Па прыкладзе бацькі яна стала юрыстам. У рабоце невідушчы адвакат выкарыстоўвае дыктафон. А вось самае складанае — гэта сустрэча з кліентамі.

— Стараюся, каб не было заўважна, што ў мяне ёсць нейкія цяжкасці — не хачу палохаць кліентаў, — прызнаецца Уладзімір Яўгенавіч. — Калі заключаю дамову ці знаёмлюся са справай, дакументы рыхтую загадзя, стараюся ўсё дасканала раскласці ў галаве.

Перасцярогі тут нялішнія: кліенты розныя трапляюцца. Але большасць з разуменнем ставяцца да асаблівасці адваката і яшчэ больш цэняць яго. Ёсць ва Уладзіміра Яўгенавіча пастаянныя кліенты — хадзячая рэклама, яны раяць яго сваім знаёмым і сваякам. У некаторых ён сямейны адвакат.

Сяргею Н. адвакат Дзенісенка дапамог вызваліць з турмы беспадстаўна абвінавачанага брата. Справа ішла на ўзроўні абласнога суда. Там адвакаты рэдка дасягаюць перамог. А ў яго атрымалася.

— Уладзімір Яўгенавіч надта кампетэнтны ў юрыдычных пытаннях. Да працы падыходзіць старанна, захапляецца тонкасцямі, шмат увагі надае дэталям, — дзеліцца досведам суседнім справы Сяргей. — Я сам выбіраў адваката і спыніўся на яго кандыдатуры з-за прафесійных якасцяў. Мяне не бянтэжыць, што ён не бачыць. Наадварот, адсутнасць адных здольнасцяў (у гэтым выпадку — бачыць) развівае ў чалавеку іншыя: у яго выдатная памяць, яму непатрэбныя падказкі. Ён умее ісці да канца, да канца адстойваць гонар свайго пададабароннага. Гэта я вельмі цаню ў адвакаце.

Тыя маршруты, якія даводзіцца што раз пераадольваць па працы, Уладзімір Яўгенавіч ведае да дробязяў. У будынках, дзе працуе, вывучыў кожны куток. Крыху складаней з камандзіроўкамі — у іх даводзіцца часта ездзіць. Але і тут налаўчыўся. Раз спытаў, другі раз даехаў па памяці. Уладзімір Яўгенавіч скалясіў усю Мінскую вобласць — засталося толькі два гарады, да якіх ён яшчэ не даехаў. У некаторых быў па пяцьдзясят разоў. Ездзіць і па абласных цэнтрах: некалькі разоў быў у Гродне, даводзілася працаваць у Брэсце, Магілёве, нядаўна адкрыў для сябе Віцебск. Падчас такіх паездак цікаўны адвакат яшчэ паспявае наведаць славутыя мясціны, больш блізка пазнаёміцца з гарадамі.

МАГУТНЫ ДЭН

Адной са сваіх вялікіх апошніх перамог Уладзімір Яўгенавіч называе справу па ДТЗ.

— Там смяротны выпадак, а крымінальную справу год не заводзілі, — эмацыйна расказвае адвакат. — Я не кіроўца, таму было складана разбірацца. Але разгледзеў усе дэталі, засвоіў шмат агульных нюансаў у такіх справах. Тры разы накіроўваў скаргу пракурору горада. Урэшце правялі следчы эксперымент, прызналі кіроўцу вінаватым, пісьмова папрасілі прабачэння ў сваякоў загінулай бабулі і выплацілі ўрон. А да мяне цяпер часта звяртаюцца па справах ДТЗ — «сарафаннае радыё» працуе.

Сябры клічуць яго «Магутны Дэн».

— Так і напішыце, бо ён сапраўды ўсё можа, — падказвае мне адвакат, які сядзіць за суседнім працоўным сталом.

Пакуль мы гутарылі, у кабінет па параду да калегі зайшла Жанна Стэфанаўна. Яна ведае Уладзіміра Яўгенавіча больш за чвэрць стагоддзя, яшчэ са студэнцкіх часоў.

— Калі мы вучыліся, ён быў кансалідатарам усіх ідэй, — расказвае Жанна Стэфанаўна. — Менавіта ў яго дома збіраліся ўсе студэнцкія кампаніі. Што там «збіраліся», і па сёння збіраемся! (смяюцца разам. — **Аўт.**) Кожны адвакат беражэ свае сувязі, даражыць сваімі кліентамі. Але ў жыцці бывае рознае. І вось Дзенісенка — гэта той адвакат, якому нясорамна даручыць свайго кліента. Ведаеш, што працу ён выканае ад коркі да коркі. Ён ніколі не падвядзе ні ў прафесійным, ні ў чалавечым плане... Валодзя, дай цукру, — напрыканцы просіць Жанна Стэфанаўна тое, па што прыйшла.

НА ДАЧУ — З АДВАКАЦКІМ ОРДЭРАМ

Дзяржслужбы ўжо ведаюць, што Дзенісенка выедзе на месца па любой справе ў любы час. Папку з дакументамі ён возіць нават з сабой на дачу — а раптам выклічуць. Па законе, любы грамадзянін нашай краіны мае права на бясплатнага адваката падчас затрымання. Гэты адвакат — Уладзімір Яўгенавіч Дзенісенка. Ён не ўмее адмаўляць. З дзевяці здадзеных за мінулы месяц спраў у яго набралася сем бясплатных начных ці выездаў выхаднога дня.

Пры ўсёй сваёй занятасці і адданасці працы, Уладзімір Яўгенавіч жанаты ў трэці раз, мае чацвёра дзяцей. Яго старэйшай дачцэ споўнілася дваццаць сем, а малодшай — чатыры месяцы. Як чалавек творчы (а адвакат — вельмі творчая прафесія, сцвярджае Уладзімір Яўгенавіч) ён шукае натхненне ў жанчыне. Яна яго муза, яго напарніца, якая дапамагае ісці па жыцці з узнятай галавой.

Да творчага юбілею дадаўся ўласны — сёлета Уладзіміру Яўгенавічу споўнілася пяцьдзясят. Святкаваў у два заходы. Спачатку — з блізкімі, пасля — з калегамі, тымі, з кім прыемна працаваць. Старшыня Прэзідыума Мінскай абласной калегіі адвакатаў пісьмова адзначыў і падзякаваў Уладзіміру Яўгенавічу Дзенісенку за шматгадовую працу ў якасці адваката і высокія дасягненні ў справе прафесійнай абароны законных правоў грамадзян.

— Вы толькі не пішыце пра мяне са шкадаваннем, — просіць напрыканцы сустрэчы Уладзімір Яўгенавіч.

Мы выходзім з юрыдычнай кансультацыі апошнімі. Працоўны дзень скончаны паўтары гадзіны таму.

— Ну, мне ў той бок, — развітваецца Уладзімір Яўгенавіч. — Трэба яшчэ заехаць набыць «памперсаў» для малодшай. І да заўтра падрыхтаваць дакументы кліенту. Там працы да паўночы.

А я яшчэ нейкі час не магла зарыентавацца, у які бок ехаць, што трэба зрабіць сёння і калі паспець напісаць артыкул. Я ж не Магутны Дэн. А хацелася б.

Таццяна САЛДАЦЕНКА.

БЕЛАГРА-2010:

КАМУ ВОПЫТ, КАМУ КАНТРАКТЫ, А КАМУ... ЛАЗНЯ!

У 20-ты раз адкрылася міжнародная спецыялізаваная выстава Белагра-2010 ўчора адразу на дзвюх пляцоўках: у сталічным выставачным комплексе на праспекце Пераможцаў, 14 і на выставачнай плошчы ў Мінскім раёне каля ААТ «Гастэлаўскае». Сёлета ў выставе ўдзельнічаюць прадстаўнікі ад 19 краін, у тым ліку Аўстрыі, Германіі, Даніі, Іспаніі, Італіі, Кітая, Францыі і іншых. Аднак, як адзначаюць арганізатары, 70% ад усіх экспанентаў прадстаўляюць Беларусь — у асноўным гэта прадпрыемствы Мінпрама, Мінсельгаспрада і Белптушкапрама.

— Мы ў міністэрстве лічым, што такія выставы не толькі служаць для абмену вопытам, але і прывядуць для заключэння шэрагу кантрактаў на пастаўку і сумесную вытворчасць тых ці іншых сельскагаспадарчых машын і гэтак далей, — расказаў журналістам на адкрыцці выставы **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль ПАЎЛОЎСКІ**.

У асобным павільёне на Белагра-2010 прадстаўленыя госці з Краснадарскага краю. Як расказаў **Сяргей АРЛЕНКА, намеснік міністра сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці Краснадарскага краю**, іх рэгіён зацікаўлены ў сумесных праектах з Беларуссю:

— На сёння Беларусь і Кубань звязваюць вельмі доўгія і добрыя адносіны. Мы бачым перспектывы ў развіцці малочнай прамысловасці, кандытарскай галіне, машынабудаванні. Напрыклад, сёння на палях Кубані працуюць больш за 15 тысяч адзінак сельскагаспадарчай тэхнікі, якая выраблена ў Беларусі.

У прыватнасці, непасрэдна на выставе плануецца заключыць пагадненне паміж гандлёвым домам «Падшыпнік» і Гомсельмашам па зборцы камбайнаў «Палессе».

Цікава, што на Белагра-2010 прадстаўлены не толькі гіганты і вытворцы спецыфічнай і дарагой тэхнікі і абсталявання. Так, «Звяздзе» спадабаліся так званыя японскія лазні, якія прэзентавала СТАА «Балт-Трэйд».

— Гэта зусім іншае, гэта не звычайная лазня, — расказвае **Уладзімір ЗАХАРЧАНКА, начальнік вытворчасці гэтага прадпрыемства** і паказвае на вялікі драўляны чан, разлічаны чалавек на 6-8, да якога прымацавана маленькая печка. — У японскай лазні цела знаходзіцца ў цёплай вадзе, а галава дыхае марозным паветрам. Самае прыемнае — вылезці на борцік, пасядзець на марозе, а потым ізноў плюхнуцца ў цёплую ваду. Ну і паплёскацца, а як жа! — усміхаецца Уладзімір Захарчанка.

Ён расказаў, што іх прадпрыемства займаецца выпускам такіх японскіх лазняў адносна нядаўна — меней за 2 гады, але пры гэтым попыт на такую прадукцыю ёсць. Прычым купляюць такія лазні не толькі прыватныя асобы, але і санаторыі.

— Служыць японская лазня будзе гадоў 30 — гэта калі без

ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ!

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЗБІРАЕЦЦА ПАСТУПАЦЬ

9 ЧЫРВОНАЯ ЗВЕЗДА

ЧЭРВЕНЯ 2010 г. СЕРАДА № 22 (15625)

Рэктар БДУ Сяргей АБЛАМЕЙКА:

«АМАЛЬ 70 ПРАЦЭНТАЎ ПЕРШАКУРСНІКАЎ БУДУЦЬ ЗАСЕЛЕНЫ Ў ІНТЭРНАТЫ»

32 тысячы дзяўчат і хлопцаў вучацца сёння ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Выкладчыкамі ў БДУ працуюць дзве з паловай тысячы чалавек. Наколькі павялічыцца сям'я вядучага ВНУ краіны сёлета? Колькі першакурснікаў зможа разлічваць на месца ў інтэрнаце і якія новыя спецыяльнасці чакаюць абітурыентаў? Пра гэта і не толькі ў інтэрв'ю «Звяздзе» расказаў рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА.

Фота Марыны ЖЫЛІНСКАЙ.

— Сяргей Уладзіміравіч, чым парадаваў год мінулы?

— Шмат было прыемных навін. Паспяхова год склаўся і ў навучальным плане. Хацелася б адзначыць, што мы прайшлі сертыфікацыю па ўкараненні сістэмы менеджменту якасці навучання. У лютым мы ўвялі суперкамп'ютарны кластар. А ў студзені першых жыхароў прыняў новы студэнцкі інтэрнат — № 11.

— Сяргей Уладзіміравіч, якім плануецца набор у БДУ сёлета?

— У параўнанні з мінулым годам сёлета прыём студэнтаў на дзённую бюджэтную форму навучання павялічаны. У першую чаргу гэта звязана з новымі спецыяльнасцямі, якія адкрываюцца ў БДУ. Павялічылася і колькасць месцаў на асобныя спецыяльнасці факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі механіка-матэматычнага факультэта. Агульная колькасць «новых» месцаў сёлета — 106. Прыблізна на столькі ж павялічылі набор на дзённую платную форму навучання. Узрасце і колькасць замежных студэнтаў. На першую ступень навучання мы плануем набраць крыху больш за 400 замежнікаў, на другую ступень — 70, каля 300 чалавек на факультэт даўніверсітэцкай адукацыі.

— Якія новыя спецыяльнасці чакаюць сваіх студэнтаў?

— Штогод у БДУ адкрываюцца некалькі новых спецыяльнасцяў, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням часу. У новым навучальным годзе такіх дзве — «прыкладная інфарматыка» (з рознымі кірункамі на гуманітарным факультэце, факультэтах радыёфізікі і электронікі, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі) і «аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» на факультэце радыёфізікі і электронікі. Акрамя таго, з'явяцца і новыя кірункі на шэрагу нашых традыцыйных спецыяльнасцяў. Так, на факультэце журналістыкі Інстытута журналістыкі на спецыяльнасці «літаратурная работа» адкрываецца кірунак — «творчасць», а на спецыяльнасці «журналістыка» — кірунак «менеджмент СМІ». На механіка-матэматычным факультэце спецыяльнасць «механіка» атрымала новы кірунак — «прыкладная матэматыка». На эканамічным факультэце ў спецыяльнасці «менеджмент» будзе яшчэ адзін кірунак — інавацыйны, а ў Дзяржаўным інстытуце сацыяльных тэхналогій да гэтай жа спецыяльнасці дадаўся кірунак «фінансавы і інвестыцыйны менеджмент».

На спецыяльнасцях «беларуская філалогія» і «руская філалогія» таксама будуць уведзеныя кірункі «камп'ютарнае забеспячэнне» і «літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць». Упершыню з новага семестра для атрымання другой вышэйшай адукацыі плануем пачаць набор па спецыяльнасці «псіхалогія».

— Колькі першакурснікаў змогуць разлічваць на месца ў інтэрнаце?

— На сёння БДУ мае 11 інтэрнатаў. Для студэнтаў агульная колькасць месцаў у іх — звыш 6000. Жылыя месцы размеркаваныя паміж факультэтамі прапарцыянальна колькасці студэнтаў. У цэлым мы забяспечваем інтэрнатам каля 70 працэнтаў першакурснікаў.

— Ад чаго залежыць павышэнне аплаты за навучанне?

— Памер аплаты за навучанне цалкам залежыць ад памеру стаўкі першага разраду ў краіне. Для тых першакурснікаў, якія будуць паступаць на платную форму навучання, варта памятаць, што памер платы ў нас дыферэнцыяваны — залежыць ад канкрэтнай спецыяльнасці канкрэтнага факультэта.

— Наколькі вялікія шанцы ў першакурснікаў быць задзейнічанымі ў праграмах па студэнцкім абмене?

— БДУ мае каля 200 дамоў аб супрацоўніцтве, праграмы па студэнцкіх абменах у нас паспяхова развіваюцца. На сёння актыўныя ВНУ-партнёры ў Германіі, Польшчы, Галандыі, Чэхіі, Славакіі, Нарвегіі, Сербіі, Швецыі, Балгарыі, Кітаі, Карэі і Японіі.

З 2007 года БДУ ўключаны ў праграму акадэмічнай мабільнасці Эразмус Мундус «Магчымасці знешняга супрацоўніцтва», у складзе кансорцыума еўрапейскіх універсітэтаў на чале з іспанскім універсітэтам Дэуста (г. Більбао). Толькі ў межах гэтай праграмы за тры гады больш за 50 студэнтаў і магістрантаў БДУ былі накіраваныя на навучанне ў еўрапейскія ўніверсітэты.

Што датычыцца першакурснікаў, то я не кажу, што ў іх такой магчымасці няма — яна ёсць. Але варта памятаць, што першы курс — гэта аснова ўніверсітэцкай адукацыі. Таму першакурснікам я раіў бы спачатку прывыкнуць да новага вучэбнага распарадку, прывыкнуць да сесіі, уцягнуцца, як кажуць, у вучэбны працэс. А ўжо затым, на курсе трэцім-чацвёртым, пры неабходнасці спрабаваць свае сілы ў студэнцкіх праграмах.

— Вашы пажаданні для абітурыентаў?

— Выбіраць БДУ, бо мы — лепшы ўніверсітэт краіны. Цяпер — самая адказная пара: ЦТ. Поспехаў на тэстах і шчыра запрашаем да нас!

Ілья ЛАПАТО.

Да ведама: на ўсе формы навучання ў БДУ сёлета плануецца прыняць 7092 першакурснікаў. На дзённую форму навучання (за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту) плануецца набраць 2101 чалавека. На ўмовах аплаты план прыёму на дзённую форму навучання складзе 2712 чалавек.

Абітурыенту для занатоўкі:

БУДЗЬ У КУРСЕ!

Сярэдні бал атэстата абітурыента дзённай бюджэтнай формы навучання летась склаў 8,7. Колькасць медалістаў сярод абітурыентаў у параўнанні з 2008 годам павялічылася летась у паўтара раза. Самы высокі конкурс у 2009 годзе — 17 чалавек на месца — назіраўся ў БДУ на гуманітарным факультэце па спецыяльнасці «графічны дызайн».

ЯКІЯ МАГЧЫМАСЦІ СТАЖЫРОЎКІ ІСНУЮЦЬ У СТУДЭНТАЎ БДУ?

Германія: універсітэты Бохума, Йены, Лейпцыга штогод прымаюць 14-18 студэнтаў розных спецыяльнасцяў для навучання на працягу семестра.

Механіка-матэматычны факультэт ажыццяўляе нямецкамоўную праграму падрыхтоўкі студэнтаў сумесна з універсітэтам Магдэбурга. Эканамічны факультэт мае праграму абмену студэнтамі з універсітэтам прыкладных навук г. Анхальта.

З універсітэтамі Польшчы актыўна супрацоўнічаюць гуманітарныя факультэты. Партнёры БДУ: люблінскі ўніверсітэт імя М. Кюры-Складоўскай, універсітэты Варшавы і Лодзі.

8-10 лепшых студэнтаў ФМА і філфака штогод накіроўваюцца на моўную стажыроўку ва **ўніверсітэты Кітая**. 2-3 студэнты, якія вывучаюць карэйскую і японскую мовы, выязджаюць ва ўніверсітэты Чон Бук (Карэя) і Васеда (Японія).

На конкурснай аснове ў індывідуальным парадку студэнты БДУ атрымліваюць стыпендыі міжнародных праграм акадэмічных абменаў (DAAD, COPERNICUS, FCO CHEVENING, HYGENS).

РАЗУМНЫЯ І ПРЫГОЖЫЯ

У БДУ вучыцца нямала тытулаваных прыгажунь: прафесію юрыста тут атрымлівае першая віцэ-міс, а таксама «Міс Еўропа» конкурсу «Міс Інтэркантыненталь-2009» Марыя Есьман, дыпламаванымі журналісткамі хутка стануць «Міс Беларусь-2008» Вольга Хіжанкова, «Міс Прэса» конкурсу «Міс Мінск-2009» Лейла Ісмаілава і 3-я віцэ-міс конкурсу «Міс Турызм Інтэркантыненталь» Яўгенія Няронская. А выпускніца Алёна Аладка, будучы студэнткай гістфака БДУ, на прэстыжным конкурсе «Топ-мадэль свету-2008» заваявала тытул першай віцэ-міс.

ВНИМАНИЮ АБИТУРИЕНТОВ!

Вы можете стать студентом уже сейчас. Открыт прием на заочную форму обучения.

Высшее, второе высшее образование по специальностям:
- **юриспруденция** (специализации: гражданско-правовая, уголовно-правовая);
- **финансы и кредит;**
- **бухгалтерский учет, анализ и аудит;**
- **антикризисное управление;**
- **экономика и управление на предприятии;**
- **менеджмент организации.**

Преимущества обучения в аккредитованных ВУЗах:

❑ Выпускники ВУЗов получают **ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ДИПЛОМЫ,** которые действительны в Республике Беларусь и признаются в других европейских государствах;
❑ **Доступная** стоимость обучения;
❑ **Обеспечение** всех студентов-заочников **общежитием;**
❑ Студенты имеют право на **отсрочку** от призыва на военную службу;
❑ Сроки подготовки специалистов в соответствии с учебными планами и госстандартами:
3,5 года на базе **среднего специального профильного (техникум) и высшего** образования;
6 лет на базе среднего образования;
❑ **Вступительные испытания** проходят **непосредственно в ВУЗах;**
❑ Возможность **выбора ближайшего потока:** II поток – **до 10 июля;**
❑ Последующие потоки: III поток – до 10 августа и 10 сентября;
IV поток – до 10 ноября.

Для получения подробной информации о порядке поступления и обучения обращайтесь в «ВПО ПРОФКОНСУЛЬТАНТ»: 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, д. 20 «А», тел.:

(017) 200 82 57, 200 63 51

GSM (029) 509 82 57, (044) 709 82 57

www.vpo.by УНН 191170822

Свидетельство о государственной регистрации № 191170822 от 26.05.2009 г. Мингорисполкома.

ОБЪЯВЛЕНИЕ

Учреждение образования

«СМИЛОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АГРАРНЫЙ КОЛЛЕДЖ»

Адрес: 223216, Минская область, Червенский р-н, г.п. Смиловичи, ул. М. Горького, д. 12
тел./факс (01714) 53 2 91
тел. приемной комиссии 53 3 72
E-mail: Smilsgak@mail.ru.
Сайт: www.sgak.edu.by.

Готовим специалистов среднего звена для АПК.

Дневное отделение по специальностям:
- Ветеринарная медицина (ОБО), (ОСО);
- Зоотехния (ОБО), (ОСО);
- Пчеловодство (ОБО).

Заочное отделение по специальностям:
- Агрономия;
- Зоотехния;
- Пчеловодство;
- Организация работы крестьянских (фермерских) хозяйств;
- Правоведение;
- Экономика и организация производства;
- Бухгалтерский учет, анализ и контроль.

Лицензия Минобразования Республики Беларусь № 02100/0558563, выд. 29.01.2009 г., действ. до 27.02.2014 г. УНП 690025852.

БГУ – это 20 факультетов и образовательных институтов, 165 кафедр, учебные лаборатории `Nortel Networks и Alcatel, учебные центры компаний Motorola и Philips, сверхпроизводительный суперкомпьютер «СКИФ К-1000-05» и многое другое, что способствует организации учебного и научного процесса на современном уровне. Особенно на специальностях математического, физического и химического направлений.

ХИМИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

Специальность, направления	Квалификации
1. Химия (направление — научно-производственная деятельность). 2. Химия (направление — научно-производственная деятельность, специализация — радиационная химия, специализация — радиохимия). 3. Химия (направление — научно-педагогическая деятельность). 4. Химия (направление — фармацевтическая деятельность). 5. Химия (направление — охрана окружающей среды, специализация — химическая экология)	1. Химик. Исследователь 2. Химик. Исследователь 3. Химик. Преподаватель химии 4. Химик. Химик-фармацевт 5. Химик. Химик-эколог

МЕХАНИКО-МАТЕМАТИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

Специальность, направление	Квалификации
1. Математика (научно-производственная деятельность) 2. Математика (научно-педагогическая деятельность) 3. Математика (экономическая деятельность) 4. Математика (математическая электроника) 5. Математика (WEB-программирование и Интернет-технологии) 6. Математика (компьютерная математика) 7. Механика (научно-производственная деятельность, компьютерная механика) 8. Механика (прикладная механика)	1. Математик 2. Математик. Преподаватель математ. и информатики 3. Математик. Математик-экономист 4. Математик. Конструктор програм.-аппаратых систем 5. Математик. Специалист по информационным технологиям 6. Математик. Системный аналитик 7. Механик. Математик-прикладник 8. Механик. Инженер

ФАКУЛЬТЕТ ПРИКЛАДНОЙ МАТЕМАТИКИ И ИНФОРМАТИКИ

Специальность, направление	Квалификации
1. Прикладная математика 2. Информатика 3. Актуарная математика 4. Экономическая кибернетика (математические методы в экономике) 5. Компьютерная безопасность (математические методы и программные системы) 6. Прикладная информатика	1. Математик-программист 2. Математик — сист. программист 3. Математик-финансист 4. Математик-экономист 5. Специалист по защите информации. Математик 6. Информатик

ФИЗИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

Специальность, направление	Квалификации
1. Физика (научно-исследовательская деятельность) 2. Физика (производственная деятельность) 3. Физика (научно-педагогическая деятельность) 4. Физика (управленческая деятельность) 5. Физика (ядерные физика и технологии)	1. Физик. Исследователь 2. Физик. Инженер 3. Физик. Преподаватель физики и информатики 4. Физик. Менеджер 5. Физик. Инженер

ФАКУЛЬТЕТ РАДИОФИЗИКИ И ЭЛЕКТРОНИКИ

Специальность, направление	Квалификации
1. Радиофизика 2. Физическая электроника 3. Компьютерная безопасность (радиофизические методы и программно-технические средства) 4. Прикладная информатика (программно-аппаратные средства обработки и передачи информации) 5. Аэрокосмические радиоэлектронные и информационные системы и технологии	1. Радиофизик 2. Физик-инженер 3. Специалист по защите информации. Радиофизик 4. Информатик. Специалист по разработке компьютерных систем 5. Специалист по аэрокосмическим системам и технологиям. Радиофизик

Лицензия Министерства образования Республики Беларусь № 02100/0558574, выдана 30.03.2009 г., действительна до 30.04.2014 г. УНН 100235722.

Мікалай ФЯСЬКОЎ:

«СЯРОД СТАБАЛЬНІКАЎ НЯМА ВЫПАДКОВЫХ ЛЮДЗЕЙ...»

Летась удзельнікам цэнтралізаванага тэсціравання па сусветнай гісторыі было прапанаванае заданне па тэме «Вялікая Айчынная і Другая сусветная войны» наступнага зместу: «Да паспяховых ваенных аперацый Чырвонай Арміі ў 1944 годзе адносяцца...» Далей абітурыентам трэба было выбраць адзін правільны адказ з чатырох прапанаваных варыянтаў: 1) зняцце блакады Ленінграда 2) Сталінградская бітва 3) перамога на Курскай дузе 4) Смаленская бітва. Фактычна ў заданні патрабавалася вызначыць адну з важнейшых падзей заключнага этапа Вялікай Айчыннай вайны, і, маючы хоць бы нейкае ўяўленне аб карэнным пераломе ў ходзе вайны ў 1943 годзе, часткай якога былі Сталінградская і Курская бітвы, разумеючы, што Смаленск, які знаходзіцца недалёка ад Масквы, не мог быць у гітлераўскай акупацыі да 1944 года, выбраць правільны адказ, хоць бы метадам выключэння, было зусім нескладана. Аднак для абітурыентаў гэта аказалася сапраўднай праблемай. Толькі кожны дзясяты ўдзельнік тэсціравання змог прыгадаць генерала Даватара, пад камандаваннем якога кавалерыйская група здзейсніла геаічны рэйд па тылах нямецкай групы «Цэнтр» у жніўні-верасні 1941 года. Толькі чацвёртая частка тэстуемых ведала пра подзвігі легендарных Аляксандра Матросава і Аляксея Марэсьева. А кіраўніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху Панамарэнку змаглі назваць толькі 17 працэнтаў тэстуемых.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Нас даволі часта папракаюць у празмернай складанасці тэстаў. Адзін з самых распаўсюджаных міфаў — без рэпетытара да цэнтралізаванага тэсціравання падрыхтавацца немагчыма, бо заданні тэстаў выходзяць за рамкі вучэбных праграм. Стварaецца ўражанне, што сцвярджэнне пра задачы-пасткі падтрымліваецца на слыху толькі для таго, каб маральна апраўдаць неканкурэнтаздольнасць тых, хто апынуўся ў ніжняй частцы рэйтынгавага спісу, — паведаміў у гутарцы з журналістам «Звязды» **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю Мікалай ФЯСЬКОЎ**.

— Не выключана, што такое меркаванне можа быць наруку і самім рэпетытарам, якім, з аднаго боку, вельмі зручна апраўдваць такім чынам нездавальняючыя вынікі сваёй работы, а з іншага, можна гарантавана забяспечыць сябе работай на будучыню... Таму напярэдадні адказнага старту хачу заспакоіць і абітурыентаў, і іх бацькоў: цэнтралізаванае тэсціраванне мае вялікую перавагу перад традыцыйным экзаменам, дзе прапануюцца ўсяго тры-пяць заданняў, якія могуць паставіць абітурыента ў тупік. А падчас цэнтралізаванага тэсціравання фактар латарэі мінімізуецца, і ў абітурыента заўсёды ёсць магчымасць праявіць сябе на тых тэмах школьнай праграмы, якія ён добра ведае.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫ РЭКОРД У ЛІЦЭІ БДУ — 99 БАЛАЎ

У Ліцэі Белдзяржуніверсітэта падвялі вынікі прыёмнай кампаніі. Рэкордную суму балаў — 99 — атрымаў сёлета на экзамене па хіміі мінчанін Сяргей Маўчанскі.

Трэба нагадаць, што пры паступленні ў Ліцэй БДУ абітурыенты здаюць два ўступныя іспыты. Аднак пераможцы рэспубліканскай алімпіяды залічваюцца без папярэдніх іспытаў. Пасля здачы двух экзаменаў прахадны бал на хіміка-біялагічным і філалагічным аддзяленнях — 121, на грамадазнаўчым — 116 і на фізіка-матэматычным — 81.

Сярод шчасліўцаў, якія ў верасні папоўняць шэрагі ліцэістаў БДУ, пераважную большасць складаюць мінчане (75 працэнтаў ад агульнай колькасці). Астатнія месцы — у жыхароў Мінскага раёна і вобласці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Государственное учреждение образования

«СВИРСКИЙ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫЙ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЙ ЛИЦЕЙ»

ПРИГЛАШАЕТ ВЫПУСКНИКОВ С ОБЩИМ БАЗОВЫМ ОБРАЗОВАНИЕМ ПОЛУЧИТЬ СЛЕДУЮЩИЕ ПРОФЕССИИ:

- **водитель автомобиля категории «С»;**
- **тракторист-машинист сельскохозяйственного производства категорий «А», «В», «С», «D»;**
- **слесарь по ремонту сельскохозяйственных машин и оборудования;**
- **лесник;**
- **повар;**
- **швея.**

Срок обучения 2 года 10 месяцев. Иногородние учащиеся обеспечиваются бесплатным трехразовым питанием и общежитием.

Наш адрес: 222394, д. Комарово, ул. Парковая, 11, Мядельский район, Минская область;
тел. 8 01797 37320.

Лицей расположен на территории ГПУ «Национальный парк «Нарочанский».

Лицензия Минобразования Республики Беларусь № 02100/0453839, выд. 30.03.2009 г. действ. до 29.04.2014 г. УНП 600097913

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ «МОГИЛЕВСКИЙ ПРОФЕССИОНАЛЬНО-ТЕХНИЧЕСКИЙ ТОРГОВЫЙ КОЛЛЕДЖ ПОТРЕБКООПЕРАЦИИ»

ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР на 2010 год по направлениям организаций потребкооперации или на платной основе

212039 г. Могилев, ул. Минское шоссе, 22
Тел./факс (0222) 32 18 95
Тел. (0222) 28 97 67 (приемная комиссия)

СРЕДНЕЕ СПЕЦИАЛЬНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ
на основе профессионально-технического образования

Дневная форма получения образования		Заочная форма получения образования	
Специальность	*Срок обучения*	Специальность	*Срок обучения*
«Коммерческая деятельность» (по направлениям) Направление специальности **Коммерческая деятельность (товароведение)** Специализация **Товароведение продовольственных и непродовольственных товаров** Квалификация — **Товаровед**	**1 год 4 месяца**	**«Коммерческая деятельность»** (по направлениям) Направление специальности **Коммерческая деятельность (товароведение)** Специализация **Товароведение продовольственных и непродовольственных товаров** Квалификация — **Товаровед**	**1 год 10 месяцев**

Прием на уровень среднего специального образования осуществляется на конкурсной основе из числа лиц, имеющих профессионально-техническое с общим средним образованием (при наличии профессии «Продавец»). Сроки приема документов: очное с 15 по 20 июля; заочное – с 15 июля по 14 августа.

ПРОФЕССИОНАЛЬНО-ТЕХНИЧЕСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ
на основе общего среднего образования

Дневная форма получения образования		Заочная форма получения образования	
Профессии	*Срок обучения*	*Профессии*	*Срок обучения*
Повар; кондитер	**1 год 4 месяца**	Повар	**8,5 месяца**
Бармен; буфетчик; официант	**10 месяцев**	Официант	**8,5 месяца**
Продавец; контролер-кассир	**10 месяцев**	Продавец	**8, 5 месяца**

Прием осуществляется без вступительных испытаний на конкурсной основе среднего балла общего среднего образования. Сроки приема документов: очное с 15 июня по 20 августа; заочное – с 15 июня по 10 октября.

Учащиеся обеспечиваются общежитием и стипендией.

Лицензия Министерства образования Республики Беларусь № 02100/0533076, выдана 29.01.2009 г., действительна до 27.02.2014 г. УНН 700181440.

Государственное учреждение образования

«СЛУЦКИЙ ПРОФЕССИОНАЛЬНО-ТЕХНИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ ПЕРЕРАБАТЫВАЮЩЕЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ»

ОСУЩЕСТВЛЯЕТ НАБОР УЧАЩИХСЯ в 2010 году

ОЧНАЯ ФОРМА ОБУЧЕНИЯ *(на основе базовой школы с получением общего среднего образования)*

Специальность	*Срок обучения*
Технология хлебопекарного производства *Тестовод; машинист тесторазделочных машин; пекарь*	2 года 10 мес.
Техническая эксплуатация оборудования *Слесарь-ремонтник* Техническая эксплуатация электрооборудования. *Электромонтер по ремонту и обслуживанию электрооборудования*	2 года 10 мес.
Техническая эксплуатация оборудования. *Слесарь-ремонтник.* Технология сварочных работ *Электрогазосварщик*	2 года 10 мес.
Отбор на основе отметок, указанных в документе об образовании	

ОЧНАЯ ФОРМА ОБУЧЕНИЯ *(на основе общего среднего образования)*

Технология маслодельного, сыродельного и молочного производства *Аппаратчик пастеризации; маслодел; сыродел; мастер производства цельномолочной и кисломолочной продукции*	1 год 10 мес.
Торговое дело *Продавец; контролер-кассир (контролер)*	10 мес.
Общественное питание *Повар; кондитер*	1 год 6 мес.
Техническая эксплуатация контрольно-измерительных приборов и автоматики. *Слесарь КИП и А*	10 мес.
Техническая эксплуатация оборудования Слесарь-ремонтник Техническая эксплуатация электрооборудования *Электромонтер по ремонту и обслуживанию электрооборудования* Техническая эксплуатация оборудования *Слесарь-ремонтник*	1 год 6 мес. 10 мес.
Отбор на основе отметок, указанных в документе об образовании	

ОЧНАЯ ФОРМА ОБУЧЕНИЯ *(на основе профессионально-технического образования)*

Учащиеся, успешно закончившие 1-ый курс по специальностям «Технология маслодельного, сыродельного и молочного производства» и «Техническая эксплуатация оборудования», на основе конкурсного отбора переводятся на второй уровень обучения по специальностям «Технология хранения и переработки животного сырья» (квалификация техник-технолог) и «Машины и аппараты пищевых производств» (квалификация техник-механик)	
Технология хранения и переработки животного сырья (техник-технолог)	1 год 10 мес.
Машины и аппараты пищевых производств (техник-механик)	1 год 10 мес.
Экзамен по специальности	

ЗАОЧНАЯ ФОРМА ОБУЧЕНИЯ *(на основе профессионально-технического образования)*

Технология хранения и переработки животного сырья (техник-технолог)	2 год 7 мес.
Машины и аппараты пищевых производств (техник-механик)	2 года 10 мес.
Экзамен по специальности	

НЕОБХОДИМЫЕ ДОКУМЕНТЫ

Очная форма обучения	*Заочная форма обучения*
1. Заявление о приеме в колледж 2. Документ об образовании 3. Медицинская справка 4. Фото – 3 х 4 – 6 шт.	1. Заявление о приеме в колледж 2. Документ об образовании 3. Медицинская справка 4. Фото – 3 х 4 – 6 шт. 5. Выписка из трудовой книжки
Прием документов **с 15 июня по 20 августа** Конкурсный отбор: 1 поток **с 5 по 12 июля;** 2 поток **с 21 августа по 25 августа** Начало занятий **1 сентября.** Все учащиеся обеспечиваются общежитием.	Прием документов **с 15 июля по 8 августа** Конкурсный отбор осуществляется **с 9 по 11 августа** Все учащиеся обеспечиваются общежитием.

Наш адрес: 223610, Минская область, г. Слуцк, ул. Тутаринова, 3; тел. (8 01795) 46460, 46825

Лицензия Министерства образования Республики Беларусь № 02100/0453585, выдана 20.12.2008 г., действительна до 30.01.2014 г. УНН 600119177.

«СЯРОД СТАБАЛЬНІКАЎ НЯМА ВЫПАДКОВЫХ ЛЮДЗЕЙ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Тэсты змяшчаюць заданні пяці ўзроўняў складанасці, а гэта значыць, што кожны ўдзельнік тэсціравання можа адшукаць пасільнае для сябе заданне і рашыць яго, прымяняўшы атрыманыя ў школе веды. Усе іншыя фактары, акрамя ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў, цяпер зведзены да нуля. Усе знаходзяцца ў роўных умовах. І той факт, што ў Мінску сёння востра не хапае месцаў у студэнцкіх інтэрнатах, тлумачыцца якраз тым, што сталічныя ВНУ сталі больш даступнымі для іншагароднікх. У апошнія гады неактуальным становіцца таксама і асобны конкурс для гарадскіх і сельскіх выпускнікоў, бо на многіх спецыяльнасцях агульны бал выпускнікоў сельскіх школ не меншы, а часам нават большы, чым у гараджан. І гэта пры тым, што ў сельскай мясцовасці практычна адсутнічае інстытут рэпетытарства....

Я хачу патлумачыць, што ў педагагічных тэстах, асабліва пры конкурсным адборы, суадносіны складаных і простых заданняў павінны адпавядаць магчымаму дыяпазону падрыхтаванасці абітурыентаў: заданні не могуць быць як вельмі лёгкімі, так і «непад'ёмнымі». Не трэба забываць, што сярод маладых людзей, якія «штурмуюць» ВНУ, акрамя выпускнікоў агульнаадукацыйных устаноў гэтага года ёсць маладыя людзі, якія скончылі школу пяць-дзесяць гадоў таму, а таксама выпускнікі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. І называць тэсты лёгкімі ці складанымі сама меней некарэктна, бо ўсе яны адпавядаюць школьнай праграме. Наша практыка паказвае, што найлепшыя тыя тэсты, дзе няма абсалютных вынікаў і няма нулявых. Нельга бясконца зніжаць узровень тэставых заданняў, бо ў гэтым выпадку ранжыраванне абітурыентаў стане праблематычным... Наяўнасць жа больш складаных заданняў дае магчымасць дыферэнцыяваць найбольш падрыхтаваную групу абітурыентаў з агульнай колькасці прэтэндэнтаў на студэнцкі білет.

— Аднак мінулы год быў асабліва багаты на стабальныя вынікі. На цэнтралізаваным тэсціраванні па беларускай мове — аж 122 максімальныя вынікі! На ЦТ па рускай мове — 30, матэматыцы — 22!

— Леташняя прыёмная кампанія мела адметнасць, якая заключалася ў тым, што ўсе праграмы ўступных іспытаў складаліся з улікам існавання пераходных праграм, па якіх навучаліся вучні 11-х штрых-класаў. І ў іх трапілі толькі тыя тэмы і раздзелы, якія вывучаліся як вучнямі звычайных, так і вучнямі штрых-класаў. Адпаведна былі ўнесены карэктывы і ў спецыфікацыю тэстаў. На тэсціраванні па беларускай мове, у прыватнасці, колькасць заданняў базавага і павышанага ўзроўню складанасці стала аднолькавай (у 2006—2008 гадах заданняў павышанага ўзроўню складнасці было на 10 працэнтаў больш, чым базавага). Аднак некаторае спрашчэнне тэстаў не паўплывала на іх дыферэнцыравальную здольнасць. Так, 122 максімальныя вынікі атрымалі толькі 0,2 працэнта ад агульнай колькасці ўдзельнікаў ЦТ па беларускай мове, а 90 балаў і вышэй — 2,6 працэнта. На 10 балаў і менш напісалі тэст па беларускай мове 1176 абітурыентаў, і тры чалавекі ўмудрыліся набраць увогуле 0 балаў. Я хачу сказаць, што на фоне росту колькасці максімальных вынікаў летась скараціласа і колькасць нулявых вынікаў, што пацвярджае рэальнасць патрабаванняў да ведаў абітурыентаў.

Дарэчы, мы заўсёды цікавімся школьнымі адзнакамі абітурыентаў, якія дасягаюць 100-бальнага парога, месцам іх вучобы, педагогамі, якія працавалі з гэтымі дзецьмі, вынікамі цэнтралізаванага тэсціравання па іншых дысцыплінах. І магу вас запэўніць, што сярод стабальнікаў няма выпадковых людзей. Напрыклад, летась было 4 стабальныя вынікі на ЦТ па хіміі. Усе чатыры стабальнікі аказаліся выпускнікамі Ліцэя БДУ. Агульнавядома, што хімічная, фізічная і матэматычная школы ў гэтай навучальнай установе надзвычай моцныя, што ліцэісты пастаянна пацвярджаюць на розных інтэлектуальных спаборніцтвах. Да таго ж дзве абітурыенткі атрымалі летась па два сертыфікаты з максімальнымі вынікамі: Кацярына Якубёнак, выпускніца Магілёўскага абласнога ліцэя № 3, і выпускніца віцебскай гімназіі № 8 Таццяна Дзятлоўская. Кацярына атрымала 100 балаў на ЦТ па біялогіі і беларускай мове. Прычым на тэсціраванні па хіміі яна таксама набрала 98 балаў. У Таццяны Дзятлоўскай вынік тэсціравання па хіміі таксама быў вельмі высокім — 83 балы.

Мы правялі летась па выніках тэсціравання адзін цікавы аналіз. Прыкладна 17 працэнтаў тых, хто здаваў цэнтралізаванае тэсціраванне, сталі студэнтамі бюджэтнай формы навучання ВНУ. Такім чынам, мы ўсталявалі, што ў школах ёсць пэўныя праблемы з наяўнасцю прыбораў, рэактываў і тэхнічных сродкаў навучання. І мы заўважылі, што працэнт выканання заданняў па фізіцы, хіміі і біялогіі, якія разлічаны на школьны эксперымент і лабараторныя доследы, істотна скарачаецца. На гэту праблему звяртаюць увагу і выкладчыкі, якія рыхтуюць беларускіх школьнікаў да ўдзелу ў міжнародных школьных алімпіядах.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Мы заўважылі таксама, што цяжкасці ва ўдзельнікаў ЦТ выклікаюць заданні з вялікім тэкставым зместам, хоць у тэстах, у адрозненне ад іншых формаў іспытаў, тэкставы змест мінімізаваны. Як толькі тэкст выходзіць за рамкі аднаго-двух сказаў, абітурыентам цяжка ўлавіць яго сутнасць, зразумець, што ад іх патрабуецца. Пасля правядзення апошняга ЦТ мы пацікавіліся, а што за памылкі дапусцілі ўдзельнікі тэсціравання па фізіцы, якія атрымалі больш як 90 балаў — гэта проста бліскучы вынік. Высветлілася, што памылкі былі ў тэкставых задачах, напэўна таму, што абітурыенты проста не зразумелі, пра што ў іх пыталіся. Рызыкну выказваць меркаванне, што гэта можа быць звязана са зніжэннем агульнай моўнай культуры моладзі: сучасныя школьнікі сталі бавіць свой час пераважна за камп'ютарам, тэлевізарам, а зусім не за кнігай. Нізкую культуру мовы мы заўважылі якраз на тэсціраванні па фізіцы і матэматыцы, бо заданні там сфармуляваныя максімальна лаканічна. Мы заўсёды імкнёмся да таго, каб заданні і адказы на іх займалі не больш за трэць старонкі. Асабліваць тэсціравання ў тым, каб выбраць рацыянальны шлях рашэння, таму калі хтосьці сцвярджае, што рашэнне заняло ў яго некалькі старонак, гэта значыць, што абітурыент выбраў не самы кароткі шлях.

...Безумоўна, мова, асабліва пасля з'яўлення інтэрнэту, вельмі хутка эвалюцыянуе. Цяпер абітурыенты добра ведаюць, што такое «тусоўка» і не зусім дакладна тлумачаць значэнне тых слоў, якія паступова выходзяць з нашага ўжытку. Напрыклад, у тэсце па рускай мове быў наступны сказ: «Телега бойко трясётся по колдобинам подсыхающей дороги, ямщик тянет свою долгую песню». Абітурыенты палічылі, што «ямщик» — гэта той, хто клады, калі вучні, якія маюць у школе высокія адзнакі, на тэсціраванні набіраюць дастаткова нізкія балы. Адзін выпускнік гомельскай школы, які меў у атэстаце «васьмёрку» па матэматыцы, здолеў набраць на тэсціраванні толькі адзін бал, што, зразумела, стала шокам для яго сям'і. Але ў гэтым выпадку прэтэнзіі трэба прад'яўляць не да стваральнікаў тэстаў...

— А чым вы патлумачыце традыцыйна невысокія вынікі на ЦТ па прыродазнаўчых і матэматычных дысцыплінах?

— Пагадзіцеся, што ў школах ёсць пэўныя праблемы з наяўнасцю прыбораў, рэактываў і тэхнічных сродкаў навучання. І мы заўважылі, што працэнт выканання заданняў па фізіцы, хіміі і біялогіі, якія разлічаны на школьны эксперымент і лабараторныя доследы, істотна скарачаецца. На гэту праблему звяртаюць увагу і выкладчыкі, якія рыхтуюць беларускіх школьнікаў да ўдзелу ў міжнародных школьных алімпіядах.

Абітурыенты палічылі, што «ямщик» — гэта той, хто капае ямы. У другім варыянце сустракалася слова «обелиск» . Удзельнікі тэсціравання вырашылі, што «обелиск» — гэта жаночае ўпрыгажэнне, нешта накшталт калье.

Мы ўсталявалі, што ў тэстах, у адрозненне ад іншых формаў іспытаў, тэкставы змест мінімізаваны. Як толькі тэкст выходзіць за рамкі аднаго-двух сказаў, абітурыентам цяжка ўлавіць яго сутнасць, зразумець, што ад іх патрабуецца. Пасля правядзення апошняга ЦТ мы пацікавіліся, а што за памылкі дапусцілі ўдзельнікі тэсціравання па фізіцы, якія атрымалі больш як 90 балаў — гэта проста бліскучы вынік. Высветлілася, што памылкі былі ў тэкставых задачах, напэўна таму, што абітурыенты проста не зразумелі, пра што ў іх пыталіся. Рызыкну выказваць меркаванне, што гэта можа быць звязана са зніжэннем агульнай моўнай культуры моладзі: сучасныя школьнікі сталі бавіць свой час пераважна за камп'ютарам, тэлевізарам, а зусім не за кнігай. Нізкую культуру мовы мы заўважылі якраз на тэсціраванні па фізіцы і матэматыцы, бо заданні там сфармуляваныя максімальна лаканічна. Мы заўсёды імкнёмся да таго, каб заданні і адказы на іх займалі не больш за трэць старонкі. Асабліваць тэсціравання ў тым, каб выбраць рацыянальны шлях рашэння, таму калі хтосьці сцвярджае, што рашэнне заняло ў яго некалькі старонак, гэта значыць, што абітурыент выбраў не самы кароткі шлях.

...Безумоўна, мова, асабліва пасля з'яўлення інтэрнэту, вельмі хутка эвалюцыянуе. Цяпер абітурыенты добра ведаюць, што такое «тусоўка» і не зусім дакладна тлумачаць значэнне тых слоў, якія паступова выходзяць з нашага ўжытку. Напрыклад, у тэсце па рускай мове быў наступны сказ: «Телега бойко трясётся по колдобинам подсыхающей дороги, ямщик тянет свою долгую песню». Абітурыенты палічылі, што «ямщик» — гэта той, хто капае ямы. У другім варыянце сустракалася слова «обелиск» . Удзельнікі тэсціравання вырашылі, што «обелиск» — гэта жаночае ўпрыгажэнне, нешта накшталт калье.

Каментарыі, як кажуць, залішнія...

— Мікалай Сцяпанавіч, дайце, калі ласка, абітурыентам некалькі парад, на што трэба звяртаць увагу пры падрыхтоўцы да тэсціравання і падчас іспытаў...

— Матэматыка правамерна лічыцца адным з найбольш складаных школьных прадметаў. І алгебра, і геаметрыя — навукі, дзе навучанне пабудавана па дакладным алгарытме «ад простага да складанага», пры гэтым кожная наступная тэма з'яўляецца прамым ці ўскосным працягам папярэдняй. Прабелы ў ведах становяцца асноўнай прычынай успрымання тэстаў цэнтралізаванага тэсціравання як «занадта складаных», калі рашэнне прасцейшых ураўненняў здаецца непераадольнай праблемай, а страх перад кожным наступным заданнем расце ў геаметрычнай прагрэсіі. Некаторыя ўвогуле нават не спрабуюць разважаць, а проста спрабуюць угадаць правільныя адказы. Хачу папярэдзіць, што ў мінулым годзе 254 удзельнікі тэсціравання па матэматыцы, якія спрабавалі ўгадаць правільны адказ, не атрымалі ўвогуле ніводнага бала. У той жа час выпускнікі, якія крыху забыліся такія тэмы школьнага курса матэматыкі, як лінейныя і квадратныя няроўнасці, трыганаметрычныя і ірацыянальныя ўраўненні, паспрабавалі свае сілы і правільна рашылі заданні, з дапамогай якіх правяралася веданне азначэнняў геаметрычных фігур і элементаў, уменне вызначаць каардынаты пунктаў, працаваць з графікам. Абітурыент, які выбраў матэматыку ў якасці ўступнага іспыту, павінен валодаць рацыянальнымі вылічальнымі прыёмамі, ведаць шмат формул ці пры неабходнасці ўмець вывесці патрэбную формулу, і ўмець прымяняць іх у ходзе рашэння ўраўненняў, прыкладаў, задач як часткі А, дзе трэба выбраць правільны адказ з прапанаваных варыянтаў, так і часткі В, дзе адказ трэба знайсці самастойна. Алгарытм рашэння задачы павінен узнікаць ужо ў працэсе чытання ўмовы. Першыя заданні ўвогуле можна рашаць вусна, але для гэтага трэба, як кажуць, набіць руку.

На тэсціраванні па фізіцы і хіміі, мы, напрыклад, назіраем нярэдка пралікі менавіта ў матэматычнай падрыхтоўцы абітурыентаў, гэта значыць, што правільна рашыўшы задачу «фізічна», абітурыенты дапускаюць памылкі ў рашэнні сістэмы ўраўненняў, у матэматычных пераўтварэннях формулаў, пры выкананні дзеянняў з вектарамі, трыганаметрычнымі функцыямі і гэтак далей. Некаторыя абітурыенты памыляюцца пры аналізе графікаў, не могуць прымяніць правілы прыблізных вылічэнняў, правільна акругліць канчатковы адказ. Для таго, каб справіцца з тэстам па фізіцы, неабходна выдатна валодаць усімі матэматычнымі аперацыямі. Зразумела, што ў выйгрышы будуць абітурыенты, у якіх развіты навык вуснага лічэння.

Часта абітурыенты несур'ёзна падыходзяць да задачы: не ўнікаючы ў сутнасць умовы, адразу прыступаюць да яе рашэння. Від задачы можа падацца знаёмым, але трэба ўпэўніцца ў тым, што гэта менавіта тая задача, якую вы рашалі раней. Умова яе можа адрозніваца ўсяго адным-двума словамі, але калі гэтага не заўважыць, у выніку атрымаецца памылковае рашэнне.

На выкананне 50 заданняў тэста на ЦТ па хіміі адводзіцца 120 хвілін — гэта менш чым 2,5 хвіліны на адно заданне, таму многія педагогі і бацькі абітурыентаў нярэдка абураюцца дэфіцытам часу. Аднак педагагічныя тэсты — гэта не школьная кантрольная работа, і дэфіцыт часу — адна з умоў выканання тэста, які дазваляе дыферэнцыяваць абітурыентаў па ўзроўні іх падрыхтоўкі. Трэба вучыцца пераразмяркоўваць час: выкананне заданняў 1-2 узроўняў складанасці трэба даводзіць да аўтаматызму, каб больш часу засталося для вырашэння разліковых задач і ланцужкоў пераўтварэнняў. Правільная самаарганізацыя — гарантыя поспеху на ЦТ. Стрэс і дадатковае напружанне адчуваюць усе без выключэння ўдзельнікі тэсціравання. І калі мы хочам правесці справядлівы конкурсны адбор, то павінны дзейнічаць па адзіных для ўсіх абітурыентаў правілах і не рабіць зніжак на тэмперамент ці іншыя асобасныя якасці. Святлафор гарыць аднолькава для ўсіх, і яму ўсё роўна, хто пераходзіць дарогу: халерык ці флегматык. А калі хтосьці не паспявае прайсці дарогу на зялёнае святло, то гэта адразу стварае праблемы для ўсіх удзельнікаў руху...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРАФЕСІІ БУДУЧЫНІ

Амерыканскія кадравікі ўпэўненыя, што ў найбліжэйшае дзесяцігоддзе можа значна павялічыцца колькасць маладых амбіцыйных кар'ерыстаў. Асабліва попыт на юнакоў і дзяўчат ўзрасце ў інавацыйных сферах, такіх, напрыклад, як біямедыцынская інжынерыя.

Новым галінам, якія хутка развіваюцца, будзе асабліва не хапаць высокакваліфікаваных спецыялістаў. Чакаецца, што ў найбліжэйшыя пяць гадоў у сферы нанатэхналогій з'явяцца сотні тысяч вакансій для моладзі. Пры гэтым заробкі ў гэтай галіне будуць вельмі высокімі. Інавацыі ў медыцыне таксама патрабуюць прытоку маладых навукоўцаў. Сістэма аховы здароўя ЗША робіць стаўку на вырошчванне штучных органаў і развіццё сістэм візуалізацыі. У гэтых сферах колькасць працоўных месцаў павялічыцца на 72 працэнты.

Запатрабаваныя будуць і так званыя «зялёныя прафесіі» ў сучасных галінах, звязаныя з распрацоўкай біяпаліва і энергіі ветру. Паліўных тэхналогаў пакуль не так шмат, таму Міністэрства працы ЗША заклікае маладых людзей задумацца над атрыманнем адукацыі ў гэтай сферы.

Акрамя інавацыйных у пашане застануцца і такія прафесіі, як педагог спецыяльнай адукацыі, псіхолог, архітэктар і адвакат. Праўда, у гэтых сферах істотна ўзмоцніцца барацьба за працоўнае месца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

На свае вочы

РЭТРАспектыўныя нірвана

У Мінску прайшоў «Супердыскач 90-х»

Ласіны вярнуліся. 4 чэрвеня пятнічны канцэрт у «Мінск-Арэне» збіраўся нагадаць пра моду на афрапарыкі, фанцікі «Турба» і Бруса Лі. Выступленні некалі папулярных Dr. Alban і Mr. Prezident, SNAP! і Rednex абяцалі парваць залу сталічнай «Мінск-Арэны» яшчэ за месяц да выступлення. У метро круцілі іх рэтра-песні, на вуліцах раздаваліся ўлёткі на рэтра-канцэрт, у касах прадаваліся білеты на рэтра-артыстаў. Шоу абяцалася цікавае і эмацыйнае.

Фота Наталлі ЧАРКЕСАВАЙ.

Каб далучыцца да свята і адчуць сябе часцінкай «ліхіх дзевяностых», стомленыя сучаснай папсой беларусы сціскалі апошні рубель і куплялі білет за Br70 тысяч на танцпол. Тыя, для кага сціскаць — зусім не праблема, ішлі далей і набывалі квіткі ў VIP-зону. Туды «ліхія дзевяностыя» абяцалі прыйсці за Br290 тысяч.

ПАНАЕХАЛА...

Першымі атмасферу 90-х адчулі журналісты. Узрадаваныя незвычайнай навіной, у «Мінск-Арэну» яны прыкацілі за дзве гадзіны да пачатку. Абяцаная прэс-канферэнцыя павінна была адказаць на галоўныя пытанні: якой міласцю Беларусь заслужыла ўвагу масцітых зорак і ў колькі ўся гэта радасць абышлася? Але спешчаным журналістам давялося пачакаць. Гэта сёння на інтэрв'ю капрызная зорка павінна прыйсці ў час, у 90-я яна мела права спазніцца.

Прасядзеўшы ў пустым пакоі цэлую гадзіну, прэса яшчэ не ведала, што сядзець без справы давядзецца яшчэ столькі ж — артысты ў гэты час былі яшчэ ў гатэлі, дзе адпачывалі пасля прылёту.

— Што за неарганізаванасць? — абуралася маладая карэспандэнтка, якой у тым жа 1990-м было ад двух да пяці.

— 90-я вярнуліся! — засмяяўся ў адказ маладжавы мужчына. — Прывыкай...

Зорку ўсё ж прычакалі. Праўда, яна была адна і праз 15 хвілін ёй трэба было быць на сцэне, але журналістаў гэта не спыніла. Чарнаскуры спявак ICE MC перад камерамі пачуваўся звыкла і нават па-свойску. На ўсе пытанні ён адказваў па-англійску, не здымаючы сонцаахоўных акуляраў.

— Прыехалі ўчора. Убачылі толькі гасцініцу, але пакуль усё вельмі падабаецца.

90-я для яго найперш — гэта слава і вялікія продажы дыскаў. Факт, што яго фанаты ўжо маюць дзяцей, спевака не засмучае, ён лічыць, што кожны фанат — гэта дар.

ПРА ГЛЕДАЧОЎ І ГАРЭЛКУ Ў VIP-ЗОНЕ

«Дары» з Беларусі «Мінск-Арэну» запаўнялі не зусім актыўна. У 19.15, калі канцэрт павінен быў ужо ісці, але не ішоў, народ толькі прыбываў. На сцэне барабанілі рытмы дваццацігадовай даўніны, на трыбунах рэдзенька мільгалі сем'і з дзецьмі і толькі-толькі пачынаў разварушвацца танцпол. Уваходзячы, людзі ажно святліліся ад шчасця — так ім хацелася хутчэй пабачыць артыстаў. Некаторыя ж святліліся зусім ад іншага шчасця: гламурна трымаючы ў руках трубачку для пітця, жанкі і мужы пілі энергетычныя напоі.

Тут не шамацелі фанцікамі і не было ружовых «варон» у ласінах. Відаць, знакаміты дрэс-код, нібыта пускаць будуць толькі з атрыбутыкай 90-х, быў проста піярам. Гульнявых аўтаматаў «Марскі бой», старых рэкламных плакатаў і відэасалона з VHS-касетамі ў фае «Мінск-Арэны» таксама не назіралася — гэта было міфам, на які купіліся многія.

І вось вядучыя на сцэне аб'явілі першага выступоўцу. «Рваць» залу пайшоў ICE MC.

Праз гадзіну ад пачатку танцпол было не пазнаць. Людзей нібы токам праняло: весяліліся па поўнай, прычым як маладзенькія дзяўчаткі, так і грамілы-мужыкі з піўнымі жыватамі. У асобную групу я выдзеліў бы «танцораў-інтэлігентаў». Толькі ўявіце: настаўніца малодшых класаў і сціплы выкладчык іспанскай мовы «запальвалі» ва ўсю, матляючы сцёгнамі і плячыма не горш за моладзь. Нірваны тут дасягалі калі не ўсе, то амаль усе: нерухомымі заставаліся хіба што ахоўнікі — каменныя твары і завучаныя на памяць фразы: «Сюды нельга, як прайсці не ведаю».

На танцполе было, як у начным клубе: цёмна, людна і весела. Атмасфера шалёных дыскатэк і рваных джынсаў паступова ахутвала кожнага яе ўдзельніка. Сцэна ўвасабляла сабой ужо новае вымярэнне, быццам паралельны свет адкрыўся і ўсе зноў адчулі смак 90-х. Тыя, каму гэтага было недастаткова, ішлі «запраўляцца» ў VIP-зону.

— Гэта ж атмасфера 90-х — алкаголь дазволены! — нібы дзеці, радаваліся арганізатары.

ПАЙШЛІ, АЛЕ АБЯЦАЛІ ВЯРНУЦЦА

— Мне вельмі спадабалася «Мінск-Арэна», усё проста супер — задаволены абсалютна ўсім, — не хавае эмоцый пасля выступлення саліст гурта Brooklyn BOUNGE. У Беларусі спявак упершыню, да гэтага пра нашу краіну ён не ведаў і не чуў. — На жаль, паглядзець Мінск я не паспеў, бо прыехаў толькі сёння. А заўтра зранку ўжо вымушаны ляцець дамоў... Але я абавязкова вярнуся, каб пазнаёміцца з Беларуссю бліжэй.

Салісты гурта 2UNLIMITED, у адрозненне ад калегі з Brooklyn BOUNGE, пра Беларусь не проста чулі, а нават бачылі. І дзе б вы думалі? На «Еўрабачанні»! 2UNLIMITED, калі ў Осла праходзіў музычны конкурс, акурат збіраліся ў Беларусь, таму сваю ўвагу на беларускую каманду звярнулі. І «матылькі» ім нашы запомніліся.

Вось сяджу я зараз і думаю, а што калі ў якім-небудзь 2030-м «Мінск-Арэна» будзе прымаць гэтых самых «матылькоў», Агурбаш з Елфімавым ці «Фабрыку зорак»? І на танцполе скакаць ужо буду я і мае аднагодкі? Жарты жартамі, а як запэўнілі арганізатары, падобны «супердыскач» атрымае працяг. Ужо восенню «Мінск-Арэна» прыме новых гасцей з 90-х. Перамовы з гуртамі «Тэхналогія» і «Камбінацыя» ўжо вядуцца. Мегагосцем на шоу плануюць зрабіць гурт «Руки вверх».

Ілья ЛАПАТО.

Ларыса БАБУШКІНА:

«Дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам»

Дзвюм цікавым жанчынам, дзвюм палярна супрацьлеглым асобам, але аднолькава адданым сваёй справе — служыць Радзіме — нядаўна было прысвоена чарговае званне «палкоўнік». Здавалася б, нічога незвычайнага. Калі б не адно «але». Такое высокае званне ўпершыню было прысвоена ў беларускім войску жанчыне. Адразу дзвюм! Пра службу, пра сям'ю, а галоўнае — пра сакрэт сумяшчэння дзвюх роляў: сур'ёзнага, адказнага чалавека і ласкавай, клапатлівай дачкі, жонкі і маці — расказалі нашай газеце Ларыса Бабушкіна і Марына Перавёртава.

Інтэрв'ю вырашылі правесці прама на працоўным месцы. На сваё здзіўленне я не пачула цвёрдае ваеннае: «Зараз мяне ні для каго няма! Просьба не турбаваць». Дзверы штораз адчыняліся, дыктафон спыняў запіс, чалавек атрымліваў указанне, дапамогу ці кансультацыю і пакідаў кабінет. Наша размова працягвалася.

Да кожнага — вельмі ўважлівая і чуллівая, з усімі ветлівая. З пацыентамі, як з добрымі знаёмымі: не часта такое ўбачыш. Нават заходзілі проста павіншаваць з новым званнем Ларысу Васільеўну Бабушкіну.

Парадак і строгасць — з дзяцінства

Самага нараджэння бацькі бачылі ў сваёй дачцэ будучага ўрача. Маленькую Ларысу прываблівала прыгожая белая форма, імкненне да парадку і строгасці. Праўда, і юрыстам тады хацелася быць, але медыцына ўсё ж перамагла. Усё пачыналася з «практыкі» на ляльках: гатавала ім «лекі», ставіла тэрмометры, праслухвала фанендаскопам — усё як трэба. Праўда, абыходзілася без тэорыі. Здаецца, дзіцячыя забавы. Аднак цікавасць да медыцыны не прайшла з дзяцінствам.

Пасля заканчэння школы з сярэбраным медалём было вырашана паступаць у Гродзенскі медыцынскі інстытут. Пасля чатырох курсаў прапанавалі працягнуць вучобу на ваенна-медыцынскім факультэце ў горадзе Куйбышаве (сёння Самара), дзе Ларыса і скончыла навучанне. Акрамя звычайных прадметаў як у любой медыцынскай ВНУ, вывучала і спецыяльныя, з ваенным ухілам. Раней у Беларусі ні адна ўстанова не рыхтавала ваенных медыкаў. Так яна атрымала дзве адукацыі — вышэйшую медыцынскую і ваенную.

Пасля размеркавання праходзіла службу ў Брэсце, пасля працавала ў Слуцкім ваенным шпіталі. Ларыса прайшла ад самай першай прыступкі па ўсёй ваеннай лесвіцы: спачатку курсант, маладшы лейтэнант, лейтэнант... І, нарэшце, палкоўнік. Усё ў час. Сёння Ларыса служыць у Галоўным ваенным клінічным медыцынскім цэнтры Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь на пасадзе намесніка начальніка цэнтра — начальніка медыцынскай часці амбулаторнага цэнтра.

Фота Мікалая ЛЯБЕДЗІКА.

Яны першыя: Марына ПЕРАВЁРТАВА (злева) і Ларыса БАБУШКІНА толькі што атрымалі пагоны палкоўніка.

Нельга і не хочацца быць такой заўсёды

У вольны час Ларыса Васільеўна любіць заняцца сабой: фітнэс, басейн. Аднак яна ведае, як правільна размеркаваць час так, каб хапіла ўсім блізкім. Сямейныя ніколі не застаюцца без яе ўвагі. Строгасць на службе растварэцца ў хатняй утульнасці. «Нельга і не хочацца быць такой заўсёды. Часам хочацца, каб хтосьці і табой пакамандаваў і падумаў за цябе і рашэнне тое ці іншае прыняў», — прызнаецца Ларыса Васільеўна. Безумоўна, дома яна выходзіць з ролі сур'ёзнай і патрабавальнай жанчыны-камандзіра, хоць, прызнаецца, не заўсёды атрымліваецца і на службе быць «жалезнай лэдзі». Ларыса Васільеўна мае адну рысу характару, якой не вельмі задаволена. Гэта — мяккасць: «Часам трэба быць больш жорсткай, але калі становіцца шкада чалавека — нічога зрабіць з сабой не магу...».

Вельмі важнымі яна лічыць адносіны ў калектыве. Трэба ўлічваць характар людзей, трэба ўмець зліцца з імі. Без гэтага, лічыць яна, проста не будзе ўзаемаразумення. Асноўная ж задача медыкаў — аказанне дапамогі, і работа іх накіравана на тое, каб гэта рабіць хутка і якасна. А магчыма гэта толькі ў добрым і зладжаным калектыве.

6 мая Ларыса Бабушкіна атрымала воінскае званне «палкоўнік медыцынскай службы». Вельмі вялікі гонар, лічыць яна, атрымаць жанчыне такое званне. Тым больш што афіцэрскія пагоны ўручаў сам міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Юрый Жадобін. «Дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам»,— адзначае Ларыса Васільеўна. «Было надзвычай прыемна, што блізілася вялікая святочная дата — 9 Мая. Атрымаць пагоны напярэдадні такога свята сімвалічна. Ва ўсім горадзе эмацыйны настрой, пад'ём, здаецца, за нас радаваліся ўсе. Бо мы перамаглі!» — кажа палкоўнік.

БЛІЦ-АПЫТАННЕ

— На якую справу штодня не хапае часу?

— На чытанне кніг. Сёння шмат інфармацыі паўсюль: тэлебачанне, інтэрнэт. Катастрафічна мала часу застаецца на кнігі.

— Што можа не спадабацца ў чалавеку пры першай сустрэчы?

— Кантынгент у нас розны. Нічога не можа не спадабацца. Знешні выгляд асаблівай ролі не адыгрывае і не павінен адыгрываць. Асноўная наша задача — аказваць дапамогу. Заходзяць да нас розныя хворыя. Калі прыйшоў — штосьці прывяло да мяне. Ёсць праблема. Значыць, будзем разам яе вырашаць. А ў жыцці не падабаецца — хамства, грубіянства.

— Аб якім няздзейсненым у свой час учынку шкадуеце дагэтуль?

— Я ні аб чым не шкадую. Калі б жыццё пачалося спачатку, нічога б не мяняла ў ім.

— Элемент камфорту, без якога немагчыма абысціся дома.

— Ваенныя людзі неперабарлівыя. Мы можам працаваць і ў палявых умовах. Вайсковец павінен быць гатовы да ўсяго. І да любой адсутнасці камфорту. Трэба — значыць трэба.

— Ідэал мужчыны?

— Мужчына проста павінен быць Мужчынам. Павінен прымаць рашэнні, падтрымліваць, несці адказнасць за жанчыну...

— Што можаце пажадаць тым, хто імкнецца высока ўзняцца па ваеннай лесвіцы?

— Перш за ўсё працавітасці і ваеннага шчасця, не трэба баяцца цяжкасцяў і адказнасці. Некаторыя баяцца, таму не рызыкуюць пераходзіць на больш высокія пасады, якія прадугледжваюць і большую адказнасць. Не трэба баяцца разумна рызыкаваць...

Марына ПЕРАВЕРТАВА:

«Маё жыццё — сын і праца»

Праца для Марыны Генадзьеўны — значная частка яе жыцця. На пасадзе намесніка начальніка цэнтра — урача-эндакрынолага гастраэнтэралагічнага цэнтра Галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Узброеных Сілаў яна працуе з 2006 года. Увесь час у клопатах, у справе, яе амаль немагчыма адарваць ад любімага занятку. Я паспрабавала высветліць, адкуль столькі самаадданасці і энергіі.

— Прыкладам для мяне заўсёды быў дзядуля, ваенны лётчык, які прайшоў усю вайну капітанам, дайшоў да Берліна разам з бабуляй. Пазней атрымаў маёра, пайшоў у адстаўку ў званні палкоўніка, але гэта ўжо ў мірны час. Я была адзінай дачкой, і бацькі вельмі хацелі, каб я спраўдзіла іх надзеі — стала ўрачом. У сям'і ваеннага так і атрымалася: сказана — зроблена.

— І з чаго вы пачыналі сваю кар'еру?

— У 1992 годзе скончыла Віцебскі медыцынскі інстытут, некаторы час пасля заканчэння інстытута працавала на «грамадзянцы». Пазней з шэрагаў запасу прызвалася ва Узброеныя Сілы, служыла ў Віцебску, сённяшняй 103-й гвардзейскай асобнай мабільнай брыгадзе, а з 1995 года — у Мінску.

— Якія прынцыпы вы выкарыстоўваеце ў рабоце?

— Галоўнае, што я ў першую чаргу ўрач, і не важна — палкоўнік ці капітан, перш за ўсё чалавек.

— Як сумяшчаеце такую нялёгкую работу і сям'ю?

— Работа, сапраўды, не з простых, ёй аддаю большую частку свайго жыцця. У мяне падрастае сын, цікавіцца камп'ютарамі. Увесь вольны час праводзім з ім разам. На працы я патрабавальная і строгая. І не дзіўна, праца і адказнасць — паняцці непадзельныя, але дома з сынам я — мама.

— Кім думае стаць ваш сын?

— Да выбару прафесіі сына стаўлюся спакойна. Кім захоча, тым і стане, абы каб чалавекам добрым быў і спраўдзіў мой давер.

— Вы адна з першых жанчын у Беларусі, якім прысвоілі званне палкоўніка. Як гэта ўсведамляць, што я — першая? Раскажыце пра свае пачуцці.

— Я ніяк сябе не вылучаю. Мне вельмі прыемна, што я дасягнула нейкага чарговага этапа ў жыцці, асабліва таму, што да нас з Ларысай Васільеўнай у Беларусі жанчын-палкоўнікаў не было. Мары наконт гэтага ніякай не было. Так склаўся лёс. Я ведала, што так будзе. Па-іншаму не магло і быць!

БЛІЦ-АПЫТАННЕ

— На якую справу штодня не хапае часу?

— З раніцы да вечара я на працы. І застаюся тут з калегамі столькі, колькі трэба. А галоўныя складнікі майго жыцця — сын і праца...

— Што вам не падабаецца ў людзях?

— Калі чалавек агрэсіўна настроены, гэта не падабаецца. Аднак прафесія прывяла да таго, што з любым чалавекам можна знайсці агульную мову. Я і імкнуся знаходзіць. Таму калі гаворка ідзе аб прафесійным кантакце, то не падабаецца не можа нічога.

— Хацелі б што-небудзь змяніць у сваім жыцці?

— Ёсць адзін такі ўчынак. Была б магчымасць, зрабіла б інакш.

— Элемент камфорту, без якога немагчыма абысціся дома?

— Гэта ўсе кампаненты, неабходныя сучаснай жанчыне. Я адношу сябе да ліку звычайных жанчын.

— Ідэал мужчыны?

— Чалавек з вялікім сэрцам. Без каментараў.

— Як лічыце, якімі якасцямі трэба валодаць у першую чаргу тым, хто служыць у ваеннай сферы?

— Перш за ўсё цярпеннем, спакоем і працаздольнасцю.

Таццяна БОЛТУЦЬ,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
**Адказны за выпуск — намеснік галоў

У пошуках духоўнай апоры

Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія Чытанні адкрылі дыскусію вакол выкладання рэлігіі ў школе. З ініцыятывай выступіла Царква. А спецыялісты загаварылі пра гуманітарную бяспеку дзяржавы. І, відаць, нездарма.

Дастаткова ўважліва паглядзець зводку крымінальных здарэнняў. Большасць паведамленняў у ёй пра тое, як маладыя, здаровыя крадуць, рабуюць, а то і яшчэ горай. Са свежых навін: у Лунінцы маладая жанчына нарадзіла здаровае немаўлятка і кінула ў надворную прыбіральню. У Брэсце распачаліся дзве судовыя справы аб забойствах старых людзей. Старых забівалі, каб адабраць грошы. Скажаце, і раней такое было? Было, ды не так і не столькі. Раней нават за калючым дротам тых, хто ўзняў руку на старога альбо дзіця, чакала доля ізгоя. Таму яны нярэдка аддавалі перавагу самагубству, каб не трапляць у турму і не станавіцца недачалавекам зоны. Значыць, нават у тым асяродку існаваў маральны бар'ер, які пераступаць было нельга. Цяпер ён, падобна, страчаны нават на волі. Бо не баяцца грамадскага асуджэння ні забойцы, ні п'яніцы, ні тыя, хто кідае альбо забівае дзяцей. Яны наогул нічога не баяцца.

Наіўна думаць, што дастаткова прачытаць гэтым людзям курс рэлігійных асноў, расказаць пра боскія запаведзі, і яны стройнымі шарэнгамі пойдуць да новага жыцця. У каго душы пустыя, тым наўрад ці дапаможаш. Але ж нешта рабіць трэба, і найперш для тых, у каго душа не пустая альбо ёсць хоць нейкі шанц яе напоўніць чалавечымі паняццямі.

Калі вялікая частка нашых людзей «клюе» на прымітыўныя серыялы і ток-шоу, на нізкапробныя дэтэктывы і рознага роду камп'ютарнае смецце... Ды што пра гэта, варта якому-небудзь гора-прапаведніку прыехаць немаведама адкуль і затуманіць мазгі, нашы людзі гатовыя ехаць на край зямлі і ў яе залезці. Усё гэта сведчыць, што духоўных арыенціраў бракуе, яны адсутнічаюць у многіх і многіх. Таму не можа застаравацца ўбаку сістэма адукацыі. Людзі старэйшага пакалення ўсё ж на нечым выхоўваліся. І хай цяпер маладыя пасмейваюцца над радком з песні, які мог бы стаць дэвізам да ўсяго тагачаснага выхавання: «Раньше думай о Родине, а потом о себе». Была створана дзейсная сістэма ідэалагічнага і маральнага выхавання, наўрад ці будзе хто з гэтым спрачацца. Цяпер выхоўваць не тое што няма на чым... Але не пераадолена нейкая бессістэмнасць, хаатычнасць ва ўсім адукацыйным працэсе, выкліканая, цалкам верагодна, шматлікімі рэформамі, пераменамі, няскончанымі пошукамі аптымальных варыянтаў. З аднаго боку, здавалася б, адукацыя становіцца больш дэмакратычнай — тэсты, дзесяцібальная сістэма, заданні, што стымулююць самастойную працу, а з іншага — жорсткія рамкі, патрабаванні ў афармленні, скарачэнне гуманітарных курсаў. Са школьнай праграмы старэйшых класаў амаль прапала сачыненне як форма самавыяўлення вучня. Цяпер толькі выкладанне, блізка да тэксту: крок управа, урок улева — дрэнная адзнака. А сачыненне, як нішто іншае, вучыць дзяцей думаць, разважаць. Мой настаўнік рускай мовы і літаратуры ў сельскай школе ў канцы звычайнага ўрока па якой-небудзь тэме пісаў на дошцы тры тэмы сачыненняў (на выбар) і дату, да якой належала работу здаць. Болей ніякіх каментараў не давалася. Як, у якой форме, у якім аб'ёме пісаць, вырашаў вучань. Пазней стала зразумела, што такім чынам абуджалася творчасць, думка.

Навучыць юнага чалавека думаць, мысліць, суадносіць сябе з сусветам, з грамадствам — праблема з праблем. Вось чаму я выступаю за ўвядзенне курса рэлігійнай культуры. Можа хоць некага, пэўную частку вучняў гэтыя ўрокі падштурхнуць да разважання, да пошуку ісціны, як некалі заклікаў Калеснік. Ніхто ж не кажа, што пасля ўрокаў рэлігійнай культуры ўсе павінны рынуцца ў царкву ды біцца галавой аб падлогу. Бо як сказаў аднойчы Аляксій II, не той хрысціянін, хто на Вялікдзень яйкі фарбуе. А, відавочна, той, хто свядома не зробіць зла, перш за ўсё.

Матэрыяльныя каштоўнасці выйшлі на першы план у грамадстве. Рынак дыктуе няўмольныя ўмовы да дасягнення ўласнага дабрабыту, якія, мякка кажучы, не заўсёды сябруюць з маральнымі прынцыпамі. Грамадства рэзка размяжоўваецца. Ужо і ў школьным класе, і ў студэнцкай групе адметная розніца паміж дабрабытам бацькоў вучняў і студэнтаў. Скажаце: вось вам арыенцір для бедных, вучыся, старайся, дасягай. Не так усё проста. Па-першае, так званыя багатыя амаль заўсёды паводзяць сябе з выклікам. А бедныя часта адказваюць зласлівасцю. Што гаварыць пра дзіцяча-юнацкія калектывы, нядаўна была проста ўражана выпадкам з жыцця дарослага працоўнага калектыву. У адной шаноўнай арганізацыі адна вельмі заслужаная супрацоўніца атрымала рэспубліканскую стыпендыю ў выглядзе штомесячнай даплаты да заробку тэрмінам на год. Што сталася з калектывам?! Вітацца амаль перасталі. Жанчына расказвала, што ўжо мінуў той год, вярнулася яе мізэрная зарплата, а калегі ўсё яшчэ не могуць перажыць яе часовую ўдачу. Зайздрасць — другая навала дзяленняна на багатых і бедных. У гэтым дзяленні спецыялісты знаходзяць вытокі тэрарызму і іншых выклікаў нашага часу. Цяперашні Патрыярх Кірыл яшчэ гадоў пяць таму выступаў з вялікім артыкулам у «Известиях», дзе спрабаваў перакананаць багатых ды і дзяржавы ў неабходнасці ўсведамлення справядлівага размеркавання багацця. Інакш непазбежнымі выглядаюць войны, рэвалюцыі і г.д. Але ж чакаць, пакуль багатыя прыйдуць да такога ўсведамлення, відаць, тое самае, што чакаць другога Прышэсця.

Мая даўняя знаёмая, паспяховая бізнэс-лэдзі, успамінаючы 90-я, калі яны пачыналі, кажа, што кар'еры і багацці ўзнікалі часта на пустым месцы з нахабства і азарту. Потым былі гады напружанай працы. І вось ужо ў іх дзяцей ёсць магчымасць атрымліваць добрую адукацыю, атрымліваць у падарунак кватэры і машыны. Іх дзеці абароненыя ад жыццёвых нягод. А хто абароніць іншых дзяцей? Хто ім давядзе, што аб'ектыўна не могуць быць багатымі ўсе, што калі ты не збудаваў маёнтак на беразе вадаёма ці на маляўнічай паляне, яшчэ не значыць, што жыццё прайшло дарэмна? Псіхолагі ўсё часцей гаворуць пра крызіс сярэдняга ўзросту, калі чалавек праводзіць прамежкавы вынік і пераацэнку каштоўнасцяў і наступствы гэтага крызісу. Не ўсе дастойна выходзяць з яго. Нават маленькія ўласныя крызісы пераходнага ўзросту ўсё часцей становяцца падставай для суіцыдаў. Чалавек адзінокі ў грамадстве, нават у інфармацыйным грамадстве з развітой камп'ютарнай сеткай, з магчымасцю для маладых рэалізоўваць сябе праз свой блог, праект, сацыяльную сетку. Напісана шэраг кніг, накшталт «Адзінота ў вялікім горадзе» з рэкамендацыямі, як знайсці шляхі да самарэалізацыі. Але мала хто ўмее прымерваць гэтыя рэцэпты да сябе ды праводзіць іх ва ўласнае жыццё. І зноў прыходзім да таго, з чаго пачыналі: няма апоры, духоўнага арыенціра. Трэба, каб хоць нехта на самым пачатку станаўлення чалавека дапамог разабрацца з добрым і дрэнным, з галоўным і другасным. Тут вельмі важна асоба настаўніка, таго, хто будзе выкладаць гэты курс. Недастатковай выглядае яго тэарэтычная падрыхтаванасць, трэба каб чалавек найперш з'яўляўся прыкладам быцця, а таксама валодаў душэўным тактам, уменнем пераконваць на звычайных жыццёвых прыкладах.

Ну а для тых, хто абаронены клопатамі бацькоў, хто паспяхова вучыцца і не мае асаблівых праблем, а таксама хто лічыць сябе атэістам, думаю, курс не будзе лішнім. Хоць бы таму, што праз нейкі час яны будуць кіраваць дзяржавай, бізнэсам, пісаць законы. Законы, як вядома, ад Рымскага права, Статута ВКЛ ствараліся менавіта на аснове рэлігійных традыцый грамадства. У асобных краінах, відаць, дрэнна вывучалі гэтыя традыцыі, калі напісалі такія законы. Я кажу зараз пра Фінляндыю са скандальнай гісторыяй пра дэпартацыю бездапаможнай хворай 82-гадовай жанчыны. Па тамтэйшых законах дарослыя маці і дачка не з'яўляюцца блізкімі родзічамі. Таму бабульцы і адмовілі даць пасведчанне на права жыхарства, і не даюць магчымасці дачцэ дагледзець маці. Да слова, партнёры па аднаполым шлюбе там прызнаюцца блізкай раднёй... «Такі закон», — разводзіць рукамі прэзідэнт краіны і прызнаецца, што не можа дапамагчы хворай старэнькай, хоць і надзвычай ёй спачувае. І тут у нашага чалавека, зразумела чаму, узнікае крамольная думка: «То на халеру такая дэмакратыя, калі ніхто не можа спыніць законную бесчалавечнасць?» Вось вам і тэма для ўрока рэлігійнай культуры: закон, дэмакратыя і традыцыі. Толькі не варта ўводзіць урокі ў 5-6-м класах, я думаю трэба не раней за 7-ы клас.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

АДЗІНЫ Ў СВЕЦЕ ПАДРУЧНІК ПА БЕЛАРУСКАЙ СТЭНАГРАФІІ НАПІСАЎ КРАЯЗНАЎЦА З ЛІДЫ

Станіслаў Суднік ужо 4 гады выкладае гэты прадмет у Лідскім каледжы

Паняццю «стэнаграфія» (хуткапіс асаблівымі знакамі) больш за 400 гадоў (упершыню тэрмін ужыты ў Англіі Дж. Уілісам у 1602 годзе). А беларусы да нядаўняга часу сваёй сістэмы не мелі, карысталіся расійскай, вынайдзенай амаль 200 гадоў таму. Дарэчы, да рэвалюцыі стэнаграфія прыраўноўвалася ў Расійскай імперыі (куды ўваходзіла і Беларусь) да ведання замежнай мовы...

Гэтую недарэчнасць выправіў вядомы краязнаўца з Ліды Станіслаў СУДНІК. Спадар Станіслаў захапіўся стэнаграфіяй яшчэ ў школе, а колькі гадоў таму вырашыў выправіць хібу і распрацаваў беларускую сістэму стэнаграфіі.

Сістэма Судніка ўзятая не з неба — за аснову прынятая выпрабаваная і прызнаная руская сістэма Сакалова, паводле якой, між іншым, створана і польская сістэма. Умоўна кажучы, беларускі, рускі і польскі стэнаграфісты лёгка «скумекаюць на траіх», бо «przez», «праз» і «через» пішуцца аднолькавым значком.

— Без сістэмы стэнаграфіі беларуская лінгвістычная сістэма не поўная, — мяркуе спадар Суднік. — Бо мы маем шмат дапаможных навук мовазнаўства, маем шмат слоўнікаў, але стэнаграфія мусіць прысутнічаць у любой мове!..

КАМЕНТАР СПЕЦЫЯЛІСТА

«Гэтую сістэму неабходна зацвердзіць у Камітэце стандартызацыі!..»

Навуковым рэдактарам падручніка выступіў вядомы мовазнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Павел СЦЯЦКО. Спадар Павел пракаментаваў «Звяздзе»:

— Трэба адзначыць, што Станіслаў Вацлававіч Суднік вельмі адказна паставіўся да стварэння айчыннай сістэмы стэнаграфіі, выкарыстаў напрацоўкі папярэднікаў, выкладзеныя ў «Адзінай сістэме стэнаграфіі СССР», сістэме стэнаграфіі Расіі, сістэме стэнаграфіі Польшчы. Цешыць, што аўтару ўдалося вырашыць дзве задачы — як мага больш ашчадна падысці да сістэмы Сакалова і адначасова як мага больш поўна ўлічыць асаблівасці беларускай лінгвістычнай сістэмы. Важна падкрэсліць, што спадар Суднік апрабоўваў сваю сістэму ў Лідскім каледжы, чым была пацверджана яе лагічнасць і завершанасць. Як сведчыць практыка, беларуская сістэма стэнаграфіі дазваляе дасягаць тых самых паказальнікаў хуткасці і чытэльнасці, што і руская. Праца Станіслава Судніка заслугоўвае ўхвалы і ўдзячнасці аўтару, а распрацаваная ім сістэма беларускай стэнаграфіі — зацвярджэння ў Дзяржаўным камітэце стандартызацыі Рэспублікі Беларусь.

Дзе сёння мы можам пабачыць стэнаграфіста? На высокіх дзяржаўных нарадах, у судзе — стэнаграфісты натуюць усё ў адмысловыя нататнікі. Прымяненне дастаткова вузкае. Аднак з мінулых часоў захавалася шмат стэнаграм пасяджэнняў, мерапрыемстваў, нарадаў... І каб расшыфраваць іх, трэба мець адпаведных спецыялістаў.

— Мяркую, што стэнаграфія сёння незаслужана занядбаная, — сумуе Станіслаў Суднік. — Зразумела, вынайдзены дыктафоны, камп'ютары... Аднак дыктафон вы мусіце праслухаць некалькі разоў, каб зняць тэкст, а стэнаграфіст здольны запісваць ПОЎНЫ тэкст у рэжыме жывога маўлення. І пасля гэтыя знакі хутка расшыфраваць, набраўшы на камп'ютары звычайныя словы. Вам, журналістам, раю засвойваць стэнаграфію, будзеце толькі ў выгадзе!..

Цяпер мэта спадара Судніка — засведчыць беларускую сістэму стэнаграфіі ў Дзяржаўным камітэце па стандартызацыі. Бо тры гады ён выкладаў дысцыпліну ў Лідскім каледжы без падручніка — спецыяльна, каб выпрабаваць сістэму на вучнях, выправіць дробныя хібы, адшліфаваць. За гэты час стэнаграфію вывучылі больш за 120 навучэнцаў спецыяльнасці «справаводства і архіўная справа». Цяпер, калі сістэма выпрабаваная і ўдасканаленая, спадар Суднік спадзяецца, што беларуская стэнаграфія будзе зацверджаная на дзяржаўным узроўні.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота пададзена Станіславам СУДНІКАМ.

Паркоўка ў Мінску зноў становіцца платнай, але не ўсюды

У Мінску з 9 чэрвеня ўводзіцца плата за паркоўку транспарту. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў дырэктар ДУ «Паркоўкі сталіцы» Леанід Дарашчонак.

Пры гэтым плата будзе спаганяцца на паркоўках, якія абсталяваны сродкамі па прыёму грошай — касавымі апаратамі і паркаматамі (спецыяльныя карткі можна набыць у газетных кіёсках). Таму платных парковак у сталіцы будзе менш: замест дваццаці, як гэта было раней, — пяць. Але гэта пакуль. Астатнія будуць пераходзіць з разраду бясплатных у платныя па меры аснашчэння абсталяваннем, растлумачыў Леанід Дарашчонак. Кантралёры на паркоўках застануцца. Яны будуць толькі сачыць за аплатай. Браць грошы яны не маюць права.

Пералік платных аўтамабільных парковак:

па вул. Ульянаўскай (пляцоўка насупраць дамоў №№ 22, 24) на 130 машынамесцаў;

на пл. Паўднёвай (ДС Дружная) на 100 машынамесцаў;

на пл. Юбілейнай (каля дома № 2 па вул. Кальварыйская) на 60 машынамесцаў;

па вул. В. Харужай 22, 24 на 100 машынамесцаў;

па вул. Мяснікова (цотны бок каля дома № 40) на 70 машынамесцаў.

Тарыфы на паркоўку ў спецыяльна абсталяваных месцах, зацверджаныя рашэннем гарвыканкама:

— паркоўка транспартнага сродку да 20 хвілін — Br1 тыс., ад 21 хвіліны да 1 гадзіны за кожную наступную гадзіну паркоўкі — Br2 тыс.;

— кругласутачная паркоўка транспартнага сродку за адну гадзіну часу з 19.00 да 9.00 — Br300;

— абанемент на месяц для паркоўкі транспартнага сродку пры рэалізацыі фізічным асобам — Br80 тыс., юрыдычным асобам — Br100 тыс.;

— пры разліку карткамі паркоўкі з фіксаваным часам 20 хвілін — Br1 тыс., 60 хвілін — Br2 тыс.

Таксама зацверджаны тарыфы пры разліку электроннымі дэбетовымі карткамі.

Паркоўка легкавых аўтамабіляў з прычэпам, мікрааўтобусаў, аўтобусаў, грузавых аўтамабіляў аплачваецца па тарыфу ў двайным памеры.

ВЕНГЕРСКІ СІНДРОМ



Пра новы паварот развіцця і паглыбленне крызісу еўра наш карэспандэнт гутарыць з вядомым беларускім эканамістам, членам Грамадска-кансультацыйнага Савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Л.Ф. Заікам.

— У мінулы панядзелак еўра ўстанавіў чарговы антырэкорд — звалiўся да паказчыка 1,19 еўрацэнтаў за амерыканскі долар. І як прадказваюць асобныя фінансавыя аналітыкі, гэта не апошняя рыса. Беспрэцэдэнтны крызіс еўра моцна ўплывае і на сусветныя біржы, і на нашых суайчыннікаў, многія з якіх мінулым летам-восенню перавялі свае сродкі ў еўра. Яны цяпер моцна нервуюцца, знаходзяцца ў роспачы, бо не ведаюць, куды бегчы і ў якую зараз валюту перавесці зберажэнні.

— Бегчы нікуды не трэба. Той, хто бегае і пастаянна мяняе адну валюту на іншую, той ці рэгулярна зарабляе велізарныя грошы, ці наадварот, пастаянна спазняецца і істотна губляе на розніцы курсаў. У першым выпадку трэба валодаць каласальнымі ў мільярдных вылічэннях свабоднымі сумамі валюты, мець каласальны ўплыў на фінансавыя рынкі планеты, каб час ад часу ствараць выгадныя для сабе і партнёраў сітуацыі. Планетарнага маштабу «фінансавыя акулы» ганяюцца за вялікай здабычай і па дробязі не гуляюць. У гэтым сэнсе валютным гульцам Беларусі застаецца толькі выступаць у ролі гледача і назіраць за тым, як развіваецца фінансава-эканамічная сітуацыя ў свеце. Ды і Нацыянальнаму банку краіны таксама. Бо сёння дакладна спрагназаваць курс еўра і долара пад сілу толькі выключным эканамістам, і то не гарантыя. Гэта могуць быць і шчасліўчыкі, якім проста пашанцуе. Але ў цэлым на фінансавых рынках ніколі не бывае адназначнай сітуацыі ў доўгатэрміновай перспектыве.

— Дык што, звычайнаму, так бы мовіць, сярэднестатыстычнаму жыхару Беларусі, які хоча захаваць свае працоўныя зберажэнні, неабходна штодзень сачыць за зводкамі з валютных біржаў?

— Зразумела, не. Гэта занятак для інстытутаў спецыяльных пасрэднікаў і іх супрацоўнікаў: аналітыкаў, менеджараў. Да такіх пасрэднікаў адносяцца банкі, крэдытныя саюзы, але ў асноўным такой работай займаюцца інвестыцыйныя кампаніі і фінансавыя фонды. Дакладней, яны адсочваюць усе працэсы на фінансавых рынках і рэкамендуюць, куды больш выгадна ўкладваць грошы: у якія каштоўныя паперы, акцыі якіх фірмаў, канкрэтна ў якую валюту, магчыма ў нерухомасць, буйныя інвестыцыйныя праекты. Ва ўсім свеце гэта ўжо агульнапрынятая практыка. За мяжой ні Джон, ні П'ер ці Ганс не сядзяць дома за камп'ютарамі і не аналізуюць самастойна з калькулятарам у руцэ суадносіны еўра і долара, іншых валют, каб зрабіць правільны выбар. Там гэтым займаюцца, падкрэслю, спецыялісты.

— Можа, і ў нас такіх спецыялістаў некалі будзе дастаткова, але цяпер, часцей за ўсё, кожны сам сабе фінансавы аналітык і дарадца. Тым больш і рэспубліканскія СМІ на першы план выносяць навіны аб падзеях на фінансавых рынках. Тут ёсць ад чаго разгубіцца, калі твае зберажэнні ў еўра літаральна растаюць на вачах.

—Так, тыя, хто аддаў перавагу еўра, памыліліся і сёлета моцна страцілі. А з пачатку года ў Беларусі самая высокая прыбытковасць назіраецца па беларускім рублі, затым па расійскім рублі і ўжо толькі потым па амерыканскім долары. Увогуле варта запомніць усім аматарам гульні на валютных курсах — гэта рызыкоўная гульня і рэдка каму ўдаецца выйсці з яе без вялікіх страт. Учора было выгадна прадаваць еўра, але хто ведае, можа праз месяц выгадным стане набыццё гэтай еўравалюты. І як бы тут не праляцець. Па маіх разліках, бліжэй да восені курс еўра пачне расці.

— Леанід Фёдаравіч, а як усё ж звычайнаму чалавеку абысцiся мінімальнымі стратамі, калі нават адукаваным дасведчаным эканамістам цяжка прагназаваць суадносіны еўра і долара?

— Я ўжо разоў сто казаў у розных аўдыторыях, у тым ліку і праз вашу газету, што не трэба захоўваць зберажэнні ў адной валюце. Паўтару яшчэ раз. Скажам, у вас ёсць 10 тысяч амерыканскіх долараў. Я параіў бы раскласці іх у чатыры ўмоўныя кошыкі. 2,5 тысячы перавёў бы ў беларускія рублі і паклаў бы на дэпазіт, 2,5 тысячы пакінуў бы ў доларах, 2,5 тысячы канвертаваў у еўра, астатнія 2,5 тысячы перавёў бы ў расійскія рублі. І не варта хаваць гэтыя грошы ў панчохах, а трэба несці ў банкі. У панчохах калі і захоўваць, то золата і срэбра, бо яны з'яўляюцца сапраўднымі і надзейнымі грашыма. Усе астатнія — гэта сурагаты.

— І цікава, як шмат зараз грошай на руках у насельніцтва?

— Па маіх самых сціплых падліках, прыкладна шэсць мільярдаў долараў ЗША. Гэта мінімальная лічба. Максімальная — каля

Гульні на валютных курсах — гэта рызыкоўная гульня і рэдка каму ўдаецца выйсці з яе без вялікіх страт.

дзесяці мільярдаў долараў, якімі аперыруе насельніцтва краіны. Таму, адхіляюся ад тэмы размовы, але скажу, сёння наспеў час стварыць нацыянальную сістэму зберажэнняў, якая працавала б на карысць народа. А не пазычаць ураду невялікія сумы ў 100—200 мільёнаў долараў у Міжнароднага валютнага фонду, Сусветнага банка, Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця.

— У гэтых уплывовых фінансавых інстытутаў, відаць, работы хутка прыбавіцца. Новым галаўным болем усёй Еўропы абяцае стаць Венгрыя, дзе праявілася тая ж хвароба, што і ў Грэцыі. Менавіта Венгрыя, якая не ўваходзіць у еўразону, тым не менш стала прычынай чарговага абвастрэння крызісу еўра. Наколькі гэта сур'ёзна?

— У тых ці іншых краінах урады, каб паказаць сваю эканоміку ў лепшым выглядзе, схільныя да ўпрыгожвання статыстыкі. Урады ўсім кажуць: у нас усё добра. Зменшыўся паказчык валавога ўнутранага прадукту на 2-3 працэнты? Не бяда. Схаваем ад грамадскасці і партнёраў. Пагоршылася бюджэтная сітуацыя? А мы не пакажам яе рэальны стан. І гэтак далей. Паступова праблемы назапашваюцца, урады пачынаюць прыдумваць больш-менш лагічныя тлумачэнні сваіх непрыгожых паводзінаў, а ў сапраўднасці хлусіць народу і краінам-суседзям па кантыненце. Так было і ў Грэцыі, і ў Партугаліі. Цяпер вось Венгрыя. Там многія, калі не большасць прадпрыемстваў, зрабілі стаўку на еўра, на экспарт ў краіны еўразоны. Быў час, калі Венгрыя выдатна зарабляла там на пастаўках сваёй прадукцыі. Але ўпаў еўра і адразу выкрыліся хітрыкі былога ўрада краіны. Венгрыі рэальна пагражае эканамічны крызіс.

— А як у Грэцыі, нармалізавалася становішча?

— Адносна. Дзякуючы экстраннай дапамозе Еўрасаюза, створанага ім стабілізацыйнага фонду ўдалося пакуль выратаваць і адзіную еўрапейскую валюту, і саму Грэцыю ад банкруцтва. Цікавая дэталь: выдзеленыя некалі Грэцыі крэдыты вярнуліся вядучым еўрапейскім банкам, якія ў свой час шчодра крэдытавалі эканоміку Грэцыі. Усё паўтараецца: буйныя банкі прыватызуюць прыбыткі і нацыяналізуюць страты, перакладваюць іх на плечы звычайных людзей.

— Трапна заўважана. Днямі канцлер ФРГ Меркель аб'явіла аб жорсткіх мерах эканоміі, у тым ліку і скарачэнні сацыяльных выплат, у прыватнасці, сем'ям беспрацоўных бацькоў, каб стымуляваць іх самастойны пошук заробку. Здаецца, гэтая тэндэнцыя чакае ўсю Заходнюю Еўропу. Як гэта адаб'ецца на Усходняй Еўропе?

— Вельмі проста. У Заходняй Еўропе пачнуць адмаўляцца ад паслуг замежнай працоўнай сілы і сотні тысяч замежнікаў: туркаў. харватаў, украінцаў, літоўцаў, у тым ліку і нашых суайчыннікаў, будуць вымушаны вярнуцца дамоў і шукаць працу. Хацелася, каб яны знайшлі яе.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ п/п	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь участка, га	Наличие ограничений в использовании	Расходы по подготовке документ.	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Мостище, участок № 10, № 623287606101000100	0,1926		1 342 216	7 704 000	770 000
2	д. Мостище, участок № 11, № 623287606101000104	0,1826		1 342 216	7 304 000	730 000
3	д. Мостище, участок № 12, № 623287606101000105	0,2048		1 342 216	8 192 000	820 000
4	д. Погребище, участок № 7, № 623287607101000058	0,1026		1 484 813	4 104 000	410 000
5	д. Кроква, участок № 1, № 623287603101000049	0,1500	водоохранная зона ручья	1 342 216	1 500 000	150 000
6	д. Цна, участок № 4, № 623287609601000024	0,1841	водоохранная зона р. Цна	1 462 326	11 046 000	1 100 000
7	д. Цна, участок № 5, № 623287609601000025	0,2177	водоохранная зона р. Цна	1 462 326	13 062 000	1 300 000
8	д. Морозовка, участок № 1, № 623287605601000006	0,25		1 342 216	2 500 000	250 000
9	д. Морозовка, участок № 18, № 623287605601000023	0,2048		1 342 216	2 048 000	205 000
10	д. Морозовка, участок № 19, № 623287605601000022	0,2132		1 342 216	2 132 000	210 000
11	д. Таковщина, участок № 1, № 623287608601000034	0,1875		1 462 326	1 875 000	190 000
12	д. Таковщина, участок № 2, № 623287608601000035	0,1875		1 462 326	1 875 000	190 000
13	д. Таковщина, участок № 3, № 623287608601000036	0,1875		1 462 326	1 875 000	190 000
14	д. Таковщина, участок № 4, № 623287608601000037	0,1875		1 462 326	1 875 000	190 000

Задаток перечисляется на р/с № 3600619161107, ЦБУ № 611 филиала № 500. Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601, г. Логойска. УНП 600181592, Швабский сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях яго проведения. Аукцион состоится **9 июля 2010 г. в 10.00** по адресу: д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Логойского района, Минской обл. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **до 6 июля 2010 г.**

Контактные телефоны: (8 01774) 59 1 35, 59 2 35, (+375 29) 107 16 17.

Наш сайт в интернете logoysk.gou.by

ШАРКОВЩИНСКОЕ РАЙОННОЕ ПОТРЕБИТЕЛЬСКОЕ ОБЩЕСТВО

ПРОВОДИТ 3 ЭТАП ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже здания прирельсового склада, расположенного по адресу: Витебская обл., г.п. Шарковщина, ул. Вокзальная, 1.

Состав имущества:

Наименование строения, год постройки	Характеристика строения	Назначение строения	Общая площадь строения
Здание прирельсового склада, 1966	Крыша – волнистая, фундамент – бутобетон, стены – кирпичные, пол – дощатый	Здание специализированное складов, хранилищ	1 232,9 кв.м

Земельный участок для содержания и обслуживания здания – 0,1862 га.

Начальная цена – 76 348 696 бел. руб. с НДС.

Размер задатка – 7 634 870 бел. руб. Аукцион состоится **18.06.2010 г. в 08.00** по адресу: Витебская обл., г.п. Шарковщина, ул. Краснодворская, 1. Заявления на участие и необходимые документы принимаются ежедневно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по **17 июня 2010 года** до 13.00.

Договор купли-продажи заключается не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» № 79 от 24 апреля 2010 г., № 102 от 28 мая 2010 г.

Контактные телефоны: (802154) 4 12 31, 8029 127 46 93, смотрите информацию на сайте www.minsk-region.gov.by в разделе «Аукционы»

УНП 300032909

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 17 июня 2010 года в 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений – **11.06.2010 года** до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников.**

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон, желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) копию квитанции о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3642017441709** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж);** б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт и нотариально заверенную доверенность.**

Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с ПСД за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе по нескольким лотам, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой.

Победители аукциона обязаны: в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 4 миллиона рублей.

№№ Лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 1	переулок 1-й Ровчакова, 1	0,0921	740100000001004766	448 544	17 180 000	1 546 000
Лот № 2	переулок 1-й Ровчакова, 5	0,0938	740100000001004768	448 544	17 497 000	1 575 000
Лот № 3	переулок 1-й Ровчакова, 7	0,0942	740100000001004769	448 544	17 572 000	1 581 000
Лот № 4	переулок 1-й Ровчакова, 9	0,0946	740100000001004770	453 364	17 647 000	1 588 000
Лот № 5	переулок 1-й Ровчакова, 11	0,0973	740100000001004771	448 544	18 150 000	1 634 000
Лот № 6	переулок 2-й Ровчакова, 2	0,0990	740100000001004774	448 544	17 937 000	1 614 000
Лот № 7	переулок 2-й Ровчакова, 4	0,0986	740100000001004776	448 544	17 865 000	1 608 000
Лот № 8	переулок 2-й Ровчакова, 10	0,1074	740100000001004781	448 544	19 459 000	1 751 000
Лот № 9	переулок 3-й Ровчакова, 4	0,0998	740100000001004783	448 544	18 082 000	1 627 000
Лот № 10	переулок 3-й Ровчакова, 6	0,0972	740100000001004784	461 519	17 611 000	1 585 000
Лот № 11	переулок 1-й Сараканайский, 7	0,0932	740100000001004765	448 544	16 886 000	1 520 000

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

ВАШ ШЛЯХ ДА ЗДАРОЎЯ

Рэспубліканскі цэнтр медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння: дыягностыка, прафілактыка, рэабілітацыя

Галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Сяргей КАРЫЦЬКА.

— Трэба мяняць менталітэт людзей у стаўленні да свайго здароўя, якія, як правіла, узвальваюць увесь адпаведны клопат на дзяржаву. Так, дзяржава ў многіх выпадках павінна клапаціцца пра наша здароўе. Але гэта можа датычыцца інфекцыйных захворванняў, анкалогіі, хірургічных умяшанняў, рэанімацыйных мерапрыемстваў. А вось што датычыцца шмат чаго іншага, тут усё павінна залежаць непасрэдна ад самога чалавека. Банальная ісціна, тым не меней: у першую чаргу трэба весці здаровы лад жыцця. Трэба таксама як мінімум 2 разы на год прымаць спецыяльныя аздараўляльныя працэдуры, у прыватнасці тыя, якія прапануе наш цэнтр. І на гэта трэба планаваць свой бюджэт так, як плануюць яго на тэхнічнае абслугоўванне асабістага аўтамабіля. Часта пры гэтым кажуць: маўляў, не хапае грошай... Я не так ужо рэдка бываю на папулярных канцэртах у Палацы Рэспублікі, Палацы спорту — паглядзіце, што там робіцца: усё забіта, і білеты дарагія... Безумоўна, культура, культурнае жыццё — гэта вельмі важна. Але калі б сярод жыццёвых прыярытэтаў чалавека на першым месцы стаяла здароўе, то многія спачатку прыйшлі б менавіта да нас, у наш цэнтр, на нашы працэдуры, а ўжо потым пабеглі б на канцэрт...

Загадчык лабараторыі Уладзімір КРАЎЧУК і ўрач-лабарант Арына ВАЛАСЕНКА.

Так сказаў падчас гутаркі галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Сяргей Карыцька (тут жа неабходна дадаць: ён жа — заслужаны ўрач краіны, кандыдат медыцынскіх навук. А яшчэ — чалавек з творчым ухілам: піша вершы, прычым на яго вершы складзены песні)...

Такім чынам, наш сённяшні расказ пра Рэспубліканскі цэнтр медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння.

* * *

Што ўяўляе сабой сёння гэты цэнтр? Удакладнім: раней гэта была гарадская прафсаюзная водагразелячэбніца санаторнага тыпу...

Сёння тут налічваюць тры асноўныя кірункі дзейнасці. Адзін з іх — спецыялізаваная эндакрыналагічная дапамога насельніцтву рэспубліканскага ўзроўню, або хворым на цукровы дыябет, пацыентам з цяжкай паталогіяй шчытападобнай залозы, з парушэннямі гіпаталамагіпофізнай функцыі, з недастатковай выпрацоўкай гармонаў росту (як правіла, дзеці). Як падкрэсліваюць у цэнтры, у ім аказваюць дапамогу менавіта тым, хто мае рэдкую і цяжкую паталогію эндакрыннай сістэмы; хворыя паступаюць сюды па накіраваннях абласных дыспансэраў і іншых медыцынскіх устаноў.

Другі кірунак — аказанне кансультацыйнай дыягнастычнай дапамогі «чарнобыльцам». Некалі на базе Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі размяшчаўся рэспубліканскі ж цэнтр радыяцыйнай медыцыны. Апошні з цягам часу пераехаў у Гомель, а тут цяпер абслугоўваюць пацыентаў з Мінска і Мінскай вобласці.

І трэці кірунак — гэта дзейнасць рэабілітацыйна-прафілактычнага характару, дзейнасць па агульным аздараўленні людзей. Па сутнасці, цэнтр выконвае функцыі ранейшай водагразелячэбніцы, толькі ўжо ў адпаведнасці з новымі, значна больш шырокімі магчымасцямі. На аздараўляльныя працэдуры чалавек можа патрапіць па пуцёўцы (адпаведна, яе трэба папярэдне атрымаць у сябе на працы або купіць непасрэдна ў цэнтры). Па пуцёўках аказваецца комплекс самых разнастайных лекава-аздараўляльных паслуг. Адна пры жаданні пацыенты цэнтра могуць прымаць (купіць) і толькі асобныя працэдуры.

Што прапануюць у цэнтры?

У ім, як зазначаюць тут, у першую чаргу выкарыстоўваюць усе старыя добрыя метады лячэння. Гэта, у прыватнасці, гразелячэнне і водалячэнне (пра новыя віды паслуг цэнтра будзе сказана ніжэй). Пры гразелячэнні прымяняюцца беларускія гразі — сапрапелі з возера Судобль у Смалявіцкім раёне і возера Дзікае (Дзятлаўскі раён). Разам з тым, ужо трэці год, як сюды прывозяць сульфідныя гразі са знакамітага пры савецкім часе курорта Сакі. А сёлета пачалі прывозіць лекавыя гразі нават з Мёртвага мора ў Ізраілі. («Ёсць ахвотныя — калі ласка», — зазначаюць у цэнтры.) Лекавы механізм уздзеяння гразяў — вядомы, гэта ў першую чаргу глыбокае праграванне, якое эфектыўнае пры касцёва-сустаўных захворваннях і захворваннях пазваночніка. Гразі дапамагаюць і пры іншых захворваннях.

Пасля гразевай працэдуры няблага б забрацца ў ванну... А калі ласка, у цэнтры такіх ванных працэдур, заснаваных ужо на водалячэнні, каля 20 відаў — радонавыя, жамчужныя, шкіпінарныя, бішафітныя, ёдабромістыя, гідрагальванічныя, хвойныя і іншыя. Прычым гэтыя ванны — практычна ўсе на мінеральнай вадзе, за выключэннем асобных з іх, для якіх патрабуецца прэсная вада.

Да паслуг пацыентаў таксама розныя віды лекавага душа (цыркулярны, падводны душ-масаж, душ Шарко), басейн — з мінеральнай жа вадой.

Як падкрэслівала загадчыца фізіятэрапеўтычнага аддзялення Наталля Афанасенка, у цэнтры выконваюцца таксама ўсе віды электралячэння, у тым ліку лячэнне палярызаваным святлом і лазератэрапія; нядаўна тут асвоена такая лекавая працэдура, як лімфамат (уздзеянне пры дапамозе кампрэсіі і дэкампрэсіі, якія перадаюцца праз спецыяльныя манжэты на руках і нагах на сасудзістую сістэму арганізма; як падкрэслівалі ў цэнтры, гэта працэдура асабліва эфектыўная пры варыкозным расшырэнні венаў).

* * *

— У вас лішняя вага? А вось мы дакладна даведаемся, ці так гэта насамрэч...

Прыкладна такімі словамі могуць сустрэць у цэнтры пацыента з адпаведнай праблемай. Сутнасць у тым, што не зусім абгрунтавана разлічваць «правільную» вагу чалавека па добра вядомым індэксе, які характарызуе суадносіны масы яго цела і росту, а абгрунтавана зыходзіць з таго, колькі чалавек мае ў сябе тлушчу, які працэнт. Норма для жанчын не больш за 31 працэнт, для мужчын — не больш за 25.

— Прыходзьце да нас, у наш кабінет метабалічных парушэнняў, — запрашаюць у цэнтры, — мы дакладна вызначым і вашы «лішкі сацыяльных накапленняў». І адкарэктуем вашу вагу. Гэта не азначае таго, што мы тут жа зробім вас стройным, але канчатковы вынік будзе вельмі відавочным...

Адпаведны курс, а згодна з тэрміналогіяй медыкаў цэнтра, адпаведная комплексная праграма, разлічаны мінімум на 3 месяцы. Саму ж праграму запусцілі ў цэнтры (дакладней — адкрылі той жа кабінет метабалічных парушэнняў) не так даўно — у мінулым годзе. Прычым для кожнага пацыента, пасля дэталёвага яго абследавання, і ў першую чаргу — абследавання эндакрынолагам, складаецца індывідуальная праграма рэабілітацыі: басейн, лячэбная фізкультура і г.д. (каму што лепш за ўсё падыходзіць). Ну, і вядома ж, дыета.

Ну, а як вызначаюць у цэнтры тыя ж лішкі тлушчу? З дапамогай рэнтгенаўскага дэнсітаметра. Дарэчы, як удакладняе загадчыца кабінета Наталля Васільева, гэта, па сутнасці, дадатковая функцыя дэнсітаметра. А вось першапачатковая, галоўная — праводзіць дыягностыку «эпідэміі» стагоддзя, або астэапарозу. На базе Цэнтра медыцынскай рэабілітацыі летась адкрылі Цэнтр метабалічных астэапатый і астэапарозу, і, такім чынам, гэты кірунак стаў тут таксама адным з асноўных.

У Рэспубліканскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння могуць выканаць раннюю дыягностыку ішэмічнай хваробы сэрца, раку, дыябетычнай міяпатыі і некаторых іншых захворванняў, выявіць схільнасць чалавека да цукровага дыябету.

Тут вядзецца рэспубліканскі рэгістр хворых на цукровы дыябет. У цэнтры таксама займаюцца мужчынскім і жаночым здароўем. Важнае месца ў дзейнасці цэнтра займае яго лабараторыя, аснашчаная найсучаснейшым дыягнастычным абсталяваннем, асобныя ўзоры якога, як зазначае загадчык лабараторыі Уладзімір Краўчук, можна знайсці толькі тут, у цэнтры, у адзінкавым у краіне экзэмпляры. У лабараторыі разам са звычайнымі выконваюцца рэдкія дыягнастычныя даследаванні, у прыватнасці імунаферментныя; тут могуць дакладна ўстанавіць магчымую «віну» мужчыны, калі ў сямейнай пары няма дзяцей. Увогуле, у лабараторыі выконваюць да 250 відаў тэстаў, а ўсяго робяць разнастайных тэстаў за дзень — каля 2 тысяч. Тут жа варта ўдакладніць: акрамя лабараторнай дыягностыкі, у цэнтры праводзяць таксама функцыянальныя даследаванні, эндаскапічныя, рэнтгеналагічныя, ультрагукавыя.

Цэнтр развіваецца, прапануе новыя эфектыўныя працэдуры.

— 10 «паходаў» у нашу крыякамеру — і прышчэпку ад грыпу можна не рабіць...

Так сказаў падчас гутаркі Сяргей Карыцька, які сам неаднаразова бываў у той крыякамеры і, такім чынам, ведае, што гаворыць...

Цэнтр працуе, маючы на ўвазе дакладную перспектыву, усё больш пашырае кола сваіх лекава-аздараўляльных паслуг, дадае да іх сучасныя, так бы мовіць, больш модныя на сённяшні час. Тыя ж сеансы крыятэрапіі ў цэнтры пачалі праводзіць зусім нядаўна. Як сведчаць яго спецыялісты, пацыентам спадабалася: яны такім чынам здымаюць свае запаленчыя працэсы, павышаюць імунітэт. А яшчэ атрымліваюць надзвычайную ўстрэску арганізма, моцны зарад бадзёрасці, якога хапае на працяглы час.

Аднак у крыякамеру, можа, і не кожны адважыцца зайсці, асабліва тыя, хто любіць цяпло (у ёй — мінус 130, праўда, дазваляюць знаходзіцца ў ёй пацыенту не больш як 3 хвіліны). Такім чынам, вам патрэбна цяпло? А калі ласка, у цэнтры з задавальненнем прапануюць вам сучасныя цеплавыя працэдуры, якія таксама пачалі праводзіць адносна нядаўна. Гэта саўна «кедравая бочка», інфрачырвоная саўна. Аднак, напэўна, самае прыемнае задавальненне (а галоўнае — з відавочным аздараўляльным эфектам) даставіць вам так званая спа-капсула. Знешне спа-капсула нагадвае звычайную ванну, хіба што яшчэ з накрыўкай. Але гэтая «ванна» — з вялікім мноствам розных працэдур. Яна можа служыць і як саўна, і як душ Вішы, і як вібрамасажор, і як гідрамасажор. А яе накрыўка з рознакаляровымі агнямі можа выдаць, адначасова ж, і хрматэрапію. А яшчэ да ўсёй гэтай комплекснай тэрапіі дадаюцца розныя абгортванні вашага цела — антыцэлюлітныя, шакладныя, вінаградныя, жамчужныя... Словам, тут і рэлаксацыя, і аздараўленне разам з прафілактыкай. У чалавека паляпшаецца настрой, самаадчуванне. Як зазначаюць у цэнтры, вельмі гэтыя спа-капсулы жанчыны любяць. Дарэчы, яны ў цэнтры могуць наведаць і кабінет дэрмакасметалогіі — гэта таксама неблагое дапаўненне да існуючых кабінетаў.

І таксама адносна новая працэдура — сеансы ў спелеапячоры, у якой на працягу гадзіны можна падыхаць лекавымі іонамі солі (добра дапамагае пры захворваннях лёгачна-дыхальнай сістэмы).

А зусім нядаўна ў цэнтры сталі прапаноўваць новы метад лячэння — азонатэрапію. Пры гэтым у цэнтры расказалі: азон у мікрадозах з'яўляецца добрым стымулятарам антыаксідантнай абароны арганізма чалавека, ён паляпшае ўласцівасці клетак, разбураючы ў ёй шкодны халестэрын, павышае эластычнасць капіляраў, якасць эрытрацытаў, аказвае дэтаксікацыйнае ўздзеянне на печань, садзейнічае павышэнню імунітэту. Азон таксама валодае антыбактэрыяльным і вірусалагічным уздзеяннямі, паляпшае ў арганізме метабалічныя працэсы (а значыць, яго можна выкарыстоўваць супраць атлусцення, і ў цэнтры з дапамогай азону ўжо праводзяць лячэнне пацыентаў з метабалічным сіндромам), ён паблажлівае змагаецца з хранічнымі гепатытамі, цэлюлітам, дэгенерацыйнымі захворваннямі нервовай сістэмы і нават СНІДам; азон добра ўздзейнічае на рэпрадукцыйныя органы чалавека. Яго прымяненне амаль не мае супрацьпаказанняў, увогуле — ён надае эфект амалоджвання.

Нельга ў гэтым матэрыяле не сказаць колькі слоў і пра традыцыйную кітайскую медыцыну цэнтра. Менавіта так: у ім працуе і такое аддзяленне. Прычым спецыялісты цэнтра прайшлі навучанне адпаведным метадам гэтай медыцыны. Карацей кажучы, калі вам патрэбны ўсходні масаж, іголкаўколванне, акупунктуры іншага роду — калі ласка, вас чакаюць у цэнтры. Тут вам могуць прапанаваць паўздзейнічаць на вашы біялагічна актыўныя кропкі і з дапамогай п'явак — гэта ўжо так званая гірудатэрапія.

* * *

— Спектр нашых дыягнастычных, прафілактычна-аздараўляльных і лячэбных метадаў і працэдур — вельмі шырокі, — адзначае галоўны ўрач цэнтра Сяргей Карыцька. — Што нам дапамагае адносна няблага працаваць у наш цяперашні даволі няпросты час, і нават развівацца? Так, у крызісны год мы стварылі ў сябе дадаткова 40 новых працоўных месцаў, далі прырост па пазабюджэтнай дзейнасці амаль у паўтара раза (варта ўдакладніць: частка кірункаў цэнтра фінансуецца з бюджэту, аднак асноўную частку сродкаў ён зарабляе сам)... Гэта зроблена менавіта за кошт адкрыцця новых кірункаў, новых кабінетаў. Неблагую работу цэнтра вызначае таксама добрае спалучэнне нашай матэрыяльнай базы і высокага прафесійнага ўзроўню нашых кадраў. У нас 82 працэнты спецыялістаў маюць кваліфікацыйныя катэгорыі (у сярэднім па краіне гэты паказчык на ўзроўні 60 працэнтаў). У нас працуюць кандыдаты медыцынскіх навук, многія ўрачы маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Імкнёмся працаваць так, каб не было нейкіх заўваг па культуры абслугоўвання.

— Сяргей Сяргеевіч, чаго б вы пажадалі на заканчэнне нашым чытачам?

— Ну, вядома ж, таго, каб яны былі здаровымі. Ды ўсяляк падтрымліваліся сваё здароўе, для чаго, зразумела, у першую чаргу трэба весці здаровы лад жыцця, за што я заўсёды агітую. А яшчэ: каб рэгулярна наведвалі наш цэнтр, бо здароўе трэба пастаянна падтрымліваць і ўмацоўваць. Мы з задавальненнем прапануем ім добрыя прафілактычныя праграмы.

Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 100557327.

Тут праводзяць сеансы спелеатэрапіі.

З улікам вялікай увагі, якая надаецца ў нашай краіне захаванню і ўмацаванню здароўя людзей, дзяржаўная ўстанова «Рэспубліканскі цэнтр медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння» прапануе ўсім ахвотным (юрыдычным і фізічным асобам) заключыць з ім:

■ разавыя дагаворы на правядзенне абавязковых прафілактычных аглядаў;

■ доўгатэрміновыя дагаворы па дыягностыцы і лячэнні, па медыцынскіх паказаннях;

■ дагаворы на санаторна-курортнае лячэнне па пуцёўках або на асобныя працэдуры.

Кліентамі ДУ «Рэспубліканскі цэнтр медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння» на працягу многіх гадоў з'яўляюцца «Белтрансгаз», «Белгазпрамбанк», «Мілавіца», «Прамтэхмантаж», «Беларусбанк», УКБ Мінгарвыканкама, «Белэксімгарант», «ПрамТрансІнвест», «Белрасстрах» і іншыя страхавыя арганізацыі.

Тэлефоны:
даведка — 131, 267 65 10, папярэдні запіс — 266 27 70, 266 27 71.

www.makaenka17med.by
E-mail: dispanser@mail.belpak.by

КІНАШТОРМ СА ШВЕЦЫІ

Запрашальнік

Фільмы з беларускімі субцітрамі пакажуць у кінатэатры «Цэнтральны»

Праблемы, як правесці вечар, не існуе на гэтым тыдні для тых, хто любіць кіно: з 9 па 12 чэрвеня ў сталіцы Беларусі пройдуць своеасаблівыя Дні шведскага кіно. Кінааматараў Беларусі чакаюць чатыры поўнаметражныя мастацкія фільмы, знятыя сучаснымі шведскімі рэжысёрамі ў апошнія пяць гадоў.

І мы зразумеем, што ў людзей розных краін няма праблемы разумення, калі ёсць павага прадстаўнікоў адной культуры да носьбітаў іншай, а шведскае кіно, якое падаецца з беларускімі субцітрамі, дае магчымасць нам самім прасякнуцца павагай да сваёй мовы. Няма праблемы разумення яшчэ і таму, што ўсе фільмы, якія сёлета нам дэманструюцца, разважаюць пра складаныя чалавечыя пачуцці, пра праблему выбару паміж дабром і злом, якая можа паўстаць перад любым чалавекам з любой краіны. Мяркуйце самі.

Драма «Штучнае дыханне» рэжысёра Б'ёрна Рунге распавядае гісторыю маладой дзяўчыны Веры, якая пакідае сваіх бацькоў і сыходзіць да гандляра наркотыкамі Моргана. Бацькі спрабуюць вярнуць дачку...

Галоўны герой трылера «Дазволь мне ўвайсці», знятага рэжысёрам Томасам Альфрэдсанам, дванаццацігадовы запалоханы хлопчык Оскар. Ён закаханы ў дзіўную дзяўчынку Элі, якая пазбягае сонца, нармальнай ежы. Аднак як толькі Оскар разумее, што для таго, каб жыць, Элі патрэбна чалавечая кроў, ён апынаецца перад праблемай выбару...

Фантастычная драма «Шторм» рэжысёраў Б'ёрна Стайна і Монса Марлінда распавядае пра Дзі-Дзі, самаўпэўненага маладога чалавека трыццаці гадоў. Аднойчы ён сустракае дзіўную дзяўчыну, якую пераследуюць шалёныя незнаёмцы. Супраць сваёй волі Дзі-Дзі аказваецца ўцягнутым у барацьбу дабра і зла.

Гераіня драмы «Сонечны шторм» (рэж. Лейф Ліндблюм) Рэбека вяртаецца ў свой родны горад, каб выратаваць сястру, арыштаваную за забойства пастара, і высветліць, хто сапраўды вінаваты ў жорсткім злачынстве.

Праблема выбару і ў нас: які фільм паглядзець, скарыстаўшыся гэтым «кінаштармавым папярэджаннем»?

Ларыса ЦІМОШЫК.

У МЕЖАХ НАСЕЛЕНАГА ПУНКТА МЫ МОЖАМ ТОЛЬКІ ПАСПРАБАВАЦЬ АДПУДЗІЦЬ ДЗІКОЎ...

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Некалькі тыдняў таму мы пісалі жыхару вёскі Бобрык Пінскага раёна як знайсці паратунак ад патраў сотак дзікамі. Чытач тады скардзіўся, што яны гойсаюць па людскіх агародах літаральна вывадкамі. У заяўніка ўвосень «перааралі» 30 сотак азімага трыцікале, а нядаўна і да бульбы з цукровымі буракамі дабраліся. І вось цяпер з падобнай праблемай звярнулася ў рэдакцыю і жыхарка вёскі Ізбішча Лагойскага раёна.

— Наш участак на 30 сотак знаходзіцца ў канцы вуліцы. Засеяны ён працэнтаў на 60, пераважна бульбай. Дзікі павадзіліся наведвацца на яго яшчэ летась, але тады асаблівай шкоды не нарабілі. А сёлета ўсё інакш. Вось якраз у мінулую пятніцу выйшла ў агарод пасля дажджу, а на ім пасевы працэнтаў на 60 знішчаныя дзікамі, — распавядала нам пра сваю праблему жанчына. — Сама я іх не бачыла, але людзі казалі, што на вочы трапляў статак з 12 дарослых жывёлін. І што нам надалей рабіць? Я пакуль звязвалася са старшынёй сельскага Савета, ён мяне ўважліва выслухаў, абяцаў потым скласці акт адносна патраў...

Старшыня Задор'еўскага сельскага Савета Валянцін ЛЯШКЕВІЧ пацвердзіў нам, што знаходзіцца ў курсе бяды заяўніцы. Так, калі спатрэбіцца, можна будзе скласці акт наконт патравы пасеваў дзікімі жывёламі. Магчыма, пазней жанчына будзе праз суд дабівацца за гэта матэрыяльнай кампенсацыі? Адзінае, удакладніў Валянцін Мікалаевіч, паперу трэба складаць пазней, калі з'явяцца больш дружныя ўсходы і будуць лепш прыкметнымі сляды «рабавання» агарода дзікамі.

Мы ж тым часам працягвалі наша своеасаблівае міні-расследаванне. У прыватнасці, высветлілі, што арандатарам паляўнічых угоддзяў паблізу вёскі Ізбішча з'яўляецца ўстанова «Спартыўны клуб Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі». Звязаліся з яе філіялам — «Спартыўна-паляўнічай гаспадаркай «Лаўнікі» ўстановы «Спартклуб ФПБ», пагутарылі з **паляўніцтвазнаўцам Валерыем МАКЛАКОМ**. Той, выслухаўшы сутнасць праблемы, паабяцаў звязацца на месцы з егерамі для больш падрабязнага высвятлення сітуацыі. Наступным днём Валерый Уладзіміравіч паведаміў нам наступнае.

— Участак вясковай жанчыны знаходзіцца ў межах населенага пункта, ён ніяк не абгароджаны. Па гэтай прычыне мы не можам выкарыстоўваць для адстрэлу паляўнічую зброю — гэта будзе грубым парушэннем Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання. Імі, у прыватнасці, забараняецца праводзіць стральбу і знаходзіцца з зараджанай паляўнічай зброяй у населеных пунктах і на адлегласці меней за 200 метраў ад іх крайняга збудавання, — распавёў Валерый Маклак. — Па словах егераў, паблізу вёскі яны заўважылі сляды свінаматкі з парасятамі-сяголеткамі, але былі заўважаныя сляды і дарослых дзікоў. Хоць гэта і дзікія жывёліны, але бяспечныя для чалавека: рэагуюць на з'яўленне чалавека, яго пах. Таму егеры будуць адпужваць дзікоў: прахаджвацца побач з участкам увечары недзе з 18 да 20 і з 20 да 24 гадзін і раніцай прыкладна з 5 да 8 гадзін. Зразумела, асаблівай гарантыі ў гэтага спосабу няма, але ёсць надзея, што пасля некалькіх такіх з'яўленняў егераў побач з соткамі дзікі адтуль знікнуць.

Наконт памераў шкоды ад патравы суразмоўца заўважыў, што яны не такія і вялікія. Заяўніца праінфармаваная наконт мераў па адпужванні дзікоў ад участка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Паданні старога Заслаўя



Прыйдзіце сюды раніцай, калі сонца толькі пакажацца з-за старога вала, і вам падасца, што ў чэрвеньскіх росах б'юць капыты коней — гэта вершнікі вяртаюцца ў драўляную крэпасць з начнога дазору. Прыйдзіце у цэнтр горада ўдзень, і вы ўявіце сабе, як віраваў тут шматгалосы натоўп гандляроў, пакупнікоў, рамеснікаў, вандроўнікаў. Перад ноччу падыдзіце да велічнай царквы, і агеньчыкі свечак за яе вокнамі нагадаюць, што такія ж дрыготкія агеньчыкі атачалі тут набажэнства шмат-шмат стагоддзяў таму...

Тысяча гадоў у нястомнай чарадзе праляцелі над вуліцамі старажытнага Заслаўя, а следам ляцяць новыя. Час не спыняецца, але пазначае свой рух у апісаннях падзей і асобаў.

Больш за тысячу гадоў таму на гэтай зямлі жыла сасланая сюды вялікая княгіня Рагнеда — дачка полацкага князя Рагвалода. Прыняўшы хрысціянства і заснаваўшы тут манастыр, яна мірна спачыла, а ў смутку па ёй знікла возера, якое звалі Рогнедзь.

Мо гэтае возера — паданне, прыгожая прыдумка, але пачаты пры Рагнедзе горад красуецца і сёння. Пачутае ў далёкія стагоддзі перадаецца з роду ў род, і старыя муры адлічваюць наш агульны час.

З раніцы да вечара рушыць па вуліцах і наваколлю сучаснага Заслаўя нястрымная плынь турыстаў: гэты горад — адзін з самых прывабных для аматараў даўніны. Экскурсаводы гісторыка-культурнага запаведніка знаёмяць гасцей са сведкамі далёкай і блізкай гісторыі, а яго супрацоўніца **Канстанцыя ШАХОВІЧ** (на здымку) па-майстэрску ажыўляе на балкончыку сапраўднай батлейкі персанажаў старых паданняў.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

КАХАННЕ І ЯГО ЎПЛЫВЫ НА ПАЛІТЫКУ ВКЛ

Эксклібрыс «Звязды»

Каралева не здраджвала каралю, або Каралеўскае шлюбаванне ў Новагародку: Займальны аповед пра каханне 17-гадовай беларускай князёўны Соф'і Гальшанскай і 70-гадовага караля польскага Ягайлы: раман/ Анатоль Бутэвіч. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2010. — 320 с.

У кніжнай серыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і Мастацтва» «Святло мінуўшчыны» — працяг. Следам за раманам Алега Ждана «Князь Мсціслаўскі» пабачыў свет раман Анатоля Бутэвіча «Каралева не здраджвала каралю, або Каралеўскае шлюбаванне ў Новагародку». У падзагалоўку — удакладненне: « Займальны аповед пра каханне 17-гадовай беларускай князёўны Соф'і Гальшанскай і 70-гадовага караля польскага Ягайлы». Да месца, відаць, будзе заўважыць і наступную акалічнасць. Абодва творы, перш чым убачыць свет асобнымі кнігамі, былі надрукаваны ў перыёдыцы, якая і выходзіць у РВУ «Літаратура і Мастацтва». «Князь Мсціслаўскі» — у часопісе «Нёман», раман Анатоля Бутэвіча — у «Маладосці». Гэтая акалічнасць сведчыць пра тое, што мастацкія творы прайшлі выпрабаванне адзнакамі чытача і літаратурна-мастацкай крытыкі, маюць попыт і варты таго, каб застацца на паліцах бібліятэкі ў болей «трывалым», кніжным, выглядзе. А таксама маюць «права» звярнуць на сябе ўвагу і таго чытача, хто не знаёмы з раманамі па публікацыях у перыёдыцы.

Але ж пра «Каралеву, якая не здраджвала каралю...» Падзеі, якія актуалізуе сваёй мастацкай увагай празаік Анатоль Бутэвіч, адносяцца да першай паловы XV стагоддзя. Ягайла (а на польскі манер пасля хрышчэння па каталіцкім абрадзе — кароль польскі Уладзіслаў II), які да сустрэчы з юнай Соф'яй Гальшанскай тройчы быў у шлюбе і не меў сыноў, у сталым ужо ўзросце патрапіў у паласу надзвычайных выпрабаванняў. Усё сышлося разам — і выпрабаванні дзяржаўна-палітычнага характару, і каханне. Толькі Соф'я — чацвёртая з жонак — падаравала Ягайлу сыноў, спадчыннікаў, але за тое і яна, і муж кароль мелі нямала брыдкіх паклёпаў. Як паводзілі сябе многія гістарычныя персанажы ў тых акалічнасцях, як паяднана каханне з палітыкай і расказвае дасведчаны гістарычны пісьменнік у сваім сапраўды займальным рамане. Дарэчы, у кнігі будзе працяг — ужо цяпер аўтар і выдавецтва рыхтуюць да выдання другую частку рамана. «...каб не надта дакучаць і замінаць каханню, — піша ў прадмове да «Каралевы...» Анатоль Бутэвіч, — працяг гістарычнага аповеду ўключаны ў другую частку рамана — «Паміж Княствам і Каронай», дзе падаецца надзвычай багатая і шмат у чым новая, пашыраная хроніка падзей ад запачаткавання Вялікага Княства Літоўскага да Люблінскай уніі, гэта своеасаблівы часапіс Ягайлавай дынастыі. Прасачыць варункі кахання праз строгія даты і факты, вядома, складана. Аднак усе гістарычныя звесткі пазначаны «чалавечай падсветкай», каб можна было адчуць гістарычны водар, які ахінаў тагачасныя падзеі, з'явы, асобы. Таму амаль кожная дата расшыфравана, часам дапаўняецца паданнямі і легендамі, выказваннямі і сведчаннямі сучаснікаў Ягайлы і гісторыкаў». Тады чакаем і другую частку, спадзеючыся, што вандроўка ў далёкую мінуўшчыну прынясе сапраўдную асалоду адкрыцця важкіх для гісторыі Беларусі падзей.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Zamor'e!

Тварам «Чэмпіянату свету па футболе-2010» стала 17-гадовая школьніца

Дзяўчыну завуць Джэніфер Шэрман. Нямецкая школьніца з горада Мюнстэр перамагла ў конкурсе «Міс чэмпіянат свету па футболе-2010», абышоўшы ў фінале прыгажунь з 31-й краіны. Конкурс прайшоў у парку забаў г. Руста (Бадэн-Вюртэнберг). Увогуле, як паведамляе нямецкі сайт ksta.de, у кастынгу ўзялі ўдзел больш за тысячу дзяўчат ва ўзросце ад 17 да 36 гадоў.

Разам з каронай пераможцы юная Шэрман атрымала чэк на пяць тысяч еўра і турпуцёўку ў Егіпет. Другое месца заваявала 28-гадовая прадстаўніца Грэцыі Кацярына Джаноглу. Трэцяе месца ў 20-гадовай галандкі Авалон-Шанель Вайцыг.

На конкурсе Джэніфер Шэрман абараняла гонар Аргенціны, адкуль родам яе бацька:

— Я адчуваю сябе і немкай, і аргенцінкай адначасова, але падчас першынства буду хварэць за Аргенціну, — прызналася пераможца. — Я страшэнна рада і ганаруся тым, што стала тварам чэмпіянату.

Конкурс «Міс чэмпіянат свету па футболе» праводзіцца раз на чатыры гады. Упершыню ён прайшоў у Германіі ў 2006 годзе.

Ілья ЛАПАТО.

Футбол. Чэмпіянат свету

Англічане страцілі капітана, аўстралійцы — варатара

А ў Драгба і Рабэна шанц згуляць ёсць

Да адкрыцця чэмпіянату свету па футболе ў Паўднёва-Афрыканскай рэспубліцы застаюцца лічаныя дні (першынство планеты стартуе 11 чэрвеня), а са зборных прыходзяць не зусім прыемныя звесткі. Так, паведамляецца, што капітан зборнай Англіі Рыа Фердынанд прапусціць чэмпіянат свету з-за траўмы. Абаронца «МЮ» атрымаў траўму калена на трэніроўцы нацыянальнай каманды 4 чэрвеня. Медыцынскае абследаванне паказала, што футбаліст не зможа ўзяць удзел у планетарным першынстве. Замяніць Фердынанда ў зборнай павінен абаронца лонданскага «Тотэнхэма» Майкл Доўсан.

Акрамя Фердынанда, у зборнай Англіі траўмаваны варатар Дэвід Джэймс. Але мяркуецца, што да 12 чэрвеня, калі англічане правядуць першы матч супраць зборнай ЗША, ён зможа аднавіцца.



Пад пытаннем удзел у чэмпіянаце свету варатара зборнай Бразіліі Жуліа Сезара, які прапусціў чарговую трэніроўку каманды з-за траўмы спіны. Пакінуў каманду і варатар зборнай Аўстраліі Брэд Джонс. Прычына — цяжкая хвароба сына. Урачы знайшлі ў чатырохгадовага Лукі Джонса лейкемію, і яго бацька вылецеў з ПАР у Аўстралію. Ці вернецца галкіпер у зборную, пакуль не вядома. Праўда, асноўным варатаром зборнай Аўстраліі з'яўляецца Марк Шварцар, а Джонс і Адам Федэрычы — дублёры.

А вось у Дзідзье Драгба *(на фота)* застаецца шанц сыграць на чэмпіянаце свету. Нагадаем, што капітан зборнай Кот-д'Івуара 4 чэрвеня атрымаў пералом локцевай кісці ў таварыскім матчы з Японіяй. 5 чэрвеня яму была зроблена аперацыя, і ўрачы ўпэўненыя, што нападаючы зможа аднавіцца ў кароткі тэрмін. Захоўваецца ўпэўненасць, што нападаючы паправіцца да першага матча сваёй зборнай. 15 чэрвеня івуарыйцы ў першым туры групавога турніру згуляюць з Партугаліяй, 20 чэрвеня іх чакае матч з Бразіліяй, 25 — з КНДР.

Нагадаем, што 32-гадовы нападаючы «Чэлсі» Драгба з'яўляецца галоўнай зоркай зборнай Кот-д'Івуара. У сезоне 2009/10 ён стаў лепшым бамбардзірам чэмпіянату Англіі, забіўшы 29 галоў.

Пасля медыцынскага абследавання нападаючага зборнай Нідэрландаў Ар'ена Рабэна стала вядома, што траўма падкаленнага сухажылля, якую ён атрымаў у таварыскім матчы з Венгрыяй, менш сур'ёзная, чым меркавалася раней, і, хутчэй за ўсё, не перашкодзіць яму прыняць удзел у чэмпіянаце свету. «Я не буду шукаць замену Рабэну, бо хачу даць шанц яму згуляць на першынстве планеты», — выказаўся на гэты конт галоўны трэнер галандцаў Берта ван Марвейк.

Заўзятары ўчынілі таўкатню

Тысячы футбольных балельшчыкаў учынілі таўкатню на ўваходзе на стадыён у Цембісе, прыгарадзе Іаханэсбурга. Некалькі чалавек пацярпела, больш за ўсё дасталася паліцэйскаму, які меў намер навесці парадак.

Фанаты збіраліся паглядзець таварыскі матч паміж зборнымі Нігерыі і Паўночнай Карэі. Цісканіна пачалася перад пачаткам сустрэчы, калі ўваход на стадыён быў адкрыты. Не здолеўшы навесці парадак, паліцыя зачыніла вароты, але праз нейкі час зноў пачала пускаць балельшчыкаў, справакаваўшы таўкатню ў другі раз. Некаторыя балельшчыкі падалі ў натоўпе.

Летась ў сакавіку адбыўся самы буйны інцыдэнт такога кшталту за апошні час. У цісканіне на стадыёне Абіджан, былой сталіцы Кот-д'Івуара, загінула 22 чалавекі. Таўкатня пачалася, калі рухнула сцяна стадыёна, дзе праходзіў адборачны матч чэмпіянату свету. Арэна была перапоўненая: пры ўмяшчальнасці 35 тысяч чалавек на стадыён прыйшло ў паўтара раза больш балельшчыкаў.

Галандзец патануў на шляху ў ПАР

Прыхільнік зборнай Галандыі загінуў на шляху на чэмпіянат свету. 60-гадовы Хэнк Вітс яшчэ 3 сакавіка накіраваўся ў ПАР з Амстэрдама ў складзе вялікай групы суайчыннікаў, якія вырашылі на аўтамабілях праз усю Афрыку дабрацца да месца прызначэння. Падчас стаянкі на беразе возера Малаві ён, праігнараваўшы паведамленні пра моцную плынь каля берага, вырашыў выкупацца і патануў. Члены калоны, якая складаецца з 22 аўтамабіляў, прысутнічалі на жалобнай цырымоніі, наладжанай мясцовымі жыхарамі на беразе возера. У гонар загінулага падчас чэмпіянату свету ўсе балельшчыкі зборнай Галандыі будуць насіць на рукавах чорныя павязкі.

Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

Кватэрнае пытанне

Падставы, якія былі, зніклі і зноў з'явіліся

З 2001 года наша сям'я (муж, жонка, сын) знаходзілася на кватэрным уліку па месцы працы. У канцы 2008-га сын ажаніўся і купіў сабе аднапакаёўку. У пачатку 2009-га мы забралі да сябе хворую свякроў. А нядаўна даведаліся, што на гэты ж 2009-ты нам перанеслі чаргу. Ці правамернае такое рашэнне?

В. Я., *Гомель*.

У адпаведнасці з п. 26 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565) чарговасць грамадзян, у якіх адпалі падставы для прызнання іх асобамі з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў у перыяд знаходжання на ўліку, але якія па нейкіх прычынах не былі знятыя з уліку, пераносіцца з даты першапачатковай пастаноўкі на ўлік на дату паўторнага ўзнікнення падстаў для пастаноўкі...

Рашэнне аб змяненні чарговасці грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прымаецца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, адміністрацыяй іншага дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі сумесна з прафсаюзным камітэтам, які прыняў гэтых грамадзян на ўлік. У рашэнні называюцца падставы для змянення чарговасці і тэрмін, на які яна пераносіцца. Аб прынятым рашэнні паведамляецца грамадзяніну ў пісьмовай форме ў дзесяцідзённы тэрмін з дня яго прыняцця з пазначэннем падстаў для змянення чарговасці.

У пісьме не названыя матывы пераносу чарговасці. Верагодна, прымаючы такое рашэнне, адміністрацыя і прафкам расцанілі як пагаршэнне жыллёвых умоў змяненне парадку карыстання жылым памяшканнем, у якім забяспечанасць агульнай плошчай перавышала 15 кв. метраў на аднаго чалавека (пасля выпіскі сына). У гэтым выпадку па заканадаўстве грамадзяне не прымаюцца на ўлік асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

У далейшым, пасля ўсялення ў кватэру ў 2009 годзе на законных падставах непрацаздольнай маці мужа, забяспечанасць агульнай плошчай стала менш за 15 кв. метраў на аднаго чалавека, што і з'явілася падставай для пераносу чарговасці.

Абскардзіць рашэнне можна ў судовым парадку.

Віктар САВІЦКІ.

КОНЬ У КАЛОДЗЕЖЫ

У Добрушы конь трапіў у калодзеж, які будаваўся побач з домам. Гаспадар патэлефанаваў выратавальнікам, якія прыехалі са спецтэхнікай. Менш за гадзіну жывёліна сядзела ў бетоннай пастцы глыбінёй 2,5 метра. Спецыялісты МНС падвялі пад каня спецыяльны ручнік для выцягвання жывёлы, бо звычайныя вяроўкі могуць пераціснуць цела. Потым, з дапамогай аўтакрана КУП «Добрушскі камунальнік», непашкоджанага гнядога паднялі з калодзежа.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

АМАЛЬ 4 КІЛО НЕБЯСПЕКІ

У Мінску затрыманы дзялок з буйной партыяй псіхатропу GWH-018

27-гадовы жыхар Гродна, паводле звестак прэс-афіцэра Маскоўскага РУУС Таццяны Грыб, прывозіў небяспечнае псіхатропнае рэчыва з Расіі на ўласным аўтамабілі і рэалізоўваў у Мінску. Затрымалі яго каля гандлёвага дома «Карона», калі «бізнэсмен» спрабаваў збыць чарговую партыю «дурману» ў колькасці 3 кілаграмы 860 грамаў.

Як выявілася, небяспечнае псіхатропнае рэчыва, якое ўваходзіць у склад курыльных сумесяў тыпу «спайс», затрыманы рэалізоўваў праз пастаянных аптовых пакупнікоў, якія за 1 кіло гэтай дрэні плацілі ў сярэднім каля 3 тысяч долараў ЗША. Між іншым, некаторыя з аптавікоў, што «працавалі» з наркадзялком, ужо затрыманыя і прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці. Заганным «бізнэсам» раней не судзімы жыхар Гродна займаўся на працягу трох месяцаў, а за выручаныя грошы набываў каштоўныя рэчы — аўтамабіль 2007 года выпуску, прафесійны фотаапарат, ноўтбук, мабільныя тэлефоны і інш.

Ігар ГРЫШЫН.

Валянцінкай

НІКОЛІ ПРАЎДА НЕ ЎМІРАЕ

...Пра сваю ранейшую працу, ранейшае прадпрыемства Ліна гаварыла больш. Напэўна, таму, што яно было першым пасля заканчэння інстытута, да таго ж — горача любімым. За ўсё. Там, прынамсі, быў вялікі цудоўны калектыў, культпаходы і «культпаездкі», святочныя вечары, спартакіяды, годныя заробкі. Там, што вельмі важна, у яе была самапавага, бо прадукцыя, якую яны выпускалі, у крамах не ляжала — за ёй ганяліся, яе куплялі па блаце...

Пакуль «не адкрыліся шлюзы», і на нашы рынкі не хлынула ўсё. Часта — не без таго — куды горшае па якасці, але таннейшае...

Іх прадукцыя стала страчваць попыт, але яны ўсё роўна яе выпускалі — ужо на склад і, вядома ж, без ранейшага настрою, без ранейшых заробкаў, без (адно чаплялася за другое) лепшых спецыялістаў, а потым — і надзей, што вось тут нешта можа змяніцца. Прынамсі, да лепшага. Таму Ліна таксама сышла...

Куды? Пра новую працу яна гаварыць не хоча. Альбо не можа. У выніку — усяго і вядома, што фірма тая — прыватная, што працаваць там цяжка, а ўладкавацца і потым утрымацца яшчэ цяжэй. Бо патрабуюць, мякка кажучы, жорстка: нават у адзенні (кшталту — ніякіх джынсаў, шортаў, мінідэкальтэ...). Што ўжо казаць пра хібы ў рабоце альбо, крый Божа, спазненні.

Зрэшты, у гэтага, апошняга, правіла было выключэнне — адно. Пра яго Ліна расказвала двойчы — з вялікім гонарам спачатку. І з... жахам цяпер.

Справа, калі без лішніх падрабязнасцяў, выглядала так. У адной з супрацоўніц на «хуткай» забралі бацьку. Дачку (а яна ў яго адна) папярэдзілі, каб гатовай была да самага горшага, бо пасля падобных інсультаў не ўстаюць нават маладзейшыя, а тут — дзед... Да таго ж — інвалід вайны.

Дачка, вядома, перажывала. І рыхтавалася: што тут будзеш рабіць... Прынамсі, пайшла да кіраўніцтва з заявай на водпуск, сказала, чаму бярэ яго так паспешліва.

Дырэктар яе ўважліва выслухаў, падпісаў дакумент, паабяцаў, што ў бухгалтэрыі, апроч адпускных, яна зможа атрымаць матэрыяльную дапамогу — цяпер... І потым, маўляў, каб звярталася, калі спатрэбіцца нешта яшчэ. Ну там лекі, машына, грошы.

Аднак дапамагчы ёй (гора ж!) хацела не толькі кіраўніцтва той фірмы, але і калектыў. Прычым — менавіта цяпер, а не потым, калі хворага, крый Бог, не стане (гэта ў іх само сабою было)...

Па руках пусцілі вялікі канверт. І вельмі рады былі, што яны, тыя сабраныя з людзей грошы, як быццам, «спрацавалі», што «дзед» — гэта ж малайчына які — выжыў!.

Дачка, хоць і досыць не хутка, прывезла яго дамоў, наняла сядзелку, выйшла на працу.

І тут для Ліны (яна тады на фірме новенькай была) з'явілася яшчэ адна падстава для гонару: на ранішняй нарадзе дырэктар апроч іншага сказаў, што мала, маўляў, вешаць лозунгі, мала цешыць ветэранаў словамі «...ніхто не забыты», — трэба па магчымасці дапамагаць. І яны могуць: вось гэтаму канкрэтнаму інваліду.

У выніку яго дачка атрымала нечуваную дасюль прывілею — за ранейшыя грошы працаваць, так бы мовіць, па абставінах: гэта значыць, прыходзіць пазней, сыходзіць раней. І нават, калі трэба, не прыходзіць зусім.

Спачатку яна карысталася ёй, што называецца, гады ў рады, вельмі асцярожна, потым — часцей і часцей. Але ёй ніхто ніколі нічога не казаў. Расказвала яна пры выпадку, што ў старога і хворага катастрафічна псуецца характар, што яму не дагадзіць, што з ім куды горш, чым з дзіцем, бо на таго можна хоць накрычаць, альбо паспадзявацца, што падрасце — паразумнее... А тут — усё наадварот.

Ёй спачувалі, яе паважалі, бо геройка ж — даглядае... Сама.

І ёй дапамагалі — хто чым мог. Яшчэ і таму (ну што тут хаваць...), што сёння — гора ў яе, а заўтра...

Заўтра, дзякаваць Богу, наступіла не хутка: года праз паўтара з пераломам шыйкі сцягна загрымела ў бальніцу маці другой супрацоўніцы.

Дачка таксама аформіла водпуск, праз дзень, якраз пад абед, прыехала атрымаць адпускныя, а заадно распытаць у геройкі, як ляжачаму чалавеку памыць галаву, як пачысціць зубы, як паіць і чым лепей карміць, дзе (канкрэтна) прадаюцца памперсы для дарослых і якія лепей купляць?..

На апошнія пытанні жанчына, якая (уся фірма ведала!) даглядае ляжачага бацьку, інваліда вайны — яшчэ неяк адказвала (кшталту, трэба ехаць на рынак, лепш у Ждановічы...). На ўсе астатнія — ужо... не. Бо — як раптам высветлілася — бацька яе... сам ходзіць у прыбіральню і на кухню, сам п'е, сам есць...

Пасля таго, як гэта адкрылася (і, напэўна ж, стала вядома «наверсе»), калектыў знямеў, — стаў чакаць рэакцыі. Многія лічылі, што ёй, без сумневу, будзе загад аб звальненні — без тлумачэння прычын.

Але ні праз дзень, ні праз тыдзень гэткага загаду не было.

Не было, што найбольш уразіла Ліну, і заявы аб звальненні: гэта значыць, што «геройка» паранейшаму працавала і працуе.

Праўда, цяпер ужо — ад званка да званка; як мыла з'еўшы. Бо Купала праўду пісаў:

Жыццё закон жалезны мае —
Ніколі праўда не ўмірае.

Хоць некаму, можа, і хацелася б?

Валянціна ДОЎНАР.

Інфарм-укол

Тое, чаго ў нас няма

Як кажуць некаторыя псіхааналітыкі, сапраўдная любоў — гэта даваць таму, хто гэтага не прасіў, тое, чаго ў нас няма. Такая любоў знаходзіцца за межамі матэрыяльнага. У сэксуальным плане паміж мужчынам і жанчынай не існуе адносінаў камплементарнасці: яны не дапаўняюць адно аднаго. Разнаполыя людзі размаўляюць на адной мове, аднолькава перажываюць задавальненне і могуць пасапраўднаму сустрэцца толькі дзякуючы любові.

Нашы арыенціры — сімвалы

Мы жывём і разважаем у трох вымярэннях — рэальным, уяўным і сімвалічным. Уяўны — гэта адносіны, якія мы падтрымліваем з тымі, хто з'яўляецца нашым «вобразам», у кім мы можам апазнаць сябе душой ці розумам. У другім значэнні ўяўнае — гэта месца, дзе жыве наша «я», з яго схільнасцю харчавацца ілюзіямі і зачараванасцю падманамі. Рэальнае немагчыма ні падумаць, ні назваць. У супрацьлегласць яму сімвалічнае — культура, мова — ёсць тое, што робіць нас чалавекам, паколькі чалавек мае патрэбу ў сімвалах як у арыенцірах.

Самавыяўленне не ёсць творчасць

Калі дарослым здаецца, што іх дзіця нічога не цікавіць, значыць, яны не знайшлі тое, што абудзіла б яго крэатыўнасць. Магчыма, у дзіцяці няма пачуцця ўнутранай бяспекі або дастатковай свабоды духу, каб тварыць. Іншая рэч, не трэба блытаць творчасць і выяўленне сябе. Дзіця крычыць або робіць нейкі рух — так яно выяўляе сябе. Калі ж мы скажам: «Пакажы, як будзе гучаць твая радасць, тваё жаданне, твой гнеў...», — тады дзіця пачне шукаць у сабе тое, з чаго паходзіць творчасць, будзе надаваць гэтаму асаблівы сэнс. Выяўляць сябе — ні добра, ні дрэнна. Але калі дарослыя хочуць дапамагчы дзіцяці, трэба надаць сэнс спантаннаму самавыяўленню.

Святлана БАРЫСЕНКА.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 12 июля 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Целевое назначение	Условия продажи, размер убытков: расходы по изготовлению землеустроительной документации (руб.)	Сведения об инженерных коммуникациях	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Ленинская	0,3054	50 лет	строительство и обслуживание многофункционального комплекса офисно-коммерческих, торговых сооружений с объектами сферы обслуживания	снос объектов недвижимости и возмещение МГКУП «Горсвет» убытков в размере 750 325 696 рублей; 4 505 819	на земельном участке имеется водопровод	740100000004000200	413 180 000	37 186 000
№ 2	улица Белинского (р-н жилого дома № 37/15)	0,0040	1 год	установка и обслуживание торгового павильона			740100000002004568	409 000	37 000
№ 3	улица Криулина (р-н жилого дома № 8)	0,0035	1 год	установка и обслуживание торгового павильона			740100000002004972	220 000	20 000
№ 4	улица Лазаренко, ост. «ул. Лазаренко» (от центра)	0,0018	до 1.06.2011	установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне			740100000003005133	174 000	16 000
№ 5	переулок Овражный (р-н жилого дома № 2)	0,0119	1 год	установка и обслуживание торгового павильона			740100000003005065	1 490 000	134 000
№ 6	улица Строителей (р-н жилого дома № 23а)	0,0048	1 год	установка и обслуживание торгового павильона			740100000005002895	464 000	42 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Иностранные юридические лица: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык.

Представители иностранного юридического лица или гражданина: легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких предметов** аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой.**

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельные участки расположены на застроенной территории, в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации.

2) Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Условие предоставления земельных участков в аренду: согласование типа киосков, павильонов с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

5) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная (общая) сумма расходов составляет 7 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 6.07.2010 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 17 июня 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Целевое назначение	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Первомайская (р-н жилого дома № 72)	0,0828	50 лет	строительство и обслуживание административно-торгового здания с гостиничными номерами и кафе	740100000003005439	562 892	94 927 000	8 543 000
№ 2	район пересечения Минского шоссе и улицы Пелагеевской (огр-р. Дубровенка)	0,2500	50 лет	строительство и обслуживание гостиницы и кафе	740100000001005247	583 397	122 576 000	11 032 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Иностранные юридические лица: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык.

Представители иностранного юридического лица или гражданина: легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой.**

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации.

2) Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

4) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона,** возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 5 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 11.06.2010 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 30 июня 2010 года проводит 1-й повторный открытый аукцион на 9 открытом аукционе по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
15.	Автошасси Урал-375 ш. 336386 дв. 253248 с кунгом К-375 № 11059	г. Молодечно ул. Замковая, в/ч 04152	1980	1022	7 500 000	750 000
17.	Автошасси Урал-375 ш. 336683 дв. 237396 с кунгом К-375 № 11145	г. Молодечно ул. Замковая, в/ч 04152	1980	980	7 500 000	750 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00 **30 июня 2010 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **28 июня 2010 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **30 июня 2010 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com.**

По ранее проведенным торгам извещение опубликовано в газете «Звязда» № 242 22 декабря 2009 г.

ДОПОЛНИТЕЛЬНО

В извещение, опубликованное в газете «Звязда» № 107 от 4 июня 2010 года о проведении 8-го повторного аукциона на 9-м открытом аукционе вносятся изменения. Лоты № 59А и № 60А «Аэродромные железобетонные плиты ПАГ-14, 4 кат., партия — 30 шт. и партия — 26 шт.» СНИМАЮТСЯ С ТОРГОВ.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Занатоўкі мастака

ПАРАСОН У ФОТАСТУДЫІ

Добра глядзіцца ў фотастудыі... Можна было б паставіць не тры, а дзве кропкі ды пачаць спіс розных рэчаў, а то і вядомых імёнаў, але я абмяжуюся парасонам. У фотастудыі выдатна глядзіцца мокры толькі-толькі з-пад дажджу парасон. Ён надзіва цякуча-жывы і бліскуча-нераўнадушны. Ён не супярэчыць духу студыі. Парасон напаўняе яе свежасцю. Стаю, любуюся і вачэй адарваць не магу ад упэўнена-шэрага парасона.

СВОЙ ЧАС І НОВЫ ЧАС

Цяпер у нас свой час. Ён запаволены, марудны, вялы, крызісны... Падобны час быў, на маёй памяці, у СССР і называўся эпохаю развітога сацыялізму. У Старым часе дыхаецца... І хацеў бы сам сябе прыспешыць, ды не атрымліваецца. Новы час надыходзіць раптоўна. Раніцай адчыняеш акно і адчуваеш вецер. І пайшло, і паехала, і пакацілася, і паімчалася... Новы час праявіўся ў Беларусі нацыянальна-вызвольнай рэвалюцыяй. Нам пашанцавала, што наш Новы час не вызначыўся крыважэрнасцю і людазабойствам. Пашанцавала. Адчыняю акно, насыпаю на падваконне сланечнікавых семак для сваіх сініц і радуюся, калі да сініц далучаецца імклівая сітаўка.

ЧЭХАЎ І ДУМЫ

«Ты вось зараз глынуў, але не падумаў, верагодна, што гэты глыток каштуе грошыкаў, а грошы здабываюцца працаю. Ты еш і думай...» Так герой апавядання Антона Чэхава «Незвычайны» вытлумачвае мараль свайму сыну-гімназісту. Мараль — думанне пра грошы, думанне грашыма, думанне пра капітал. Гімназісты вырастаюць і працягваюць думаць пра капейчыну. Палітык палітыкуе і думае пра грошы, журналіст піша і думае пра іх, артыст і ўсе-ўсе-ўсе жаруць дый думаюць думу-думную пра грошы. Такое вакол нас грашова-задуменнае грамадства. Нейкі час яго нібыта і не было, на нейкі час яно нібыта і спрабавала памяняцца, але эксперыменты са зменамі ў грамадстве не далі станоўчых вынікаў. Ты вось зараз пачытаеш і падумаеш пра (...) доктара Чэхава, спадзяюся. Ты падумаеш пра Антона Чэхава, які застаўся вялікім мастаком слова ў грамадстве, якое думала пра грошы. Грамадства яшчэ думала, што той, хто не думае пра капіталы, не выжыве. Чэхаў выжыў і застаўся чалавекам, бо толькі мастак здатны заставацца чалавекам сярод зграй драпежнікаў-думаннікаў пра грошы.

НАВІНА І ПРАКЛЯТЫЯ МЕСЦЫ ДЛЯ СЛАВЯНАЎ

Я набліжаўся да падземнага пераходу, што на станцыі метро «Няміга», калі затэлефанаваў сын. Ад яго і даведаўся пра авіякатастрофу, у якой загінуў прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі. Урадавая дэлегацыя ляцела з Варшавы ў Смаленск, на жалобныя ўрачыстасці. Мерапрыемства было прымеркавана да сямідзясятых угодкаў Катынскай трагедыі, у Катыні знайшлі гвалтоўную смерць тысячы польскіх вайскоўцаў. У авіякатастрофе загінула сто трыццаць два чалавекі. Я слухаў сынаў голас і глядзеў на падземны пераход, у якім задыхнуліся ў звалцы дзясяткі маладых людзей. Спрадвеку гэтае месца, дзе Няміга ўпадае ў Свіслач, лічылася праклятым, такім жа праклятым месцам для славянаў была і будзе Катынь.

ГЕМАТАГЕН З КУРАГОЮ І ВЕСНІЦЫ

Замест шакаладных батончыкаў і цукерак я, часам, ем гематаген. Люблю ўзяць у аптэчнай крамцы гематаген з курагою. І калі захочацца закурыць... На падыходзе да могілак мне моцна захацелася закурыць. Раней я, звычайна, курыў непадалёк ад татавай магілы. Пастаю, пакуру, і нібыта крыху лягчэй робіцца. Цяпер не пакурыш, бо кінуў, таму вырашыў з'есці гематаген. Есці на могілках я ніколі не любіў і ніколі не разумеў тых, хто сярод крыжоў выпівае і закусвае. Стаў я каля металічных весніц і ем. Тут нейкі малады мужчына ў чорных акулярах, заходзячы на могілкі, павітаўся са мною. Мне зрабілася прыкра і няўтульна, гематаген стаў нясмачны — засалодкі. Пасля наведвання могілак мне разбалелася галава, а ўсе навокал казалі пра цудоўна-сонечны дзень.

РЫЛЬКЕ І ТВОРЫ

У «Фларэнційскім дзённіку за 1998 год» паэт Райнер Марыя Рыльке запісаў: «Бог — самы стары твор мастацтва». На мой сціплы розум варта зрабіць удакладненне: «Бог — адзін з самых старажытных твораў мастацтва».

СІНІЦЫ І ЗАЯЦ

Сонца зыркае, красавіцкае і ўсё яшчэ прахалоднае. Сініцы скачуць па падваконні і выпрошваюць сланечнікавых семак. Пташкі ўжо не галодныя, яны просяць семкі па звычцы. Я, зноў жа па завядзёнцы, сыплю чорныя семкі на бляшанае блакітна-нябеснае падваконне. Сініцы бяруць па семцы і ўладкоўваюцца на галіны вулічнай акуратна паабразанай ліпы. Гляджу на вялікую ліпу і згадваю пасаджаныя жонкаю ў мінулым кастрычніку тоненькія дрэўцы чарэшні. Зімою іх моцна пагрызлі галінкі. Чарэшань шкада, як шкада і жончынай працы. Але сябе я ўяўляю менавіта зайцам, які лютаўскай марознай ноччу прабіраецца па высокіх сумётах у вёску Сёмкава, на вуліцу Бэзавая і вячэрае салодкімі галінкамі.

ХАРМС І КОНЧЫК ЯЗЫКА

«Калі дзяржаву прыпадобніць да чалавечага арганізма, дык на выпадак вайны я хацеў бы жыць у пятсы», — напісаў Данііл Хармс у 1937 годзе, пэўна ж, пісаў ён, адчуваючы, што на свет насоўваецца вялікая вайна. Не ведаю, што насоўваецца на наш змучаны тэрорам і антытэрорам свет, але, калі на Еўропу насунулася вулканічнае воблака і ўсе чакалі насоўвання папяловага воблака на Беларусь, я задумаўся над ваенным жаданнем Хармса. Ён хацеў бы стаць душою, якая ад страху хаваецца ў пяткі. Я? «Калі Беларусь параўнаць з чалавечым целам, дык у час вайны я хацеў бы стаць кончыкам языка, які прыкусваюць, каб ператрываць невыносны боль».

Адам ГЛОБУС.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.39	21.39	17.00
Віцебск —	4.21	21.36	17.15
Магілёў —	4.29	21.29	17.00
Гомель —	4.35	21.16	16.41
Гродна —	4.56	21.52	16.56
Брэст —	5.06	21.44	16.38

Месяц

Маладзік 12 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Фядоры, Івана, Купрыяна, Ніла, Фёдара.*

К. *Ганны-Марыі, Пелагеі, Ахрамея, Рычарда, Станіслава, Феліцыяна.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

9 чэрвеня

Дзве даты

1562 год — у Нясвіжы выйшла кніга Сымона Буднага «Катэхізіс». Гэта была першая кніга на старабеларускай мове, якая выйшла на тэрыторыі Беларусі. У ёй аўтар тлумачыў не толькі рэлігійныя дагматы, але і выказваў сваё разуменне розных пытанняў сацыяльнага і грамадска-палітычнага жыцця. На сёння захаваліся 10 экзэмпляраў «Катэхізіса» — у Кракаве, Празе, Санкт-Пецярбургу, Маскве.

1943 год — чэшскі журналіст Юліус Фучык зрабіў апошні запіс у сваім турэмным дзённіку: «Людзі, будзьце пільныя!».

Цытата дня:

«Калі каханне моцнае, чаканне становіцца шчасцем».

Сімона дэ Бавуар (1908—1986), французская пісьменніца.

Сімволіка цотнасці ў традыцыйнай культуры беларусаў

Падчас знаёмства са шматлікімі кантэкстамі ўжывання тых ці іншых лікаў складваецца ўражанне, што асноўны водападзел праходзіць па мяжы цотнасці і няцотнасці. Гэты падзел мае абсалютны характар і ахоплівае ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека. Напрыклад, парныя структуры былі найбольш характэрныя для сельскагаспадарчай дзейнасці.

● У народным календары даволі шмат здвоеных святаў, адно з якіх адзначалася вясной і было ўключана ў структуру падзей, звязаных з «разгортваннем» пасяўных работ і адпаведна каляндарных святаў, другое прыпадала на перыяд «згортвання» цыкла земляробчых работ і закальцоўвання каляндарна-абрадавых адпаведнікаў. Ключавымі ў гэтых адносінах былі Радаўніца (якая дазваляла распачынаць земляробчыя справы) і Восеньскія Дзяды (яны закруглялі цыкл сельскагаспадарчых работ), вясновы і зімовы Юр'і, Міколы, і г.д. У час жніва асаблівай павагай карысталіся самы першы (калі пачыналі зажынкі) і апошні (калі дажыналі) снапы.

● Калі па якой-небудзь прычыне на момант святкавання вяселля бацькі жаніха ці нявесты не ўтвараюць пару (скасавалі шлюб або нехта з іх памёр), то той з іх, хто застаўся з дзецьмі, не мае права праводзіць маладых да вянца і сустракаць іх пасля вянчання. У гэтым выпадку ў сілу ўваходзіў прынцып народнай культуры «падобнае выклікае падобнае», на падставе якога лічылася, што нешчаслівая доля бацькоў будзе пераадрасавана дзецям, якія бяруць шлюб.

● Для таго каб маладыя жылі ў пары, іх павінна была адпраўляць толькі пара бацькоў. У такім разе ролю фізічных, родных бацькоў выконвалі пасажоныя бацькі (ні ў якім разе не хросныя — яны абавязкова павінны быць побач з маладымі ў храме падчас вянчання). Імі маглі быць вашы блізкія ці далёкія сваякі, суседзі або аднавяскоўцы, але яны павінны быць шчаслівай сямейнай парай, мець сваіх дзяцей.

● Да выпякання каравая дапускаліся толькі тыя жанчыны, якія жылі сямейнай парай.

● Побач з парай маладых на працягу ўсяго вяселля павінна знаходзіцца пара іх самых блізкіх сяброў — шафер і шаферка.

● Дынаміку вясельнай дзеі падтрымлівала пара — двое сватоў, муж і жонка (у больш позняй традыцыі іх магло быць чатыры пары — па дзве з кожнага боку).

● Абавязковымі вясельнымі чынамі з'яўляюцца хросныя бацькі (па некаторых прычынах яны не маглі выконваць ролю сватоў). Яны таксама павінны сядзець толькі парай. Калі ж у жаніха або нявесты засталіся жывымі толькі хросны бацька або маці (або нехта з іх жыве ў іншым, далёкім месцы або не хоча быць на вяселлі), то, каб пазбегнуць няпарнасці, трэба было браць да пары каго-небудзь са сваякоў, пачынаючы з самай блізкай сваёй радзіны.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

У цягніку бабуля кажа «братку»:

— Малады чалавек, вы не маглі б вызваліць для мяне ніжнюю паліцу?

— Магу, матуля! Табе ў якім купэ?

☺

Наўрад ці нашы бацькі 20 гадоў таму маглі меркаваць, што падрыхтоўка да экзамену будзе ўяўляць фатаграфаванне падручніка тэлефонам.

☺

У караоке-кавярні.

— Вось наша караоке-меню!

— Скажыце, а вось у вас тут Джасцін Цімберлэйк, гэта не са свініны?

Наш фармат

ЮНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ МАСТАКІ ВЫСТАЎЛЯЮЦЦА Ў ПРАЗЕ

29 работ з нашай краіны былі адабраныя для ўдзелу ў міжнароднай выставе дзіцячай творчасці «Скарбы прабабулінага куфара», што пачала сваю работу 8 чэрвеня ў Нацыянальным музеі ў сталіцы Чэхіі. Удзел беларусаў у гэтай прэстыжнай экспазіцыі, якая праводзіцца па ініцыятыве Еўрапейскага вяшчальнага саюза, арганізаваў творчы калектыў дзіцячага праекта «Мэры Попінс» канала «Культура» Беларускага радыё.

«Купальскі вянок» 14-гадовай Ганны АЛЕКСАНДРОЎСКАЙ.

Для ўдзелу ў выставе краіны — удзельніцы ЕВС даслалі каля 3000 работ, але кампетэнтнае журы адабрала толькі дзясятую частку з іх. Сярод мастацкіх твораў, што прадстаўляюць Беларусь, — малюнкі, роспіс па шкле, а таксама вырабы з саломкі, гліны, дрэва і іншыя ўзоры беларускіх народных рамёстваў. Найлепшыя калекцыі дзіцячых твораў прапанавалі, паводле ацэнкі экспертнай камісіі, студыя выяўленчага мастацтва Сенніцкага цэнтра культуры, школа № 200 г. Мінска, сталічныя палац пазашкольнай работы «Золак» і Цэнтр пазашкольнай работы «Ветразь». Убачыць гэтыя работы можна і не пакідаючы межаў Беларусі — у электроннай галерэі на сайце чэшскага радыё http://projekty.rozhlas.cz/malujeme3/galerie.php.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Вясна, як раніца жыцця,
За небасхілам невядомасць,
Вяртае мары з небыцця
І цягне ў падарожжа з дому.

Паветра хмеліць галаву —
Любуюся палескім краем,
Дзе ў азёраў сіняву
Трывожны месяц пазірае.

Дзе засталіся карані
Маёй любві да Беларусі,
Дзе аб каханні ў вышыні
Курлычуць журавы і гусі.

Я каля Прыпяці-ракі
Стаю ў шчаслівым задуменні...
Пінск старажытны скрозь вякі
Мне дорыць радасць і натхненне.

Сяргей КАРЫЦЬКА.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ВЫЗНАЧАЕМСЯ З АДПАЧЫНКАМ

Для неперабораліых

Прынамсі, самае таннае мора ў Адэсе. Сёлета пражыванне ў гатэлі з поўным харчаваннем абыдзецца ў 200 доларaў «з носа» за 10 дзён. Гэта пры тым, калі вы выбіраецеся адпачываць у чэрвені, далей цэны пачынаюць узнімацца. Можна таксама зэканоміць і на паслугах тураператараў, і непасрэдна самім дамаўляцца з гатэлем, напрыклад, у той жа Адэсе на пачатак чэрвеня можна было замовіць ложка-месца за 5 доларaў у суткі (столькі каштуе «нумар» з «выгодамі» на вуліцы, замест гарачай вады — бак, у якім вада грэецца сонцам). Тым не менш, такія прытулкі турыстаў карыстаюцца ўстойлівым попытам, штогод людзі засяляюцца ў нейкія, нават з нашага, беларускага, пункту гледжання, баракі, скалочаныя з дошак. Але нават і новыя гатэлі, што там рэкламуюцца як лепшыя і дарагія, — часта далёкія ад ідэалу. І прычына не толькі у перабоях з гарачай вадой. Пра які ўзровень арганізацыі адпачынку можна гаварыць, калі нават у нумарах люкс брудныя вокны, а па шпалерах і столі размазаны падаўленыя мухі. Але на неахайнасць гаспадароў гатэляў многія турысты заплюшчваюць вочы. Чаго варты курортныя пасёлкі наогул. Возьмем, напрыклад, Затоку. На вялікую жывую вуліцу, па якой павольна цячэ людская плынь, дзе ўздоўж дарог прапануецца разнастайная ежа: шашлыкі, рыба-грыль, марожанае, стаяць разнастайныя лаўкі, кавярні і крамы і ні адной... сметніцы. У лепшым выпадку ля якой крамы можа стаяць кардонная каробка для смецця. Нават на цеплаходзе, які штодзень робіць некалькі рэйсаў з турыстамі і куды людзей набіваецца, што селядцоў у бочцы, тыя ж каробкі. На ўвесь пляж пару вялікіх кантэйнераў, бруд з якіх у лепшым выпадку вывозіцца раз на тыдзень. Дадайце сюды яшчэ адсутнасць прыбіральняў на пляжах. Што гэта эканомія, неахайнасць, ці проста элементарная сквапнасць?

Прынамсі, кожная краіна прапануе свой адпачынак, які дае пэўны настрой. У адэскіх курортных пасёлках хутчэй, настальгічны, саўковы. Малыя, што басанож шлёпаюць да пляжа проста па асфальце. Пастаянныя выкрыкі прадаўцоў на пляжы «гарачая кукуруза», «халоднае піва», «мідыі , рапаны, асміножкі». Адсутнасць пешаходных дарожак — турысты проста няспешна расступаюцца, калі па дарозе едзе якая машына. У крамах няма касавых апаратаў, а абменнік — гэта бабуля, што сядзіць на вуліцы пад парасонам. Экскурсіі ў перапоўненых аўтобусах, і сярод вялікай групы турыстаў, так, што пачуць, тое, што расказвае гід — вялікая праблема. Забавы на неперабораліых «савецкіх грамадзян» кшталту «правер сваю вагу», ці «адведай шашлык», «запрашаем у кінатэатр на прагляд фільма, альбо на шоу з напаўаголенымі расфарбаванымі «цёлкамі». Можна няспешна прайсціся ў вірлівай жывой плыні, дазволіць сабе розныя прыемныя смачныя пакупкі, напрыклад, рыбку, што на грылі гатуецца прама ўздоўж вуліцы: здаецца, у адэскім адпачынку нічога не мяняецца ўжо не адзін дзясятак гадоў.

Але для большасці беларусаў, якія туды едуць, галоўнае ў адпачынку што — магчымасць адагрэцца на сонейку і ў моры пакупацца. А калі можна ўкласціся ў 1000 доларaў на сям'ю з 4 чалавек (двое дзяцей, двое дарослых) (пражыванне, харчаванне, праезд і дробныя расходы на месцы), чаму б не паспрабаваць такі адпачынак. Да таго ж, недалёка ад Адэсы ёсць рынак, дзе можна набыць рэчы, якія там у 3-4 разы таннейшыя, чым у Беларусі. І, запомніце: таргавацца тут няма сэнсу, вам не скінуць ні капейкі, хіба што, калі вы набудзеце нешта дробным оптам.

Можна яшчэ махнуць і ў Крым — там адпачынак больш цывільны, але і пацягне ён на вышэйшую суму. Дарэчы, выбіраючы жытло ў Крыме, абавязкова высвятляйце, наколькі яно далёка ад мора, каб не атрымалася, што тупаць да вады вам прыйдзецца амаль гадзіну, ды яшчэ і ўгару.

ТУРАПЕРАТАРЫ заўважаюць, што ў нашай краіне расходы на адпачынак па сваёй важнасці займаюць толькі 5-7-ы радок. Праўда, у апошнія гады з'яўляецца ўсё болей людзей, гатовых на нечым зэканоміць, але адкласці грошы на летнюю пуцёўку. А вывозіць дзяцей на мора наогул — становіцца амаль што не бацькоўскім абавязкам.

НА ЎСІМ ГАТОВЫМ

Калі ж вам хочацца асаблівай увагі ці, як кажуць, сэрвісу, дык такі адпачынак у параўнанні з украінскім каштуе ў разы больш. Сёлета па-ранейшаму, сярод краін далёкага замежжа лідзіруе Турцыя. Балгарыі наўрад ці ўдаецца пераўзысці яе, хоць там і з'яўляюцца гатэлі, па сваім начынні і абслугоўванні роўныя турэцкім, але пры гэтым такі турпрадукт часам каштуе даражэй, чым у туркаў.

Людзі, якія паварушыліся загадзя, змогуць адпачыць у Турцыі танней, чым тыя, хто вызначаецца з адпачынкам у апошні момант. Чым пазней вы закажаце турпакет, тым больш за яго заплаціце. Прынамсі, пуцёўкі выгаднай закупляць загадзя, калі яшчэ дзейнічае так званае ранняе браніраванне і можна атрымаць зніжкі на 5-20 працэнтаў, але шанц зэканоміць вы ўжо ўпусцілі, рабіць гэта трэба было яшчэ ўзімку або напачатку вясны.

Прынамсі, першыя канікулы з Турцыяй — гэта новая, незнаёмая людзям з краін былога саюза філасофія адпачынку. Тут турыст міжволі адчувае сябе, амаль што каралём, усё верціцца вакол яго. Не трэба нічога рабіць, нешта шукаць, не трэба думаць, можна і да мора не ісці, хоць да яго пару хвілін — добрая доля турыстаў абыходзіцца адкрытымі басейнамі, вакол якіх віруе жыццё (падаецца ежа і напоі, праходзяць конкурсы, дыскатэкі). Канцэрт сіламі саміх адпачывальнікаў? Гэта магчыма на постсавецкай прасторы. А ў Турцыі турысту застаецца толькі «спажываць» усё гатовае, прадукты, канцэрты, ідэі, і папросту жарты: спецыяльная каманда аніматараў сноўдае сярод адпачывальнікаў і забаўляе іх, праводзіць дыскатэкі каля басейнаў, спартыўныя спаборніцтвы, конкурсы, займае дзяцей. Да дзяцей тут асаблівае стаўленне, здаецца, з імі лашчацца, ім усміхаюцца ўсе супрацоўнікі, нават афіцыянты ў рэстаране не абмінуць пагладзіць малое па галоўцы. Праблема, чым заняцца, тут ніколі не ўзнікае. Хітрыя туркі самі падыдуць да лежака, на якім вы смажыцеся на сонейку, і прапануюць экскурсіі, турэцкую лазню, запросяць паўдзельнічаць у разнастайных конкурсах. Але ведайце, што тут умеюць вымываць грошы, калі нешта не ўваходзіць у межы вашай пуцёўкі, з вас здзяруць немалую суму. Замаўляць нейкія паслугі і тавары на тэрыторыі гатэля, асабліва дарагога (турэцкая лазня, тэлефонныя размовы з радзімай, закупка сувеніраў) — часам нераплаціць у некалькі разоў, у горадзе гэта нашмат танней.

Дзень у гатэлі напоўнены рознымі забавамі, што турысту няма сэнсу выбірацца за яго межы, хіба што толькі для шопінгу ці экскурсіі. Між іншым: не нераплачвайце за дадатковыя паслугі. Да тых жа аквапаркаў часам танней дабірацца сваім ходам. Калі ж замаўляеце экскурсію, дык гід, які вам прызначаны тураператарам (ён сустракае вас у аэрапорце і праводзіць назад, вырашае пытанні, якія часам узнікаюць з засяленнем), можа заламаць за яе цану значна вышэйшую, чым прапануюць мясцовыя фірмы. Калі вам прапануюць бясплатную азнаямляльную экскурсію па крамах, дзе вы атрымаеце зніжкі на пакупкі, — значыць, вас павязуць па самых дарагіх крамах, дзе наўрад ці ўдасца зэканоміць. А вось выбрацца на турэцкі рынак самастойна варта. І не толькі таму, што шматкі там танныя. Сам працэс пакупкі як прыемная цырымонія. Прадаўцы там расслабленыя і ласкавыя. Хіба ў нас на рынку можна пачуць «не спяшайся, пасядзі, адпачні, падумай», тут дораць сувеніры і прапаноўваюць каву (гарбату), людзям, што заходзяць у краму. А пакуль вы адпачываеце, можаце заўважыць, як ваш сарамлівы сынок ужо ўскараскаўся на калені да прадаўца з суседняй крамы. Абавязкова таргуйцеся, тут на гэта глядзяць як на справу самасцвярджэння і пакупніка, і прадаўца. Цэны скідайце па максімуму, і калі цвёрда стаяць на сваім, можна набыць за 20 доларaў рэч, якая напачатку выстаўлялася за 100.

Але вернемся ў гатэль. Калі ён праверaны (пуцёўка набытая ў вядомай фірмы, вы чулі водгукі знаёмых, што там ужо былі) і калі ён не меншы за тры зоркі, і калі ў вас усё ўключана — праблемы з харчаваннем не будзе. Вы проста заходзіце ва ўсе кавярні і рэстараны, што размешчаны на тэрыторыі гатэля, і выбіраеце тое, што падабаецца. Адзінае, з чым там туга — гэта свежыя сокі, за іх трэба плаціць асобна.

Ураўвае чысціня, ваша дзіця не паспела ўпусціць сурвэтку — ужо бяжыць супрацоўнік гатэля прыбіраць, драіцца падлога, збіраецца смецце на ўзбярэжжы, сметніцы вычышчаюць адразу ж. І яшчэ там не «псуюць ваду». Нават маленькіх дзяцей у басейны і мора бацькі запускаюць... у памперсах (ёсць спецыяльныя памперсы, прызначаныя для купання).

Дарэчы, пуцёўкі на дзяцей да двух гадоў бясплатныя. Затое адпачынак даруслага каштуе каля тысячы доларaў. І зноў, чым раней вы паедзеце адпачыць, тым меншыя кошты. Калі вы аплацілі пуцёўку, вашы растраты на адпачынак гэтым могуць і абмежавацца, хлеба і забаў хопіць і на тэрыторыі гатэля. Але ёсць асобныя пасткі, калі вы можаце «паляцець» на грошы. Захварэла дзіця і вы паклікалі доктара (на медстрахоўку ніхто і глядзець не стане з вас пачнуць патрабаваць грошы, тэлефануйце прадстаўніку вашага турагенцтва, які знаходзіцца ў Турцыі і прызначаны якраз для разбору такіх спрэчных пытанняў), прынамсі, тэлефанаванне гіду таксама трэба будзе аплаціць. Праблемы могуць быць з засяленнем-выселенне. Ваша пуцёўка заканчваецца а 12-й гадзіне дня, а самалёт будзе толькі апоўначы, калі вы хочаце затрымацца ў нумары — даплаціце, гэтак жа, як і за харчаванне.

Існуюць туры з «начыннем» — ад вывучэння замежных моў, да танцаў і акцёрскага майстэрства. Выбар за вамі. А мо лепш адпачыць на радзіме? На жаль, толькі кошты тут зусім не гасціннyя. Часам на чужым моры адпачыць танней, чым ля беларускай рэчкі. За суткі з чалавека, які адпачывае ў аграсядзібе недалёка ад вады, бяруць ад 10 да сотні баксаў. Адпачынак у айчынным санаторыі таксама можа цягнуць больш чым мільён з чалавека за тыдзень.

Алена ВАЙЦЯХОВІЧ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2770. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12